**А.М. Макарэвіч**
**Н.П. Дзеравяга**
**В.І. Караткевіч**

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ



Магілёў
УА "МДУ імя А.А. Куляшова"
2012

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Электронны аналаг друкаванага выдання:*

А.М. Макарэвіч, Н.П. Дзеравяга, В.І. Караткевіч
Методыка выкладання беларускай літаратуры
Магілёў: УА “МДУ імя А.А. Куляшова”, 2012. – 120 с.

Вучэбна-метадычныя матэрыялы ўключаюць пытанні для абмеркавання на практычных занятках, заданні для самастойнай работы, кароткі слоўнік тэрмінаў і паняццяў, тэставыя заданні для кантролю, дадаткі да некаторых практычных заняткаў.

Прызначаецца студэнтам, настаўнікам і выкладчыкам беларускай літаратуры, якія пачынаюць сваю працоўную дзейнасць.

УДК 372.8:821.161.3 (075.8)
ББК 74.268.3 (4 Беи)

Макарэвіч, А.М. Методыка выкладання беларускай літаратуры [Электронны рэсурс]: вучэб.-метад. мат-лы / А.М. Макарэвіч, Н.П. Дзеравяга, В.І. Караткевіч. – Электрон. даныя. – Магілёў: УА “МДУ імя А.А. Куляшова”, 2012. – Загал. з экрана.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

212022, г. Магілёў
вул. Касманаўтаў,1
тэл.: 8-0222-28-31-51
e-mail: alexpzn@mail.ru
http://www.msu.mogilev.by

© Макарэвіч А.М., Дзеравяга Н.П., Караткевіч В.І., 2012
© УА “МДУ імя А.А. Куляшова”, 2012
© УА “МДУ імя А.А. Куляшова”, электронны аналаг, 2012

# *Тлумачальная запіска*

Эканамічныя і сацыяльныя змены, якія адбываюцца ў пачатку XXI стагоддзя, дыктуюць неабходнасць мадэрнізацыі адукацыйнага працэсу. Пры гэтым варта ўлічваць наступныя фактары: сусветныя тэндэнцыі да глабалізацыі і інфарматызацыі, інтэлектуалізацыю вытворчасці, укараненне ў прафесійную падрыхтоўку рынačных механізмаў, “няўстойлівасць” прафесій, павышэнне ролі самастойнай дзейнасці ў набыцці прафесійных кампетэнцый, устойлівую тэндэнцыю да пашырэння навуковых ведаў. Усё гэта вымагае распрацоўкі новых метадаў, прыёмаў і формаў у працэсе навучання. Менавіта таму ў нашай краіне была прынята *Канцэпцыя развіцця педагагічнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь*.

Акрэсленае вышэй дыктуе неабходнасць больш шырокага ўкаранення ў працэс выкладання розных дысцыплін сістэмы перспектыўных ліній. Яна прадугледжвае дастаткова грунтоўнае ўяўленне як выкладчыкам, так і студэнтамі мэтаў, задач, структуры, адпаведных этапаў дзейнасці і форм справаздачы па іх пры вывучэнні адпаведнай дысцыпліны.

Усведамленне бліжэйшых, сярэдніх і дальніх перспектыў дазваляе больш рацыянальна, эфектыўна наладжваць той ці іншы від дзейнасці, не паўтараючы некаторыя яго этапы, вызваляючы пры гэтым час і (галоўнае!) адпаведны запас энергіі – разумовай, фізічнай – на здзяйсненне планаў творчага характару. Рацыянальна арганізаваная інтэлектуальная дзейнасць спрыяе назапашванню не толькі фактычнай інфармацыі пэўнага кшталту, паступальнаму фарміраванню ўменняў і навыкаў адпаведнай скіраванасці, але і спрыяе ўзнікненню ў суб’екта ўпэўненасці ў сваіх сілах, жадання творчага прымянення назапашаных ведаў і навыкаў. Усведамленне пазітыўных перспектыў разумовай дзейнасці непазбежна ўводзіць асобу ў працэс асэнсавання ўласнай суб’ектнасці ў кантэксце адпаведнага віду дзейнасці: даследчай, творчай, практычна-паўсядзённай і інш. Такая суб’ектнасць (у тым ліку студэнта, будучага настаўніка, даследчыка) дазваляе засяроджвацца на адпаведных відах дзейнасці творча, з арыентацыяй на перспектывы рознага кшталту з паступовым дамінаваннем у сістэме гэтых перспектыў эстэтычна каштоўных арыентацый і дзеянняў.

Важна гэта ўсведамляць не толькі ў кантэксце агульнафілалагічнай падрыхтоўкі будучага настаўніка мовы і літаратуры, але і педагагічнай. Натуральна, што студэнты ўжо маюць адпаведныя ўяўленні пра будучую прафесію, але гэта яшчэ не сістэма. У такой сітуацыі адной з галоўных задач выкладчыка *Методыкі выкладання беларускай літаратуры* з’яўляецца мэтанакіраванае фарміраванне ўменняў рацыянальнай арганізацыі працы студэнта-філолага па сістэме перспектыўных ліній з паступовай трансфармацыяй іх у працэс творчы, магчыма, непаўторны ў кожным асобным выпадку, зарыентаваны на суаднясенне ўласных ацэнак, вывадаў, назіранняў з ужо існуючымі і вылучэння пры гэтым суб’ектна каштоўнага, з пункту погляду методыкі прымальнага. Пры гэтым павінна адбывацца арыентацыя

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А.Кулешова

студэнтаў на сістэмнасць у іх працы, на рацыянальнасць, паэтапнасць і перспектыўнасць фактычных і тэарэтычных назапашванняў.

*Умовы рэалізацыі метадычнага праекта выкладчыка і інтэлектуальных планаў, намаганняў, дзеянняў студэнтаў*:

- наяўнасць галоўных складальнікаў, якія ўтвараюць сістэму, бо, калі яны адсутнічаюць, сістэма ўжо не з'яўляецца сістэмай, а значыць, яна не дзейнічае;
- рабочы варыянт вучэбнай праграмы, у якім неабходна вылучыць формы і этапы самастойнай работы студэнтаў у кантэксце ВМК;
- метадычныя рэкамендацыі ці вучэбна-метадычны дапаможнік як часткі ВМК;
- каталогі навуковых і метадычных крыніц (спісы літаратуры па адпаведных курсах у метадычных рэкамендацыях, электронныя каталогі кафедры і бібліятэк);
- навуковая і навукова-метадычная літаратура (друкаваная ў форме манаграфій, навуковых артыкулаў у перыядычных выданнях, ксеракопіі ці электронны варыянт);
- навыкі працы студэнтаў з рознымі формамі каталогаў, навуковай літаратурай;
- стварэнне атмасферы сутворчасці ў метадычных намаганнях выкладчыка і дзеяннях (навучальнага і даследчыцкага характару) студэнтаў – самая, бадай, важная ўмова, бо ўсё астатняе не мае без яе сэнсу;
- назіранні студэнтаў у перспектыўна адкрытай форме канспектаў і дзённікаў педагагічных назіранняў (такая форма прадугледжвае іх пастаяннае дапаўненне, супастаўленне высноў студэнта ў часе яго самастойнай працы не толькі па вывучаемай цяпер дысцыпліне ці праблеме, а і іншых у будучым часе);
- метадычная сутворчасць выкладчыкаў, якія выкладаюць дысцыпліны псіхолага-педагагічнага характару;
- арганізацыя працы творчых груп па інтарэсах у метадычным і навуковым полі дзейнасці выкладчыка, які працуе па сістэме перспектыўных ліній.

Бягучая атэстацыя па *Методыцы выкладання беларускай літаратуры* – гэта не столькі кантроль за ўзроўнем засваення ведаў студэнтамі, колькі магчымасць для студэнта прадэманстраваць якасць набытых ім уменняў і навыкаў метадычнай працы.

Як выкладчык, так і студэнт павінны выразна ўсведамляць, што адзнака на практычных занятках, за кантрольную работу, калёквіум і інш. – гэта не толькі ацэнка канкрэтнай формы працы (адказ на занятках, экзамене, характарыстыка пытання кантрольнай работы і інш.). Гэта сумарнае падагульненне вынікаў падрыхтоўчай працы, якая ў сукупнасці яе элементаў павінна прывесці студэнта да якасных змен у працэсе яго прафесійнай падрыхтоўкі, выпрацоўкі навыкаў прафесійнай кампетэнтнасці, як гэтага

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

патрабуе *Адукацыйны стандарт*. Выключэнне хаця б аднаго элемента з сістэмы падрыхтоўчай працы перашкаджае якаснаму назапашванню неабходных ведаў і ўменняў. Студэнт павінен выразна ўсведамляць, што адзнака на экзамене – гэта ацэнка ўсёй сістэмы яго працы ў семестры – фактычна вызначэнне яго прафесійнай кампетэнтнасці ў межах адпаведнай вучэбнай дысцыпліны.

*Уменні і навыкі*, якія павінны студэнты набыць, а выкладчык іх фарміраваць (акрамя агульна прынятых з сістэмы літаратуразнаўчай адукацыі):

a) прымяняць атрыманыя веды пры вырашэнні педагагічных вучэбна-выхаваўчых задач з улікам узроставых і індывідуальных адрозненняў навучэнцаў, сацыяльна-псіхалагічных асаблівасцяў вучнёўскіх калектываў і канкрэтных педагагічных сітуацый;

b) вызначаць ступень і глыбіню засваення навучэнцамі праграмнага матэрыялу, развіццё ў іх навыкаў самастойнага папаўнення ведаў;

c) выкарыстоўваць розныя метады і прыёмы навучання ў працэсе спасціжэння літаратурнага матэрыялу, ажыццяўленне кіраўніцтва мастацка-творчай дзейнасцю навучэнцаў;

d) фарміраваць у навучэнцаў уменні аналізу літаратурных твораў з улікам іх родавай і жанравай спецыфікі;

e) аналізаваць і абагульняць перадавы педагагічны вопыт, сістэмнае павышэнне сваёй кваліфікацыі.

*Віды і формы кантролю*: практычныя заняткі, калёквіумы, кантрольныя работы з аналітычнымі, тэставымі і творчымі заданнямі, бягучыя кансультацыі і інш. У пачатку семестра вызначаецца тая колькасць форм кантролю, па выніках якога студэнты могуць атрымаць адзнаку. Іх можа быць, напрыклад, ад 4-х да 8-мі. На іспытах студэнт можа ў якасці ілюстрацый да адказу карыстацца адпаведнымі напрацаванымі матэрыяламі. Набраная ў семестры колькасць балаў сумуецца з адзнакай за адказ і выстаўляецца агульная (сярэдняе арыфметычнае) адзнака па выніках працы студэнта ў семестры. Калі студэнт не ўдзельнічаў у выкананні таго ці іншага задання, то бал за яго усё роўна выстаўляецца нуль.

У сувязі з акрэсленымі вышэй метадычнымі зыходнымі вызначым **мэты і задачы** дадзеных вучэбна-метадычных матэрыялаў, **сферу** студэнцкага **выкарыстання**, а таксама ахарактарызуем яго **структуру** ў кантэксце гэтых мэт і задач.

**Мэта** вучэбна-метадычных матэрыялаў – фарміраваць у студэнтаў уменні і навыкі арганізацыі самастойнай работы па сістэме перспектыўных ліній пры падрыхтоўцы да практычных заняткаў, кантрольных работ, іспытаў па Методыцы выкладання беларускай літаратуры.

**Задачы**:

a) даць студэнтам рэкамендацыі, заданні да вывучэння адпаведных тэм і на іх падставе фарміраваць уменні сістэмнага аналізу метадычных пытанняў, праблем, з'яў;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

b) спрыяць рацыянальнай арганізацыі самастойнай працы студэнтаў пры падрыхтоўцы іх да практычных заняткаў, кантрольных работ, бягучай атэстацыі, а таксама да будучай прафесійнай дзейнасці.

Дадзеныя вучэбна-метадычныя матэрыялы могуць быць выкарыстаны пры вывучэнні Методыкі выкладання беларускай літаратуры ва ўстановах вышэйшай адукацыі па наступных спецыяльнасцях: 1-21 95 01 Беларуская філалогія; 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Дадатковая спецыяльнасць; 1-02 03 04 Руская мова і літаратура. Дадатковая спецыяльнасць (1-02 03 04-01 Руская мова і літаратура. Беларуская мова і літаратура); 1-01 02 02 Пачатковая адукацыя. Дадатковая спецыяльнасць (1-01 02 02-04 Пачатковая адукацыя. Беларуская мова і літаратура).

Прапанаваныя вучэбна-метадычныя матэрыялы ўключаюць у сябе наступныя часткі.

**1.** *Планы практычных заняткаў.* У іх прапаноўваюцца пытанні для абмеркавання і заданні для самастойнай работы з арыентацыяй на перспектыўнае назапашванне матэрыялу для будучай вытворчай практыкі і самастойнай педагагічнай дзейнасці.

**2.** *Тэставыя заданні для кантролю.* Яны скіраваны на пабуджэнне студэнтаў да рознабаковага разгляду вучэбнага матэрыялу. Прапанаваныя тэсты маюць таксама і навучальны характар, бо работа з імі дае магчымасць звярнуць увагу на многія канкрэтныя і немалаважныя аспекты, якія пры простым прачытанні падручніка могуць застацца па-за ўвагай.

**3.** *Кароткі слоўнік тэрмінаў і паняццяў.* Ён дапаможа будучаму настаўніку арыентавацца ў метадычнай тэрміналогіі, якая выкарыстоўваецца пры вывучэнні Методыкі выкладання беларускай літаратуры. Зорачкай (*) у слоўніку пазначаны азначэнні, узятыя з *Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі* і адаптаваныя для студэнцкага ўспрымання.

**4.** *Спіс літаратуры.* Ён арыентуе студэнтаў не толькі на выкарыстанне яго пры падрыхтоўцы да практычных заняткаў, іспытаў. Натуральна, што ўсе крыніцы з гэтага спіса студэнт не можа засвоіць у працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны. Ён прапаноўваецца таксама і з улікам сярэдняй і дальняй перспектывы: можа быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы курсавых і дыпломных даследаванняў, магістарскіх дысертацый, а таксама непасрэдна ў будучай прафесійнай дзейнасці студэнтаў у якасці настаўніка беларускай літаратуры. У дадзеным спісе прадстаўлены найбольш паказальныя навуковыя і метадычныя працы.

**5.** *Дадаткі.* Яны ўключаюць у сябе некаторыя нарматыўныя дакументы, неабходныя ў працэсе засваення вучэбнага матэрыялу, і метадычныя распрацоўкі, якія даюць студэнтам прыкладны ўзор метадычнай працы з мастацкім творам у кантэксце вывучэння ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі канкрэтных тэм у 5 класе.

Вучэбна-метадычныя матэрыялы па *Методыцы выкладання беларускай літаратуры* дапамогуць алгарытмізаваць змест гэтай вучэбнай дысцыпліны, а таксама абагульніць і актуалізаваць веды, атрыманыя з іншых крыніц.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У залежнасці ад спецыяльнасці некаторыя тэмы практычных заняткаў можна выносіць на самастойнае вывучэнне, пры гэтым неабходна праводзіць кантроль выканання заданняў і ўзроўню засваення ведаў па тэме праз калёквіумы.

Аўтары будуць ўдзячныя за прапановы па ўдасканаленні дадзеных вучэбна-метадычных матэрыялаў. Заўвагі, водгукі просім накіроўваць на электронны адрас: kuliashou@tut.by

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# *Планы практычных заняткаў*

## Практычныя заняткі № 1

**Тэма: Асноўныя этапы развіцця і станаўлення методыкі выкладання беларускай літаратуры**

Колькасць гадзін – 2

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Праблема барацьбы за родную мову, за школу на роднай мове ў дарэвалюцыйны час.
2. Праца па адкрыцці школ на роднай мове ў 20-я гады XX ст., асаблівасці выкладання ў школах беларускай літаратуры.
3. Асноўныя напрамкі развіцця методыкі выкладання беларускай літаратуры ў 20-я гады XX стагоддзя.
4. Выкладанне беларускай літаратуры ў школах рэспублікі ў 30-я гг. XX стагоддзя.
5. Развіццё метадычнай думкі ў канцы 40-х пачатку 50-х гадоў XX стагоддзя.
6. Актывізацыя метадычнай думкі ў другой палове XX стагоддзя.
7. Стан методыкі выкладання беларускай літаратуры на сучасным этапе. Сучасныя метадысты і іх працы.

**Заданні:**

1. Зрабіце агляд часопісаў “Роднае слова”, “Беларуская мова і літаратура” за бягучы год (на выбар студэнта).
2. Вызначце асноўныя кірункі працы выкладчыкаў установы адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова” па вывучэнні методыкі выкладання беларускай літаратуры.
3. Падрыхтуйце паведамленне па адной з прапанаваных тэм:

   *Метадычныя погляды Якуба Коласа на праблемы вывучэння мастацкай літаратуры.*

   *“Гісторыя беларускае літаратуры” М. Гарэцкага як першы падручнік па беларускай літаратуры для школ усіх ступеняў у 20-я гг. XX ст.*

   *Асноўныя прынцыпы методыкі выкладання літаратуры ў школе ў працы І.І. Замоціна “Мастацкая літаратура ў школьным выкладанні”.*

   *Рэформы агульнаадукацыйнай школы ў XXI стагоддзі.*

   *Роля перыядычнага друку ў развіцці, станаўленні і актывізацыі метадычнай думкі на працягу XX – пачатку XXI стагоддзя.*

Літаратура: 6, 14, 31, 34, 35, 41, 57, 58, 59, 62, 63, 65[1]

---

[1] Тут і далей нумар адпавядае нумару крыніцы ў раздзеле “Спіс літаратуры”.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Практычныя заняткі № 2-3

**Тэма: Змест і этапы літаратурнай адукацыі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі**

Колькасць гадзін – 4

**Папераджальнае заданне:** Пазнаёмцеся з наступнымі нарматыўнымі прававымі актамі (размешчаны на сайтах Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь www.edu.gov.by і навукова-метадычнай установы “Нацыянальны інстытут адукацыі” www.adu.by)

1. Агульнаадукацыйны стандарт вучэбнага прадмета “Беларуская літаратура” (I-XI класы), зацверджаны пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 29.05.2009 № 32.
2. Канцэпцыя вучэбнага прадмета “Беларуская літаратрура”, зацверджаная загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 29.05.2009 № 675.
3. Вучэбная праграма для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. **Беларуская літаратрура. V-XI класы** (Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2010).
4. Прыкладнае каляндарна-тэматычные планаванне па вучэбным прадмеце “Беларуская літаратура”.

### Пытанні для абмеркавання

1. Мэты і задачы вывучэння вучэбнага прадмета “Беларуская літаратура”.
2. Асноўныя патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі навучэнцаў за перыяд навучання на ўзроўні агульнай базавай адукацыі.
3. Асноўныя патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі навучэнцаў за перыяд навучання на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі.
4. Мэтазгоднасць вывучэння беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнага мастацкага слова.
5. Асноўныя паказчыкі якасці літаратурнай адукацыі; сутнасць паняцця “начытанасць”.
6. Метадалагічныя передумовы і прынцыпы пабудовы зместу вучэбнага прадмета “Беларуская літаратура”:

   a) арыентацыя на засваенне набыткаў нацыянальнай культуры ў адзінстве з агульначалавечымі каштоўнасцямі;

   b) фундаментальнасць;

   c) практычная скіраванасць;

   d) гуманітарызацыя і гуманізацыя навучання;

   e) завершанасць літаратурнай адукацыі;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

f) рэгіяналізацыя літаратурнай адукацыі.
7. Дыдактычныя асновы, прынцыпы і крытэрыі адбору ў канструяванні зместу літаратурнай адукацыі:
8. Асаблівасці пабудовы зместу літаратурнай адукацыі па ступенях адукацыі:
   I ступень (I – IV класы);
   II ступень (V – IX класы);
   III ступень (X – XI класы).
9. Вучэбна-метадычны комплекс па беларускай літаратуры:
   a) вучэбная праграма;
   b) падручнік, падручнік-хрэстаматыя, вучэбны дапаможнік;
   c) хрэстаматыя для пазакласнага чытання;
   d) вучэбна-метадычныя дапаможнікі для настаўніка;
   e) дыдактычныя матэрыялы для вучняў;
   f) літаратуразнаўчыя слоўнікі;
   g) кнігі, выдадзеныя ў серыі “Школьная бібліятэка”;
   h) выстаўкі-альбомы, прысвечаныя жыццю і творчасці беларускіх пісьменнікаў, альбомы ілюстрацый;
   i) аўдыявізуальныя сродкі навучання;
   j) электронныя сродкі навучання розных тыпаў.

**Заданне:** Напішыце рэцэнзію на 2 вучэбна-метадычныя дапаможнікі па беларускай літаратуры (на выбар студэнта).

Літаратура: 5, 10, 57, 58, 59.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Практычныя заняткі № 4

**Тэма: Прынцыпы, метады і прыёмы выкладання літаратуры**
Колькасць гадзін – 2

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Агульнадыдактычныя і прыватныя прынцыпы выкладання беларускай літаратуры.
2. Паняцце аб метадах і прыёмах выкладання літаратуры. Пытанне аб метадах і іх класіфікацыі.
3. Класіфікацыя метадаў выкладання па крыніцы атрымання ведаў: славесныя, наглядныя, практычныя.
4. Класіфікацыя метадаў выкладання ў залежнасці ад пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў: метад творчага чытання, эўрыстычны, даследчы, рэпрадуктыўны.

**Заданні:**

1. Запоўніце табліцу:

| Метад творчага чытання | | Эўрыстычны метад | | Даследчы метад | | Рэпрадуктыўны метад | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Прыёмы работы настаўніка | Віды дзейнасці вучняў | Прыёмы работы настаўніка | Віды дзейнасці вучняў | Прыёмы работы настаўніка | Віды дзейнасці вучняў | Прыёмы работы настаўніка | Віды дзейнасці вучняў |
| | | | | | | | |
| | | | | | | | |
| | | | | | | | |

2. Зрабіце творчы пераказ аднаго з раздзелаў аповесці-казкі *М. Лынькова “Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў” (5 клас)* (на выбар студэнта).
3. Прывядзіце прыклад пытанняў (не менш за 5), якія могуць выклікаць розныя, нават супрацьлеглыя адказы вучняў.
4. Падрыхтуйце розныя віды нагляднасці, якія, на вашу думку, мэтазгодна выкарыстоўваць настаўніку пры вывучэнні біяграфіі пісьменніка.
5. Складзіце партытуру чытання верша *Аркадзя Куляшова “Я хаце абавязаны прапіскаю…” (10 клас)*, падрыхтуйце выразнае чытанне гэтага верша.

Літаратура: 2, 29, 32, 59.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Практычныя заняткі № 5-6

**Тэма: Урок літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі як асноўная форма навучання і выхавання**

Колькасць гадзін – 4

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Урок як асноўная форма арганізацыі навучальнай дзейнасці навучэнцаў. Патрабаванні да сучаснага ўрока літаратуры.
2. Тыпы ўрокаў літаратуры, прынцыпы іх класіфікацыі.
3. Структура і асноўныя этапы сучаснага ўрока літаратуры.
4. Стандартныя і нестандартныя ўрокі як метадычная праблема. Віды нетрадыцыйных урокаў: урок-завочная экскурсія, урок-дыспут, урок-залік, урок-літаратурная гасцёўня, урок-свята, урок-прэс-канферэнцыя і інш.
5. Падрыхтоўка настаўніка да ўрока літаратуры: этапы, формы і змест.

6. Сучасныя педагагічныя тэхналогіі навучання літаратуры, выкарыстанне актыўных (інтэрактыўных) формаў навучання.

**Заданні:**

1. Падрыхтуйце паведамленне па адной з прапанаваных тэм:

   *Тэарэтычныя праблемы ўрока ў даследаваннях М.І. Махмутава, М.М. Скаткіна, М.А. Данілава, В.І. Стрэзікозіна, Ю.К. Бабанскага, І.Г. Агароднікава і інш.*

   *Праблемнасць навучання ў працах беларускіх вучоных (М.А. Лазарука, В.Я. Ляшук, В.У. Івашына, А.І. Бельскага, І.М. Гоўзіч, В.І. Русілкі, А.В. Руцкой і інш.).*

   *Спецыфіка выкарыстання праблемнага навучання на ўроках беларускай літаратуры.*

   *Арганізацыя працы настаўніка і вучняў па сістэме перспектыўных ліній.*

   *Спецыфіка выкарыстання модульнага навучання на ўроках беларускай літаратуры.*
2. Складзіце алгарытмы метадычнай дзейнасці настаўніка пры падрыхтоўцы да ўрока беларускай літаратуры (тып урока – на выбар студэнта).
3. Падрыхтуйце канспект нестандартнага ўрока па беларускай літаратуры (клас, тэма – на выбар студэнта).

Літаратура: 10, 13, 21, 47, 51, 52, 53, 57, 58, 59, 61, 63, 64, 73, 78.

## Практычныя заняткі № 7

**Тэма: Этапы вывучэння мастацкага твора ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі**

Колькасць гадзін – 2

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Мэты і задачы ўступных заняткаў.
2. Чытанне мастацкага твора як асноўны этап яго спасціжэння.
3. Вывучэнне настаўнікам чытацкага ўспрымання твораў навучэнцамі: мэты, этапы, формы, змест.
4. Аналіз мастацкага твора ў школе: мэты, структура, формы і змест, асаблівасці ў залежнасці ад ступені адукацыі.
5. Заключныя заняткі: іх мэта, задачы, змест, формы вучэбнай дзейнасці на іх.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Заданні:**

1. Прапануйце свае варыянты арганізацыі дамашняга чытання навучэнцаў (клас, тэма – на выбар студэнта).
2. Распрацуйце фрагмент урока (уступныя заняткі) пры вывучэнні *казкі Уладзіміра Караткевіча “Нямоглы бацька” (5 клас),* *апавядання Міхася Зарэцкага “Ворагі” (10 клас),* *п’есы Аляксея Дударава “Князь Вітаўт” (11 клас).*
3. Падрыхтуйце паведамленне на тэму *“Спецыфіка мастацкага ўспрымання і яго ўзроставая дынаміка”*.
4. Прапануйце варыянты высвятлення ўзроўню чытацкага ўспрымання вучнямі наступных твораў: *навелы Георгія Марчука “Канон Богу”, “Канон Базару”, “Канон Гарыні”, “Канон Маці” (10 клас),* *паэмы “Энеіда навыварат” (9 клас),* *апавядання Генрыха Далідовіча “Губаты” (6 клас).*
5. Распрацуйце сістэму ўрокаў па вывучэнні рамана Уладзіміра Караткевіча “Каласы пад сярпом тваім” (10 клас), выбіраючы розныя шляхі аналізу мастацкага твора.
6. Распрацуйце фрагмент урока (заключныя заняткі) па вывучэнні верша *Максіма Танка “Шчасце” (8 клас).*

Літаратура: 10, 30, 57, 58, 59,68, 69, 70, 72, 73, 76.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Практычныя заняткі № 8

**Тэма: Асаблівасці вывучэння лірычных твораў**
Колькасць гадзін – 2

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Асаблівасці адлюстравання рэчаіснасці і чалавека ў лірыцы.
2. Асаблівасці літаратуразнаўчага аналізу лірычнага твора: мэты, формы, іх змест у залежнасці ад ступені адукацыі.
3. Асаблівасці вывучэння лірыкі ў V – XI класах.
4. Метадычная сістэма навучання школьнікаў завучванню лірычных твораў (урыўкаў з іх) на памяць. Рэкамендацыя: пры падрыхтоўцы пытання выкарыстайце Дадатак 3.

**Заданні:**

1. Распрацуйце канспект урока па вывучэнні верша *Р. Барадуліна “Трэба дома бываць часцей” (8 клас).* Рэкамендацыя: можна выкарыстаць

матэрыял з Дадатка 3. Мэта працы з гэтым матэрыялам – засвоіць адзін з варыянтаў працы з лірычнымі творамі па сістэме перспектыўных ліній і выкарыстаць яго пры распрацоўцы прапанаванага вышэй канспекта.

Для даведкі: Пры аналізе твора неабходна звярнуць увагу на:

a) асаблівасці эмацыйнага выказвання чалавека пад уплывам пачуццяў і перажыванняў, звязаных з успамінамі пра родных і блізкіх, як адна з праяў духоўнасці асобы;

b) асаблівасці стварэння лірычнага вершаванага тэксту: уплыў адносін аўтара да родных мясцін, дзе праходзіла яго дзяцінства і юнацтва, на вобразную сістэму твора;

c) ролю вобразных (эпітэт, метафара і інш.), рытмічных сродкаў у лірычным вершаваным творы, адметнасць аўтарскай інтанацыі.

2. Складзіце памятку для вучняў *“План аналізу вершаванага твора”.*

3. Падбярыце ілюстрацыі з мастацкіх твораў да тэарэтычных артыкулаў, звязаных з вывучэннем лірычных твораў, са слоўніка тэрмінаў, змешчанага ў вучэбным дапаможніку для 9 класа.

Літаратура: 8, 18, 27, 54, 57, 58, 59, 60, 79, 86.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Практычныя заняткі № 9

**Тэма: Асаблівасці вывучэння эпічных твораў**

Колькасць гадзін – 2

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Улік родава-жанравай спецыфікі вывучэння эпічных твораў.
2. Метады і прыёмы вывучэння эпічных твораў.
3. Асаблівасці вывучэння эпічных твораў малой формы.
4. Вывучэнне эпічных твораў вялікай формы ў V–VIII, IX–XI класах.
5. Сістэма ўрокаў пры вывучэнні эпічных твораў вялікай формы.

**Заданні:**

1. Падрыхтуйце паведамленне па адной з прапанаваных тэм:

*Арганізацыя самастойнага чытання твора*;

*Асаблівасці ўспрымання і вывучэння эпічных твораў розных жанраў.*

2. Распрацуйце канспект урока па вывучэнні апавядання *Алены Васілевіч “Сябры” (6 клас).*

Для даведкі: Пры аналізе твора неабходна звярнуць увагу на:

a) маральна-этычную праблему твора;
b) узаемаадносіны Лёні і Грышы;
c) прыёмы псіхалагічнай абмалёўкі характару;
d) сюжэт і кампазіцыю апавядання;
e) вобраз аўтара-апавядальніка ў творы.

3. Распрацуйце сістэму ўрокаў па вывучэнні наступных эпічных твораў вялікай формы:

*a) Я. Колас "На ростанях" (частка першая "У палескай глушы") (9 клас),*
*b) К. Чорны "Пошукі будучыні" (10 клас),*
*c) І. Мележ "Людзі на балоце" (10 клас),*
*d) В. Быкаў "Знак бяды"(11 клас),*
*e) У. Караткевіч "Каласы пад сярпом тваім"(10 клас).*

4. Падрыхтуйце памятку для вучняў *"Схема аналізу эпічнага твора"*.

5. Складзіце рэестр літаратуразнаўчых тэрмінаў, якія вучні павінны засвоіць пры вывучэнні эпічных твораў у школе. Да кожнага з паняццяў гэтага рэестра падбярыце 3–5 прыкладаў з эпічных твораў, якія вывучаюцца ў адпаведных класах.

Літаратура: 19, 20, 22, 43, 44, 45, 56, 57, 58, 59, 71, 87.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Практычныя заняткі № 10

**Тэма: Асаблівасці вывучэння драматургічных твораў**
Колькасць гадзін – 2

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Асаблівасці адлюстравання рэчаіснасці і чалавека ў драматургічным творы.
2. Спецыфіка аналізу драматургічнага твора ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі: мэты, этапы, форма і змест.
3. Шляхі аналізу драматургічнага твора.
4. Метады і прыёмы вывучэння драматургічных твораў.

**Заданні:**

1. Падрыхтуйце паведамленне *"Прыёмы, якія стымулююць развіццё ў вучняў самастойнасці, творчага ўяўлення"*.

2. Напішыце рэцэнзію на прагледжаны вамі спектакль (на выбар студэнта).

3. Распрацуйце сістэму ўрокаў па вывучэнні камедыі *К. Крапівы “Хто смяецца апошнім”*.

4. Распрацуйце канспект аднаго ўрока па вывучэнні камедыі *К. Крапівы “Хто смяецца апошнім” (у сістэме вывучэння творчасці К. Крапівы)*.

Для даведкі: Пры аналізе твора неабходна звярнуць увагу на:

a) час напісання;
b) актуальнасць праблем, узнятых у творы;
c) сюжэтную аснову камедыі;
d) канфлікт у п’есе;
e) маштабнасць сатырычных вобразаў Гарлахвацкага і Зёлкіна;
f) эвалюцыю характару Тулягі;
g) вобразы – носьбіты аўтарскай пазіцыі: Чарнавус, Левановіч, Вера;
h) сродкі і прыёмы сатырычнай тыпізацыі і індывідуалізацыі;
i) мову персанажаў як сродак раскрыцця іх характараў;
j) выкарыстанне сатырычных прыёмаў;
k) сцэнічнае жыццё п’есы.

5. Складзіце рэестр літаратуразнаўчых тэрмінаў, якія вучні павінны засвоіць пры вывучэнні драматургічных твораў у школе. Да кожнага з паняццяў гэтага рэестра падбярыце 3-5 прыкладаў з драматургічных твораў, якія вывучаюцца ў адпаведных класах.

Літаратура: 9, 24, 25, 42, 48, 57, 58, 59, 70, 73, 81.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Практычныя заняткі № 11

**Тэма: Асаблівасці вывучэння фальклору**
Колькасць гадзін – 2

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Роля фальклорнай спадчыны ў выхаванні навучэнцаў.
2. Месца фальклору ў школьнай праграме па літаратуры.
3. Спецыфіка вывучэння міфаў, казак, легендаў і паданняў ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.
4. Спецыфіка вывучэння прыказак, прымавак, прыкмет і павер’яў, загадак ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.
5. Спецыфіка вывучэння народных песень ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.
6. Арганізацыя творчай работы навучэнцаў пры вывучэнні вуснай народнай творчасці.

**Заданні:**

1. Падрыхтуйце мастацкае расказванне легенды (падання), якое тлумачыць паходжанне назвы вашай мясцовасці.
2. Складзіце казку ў адпаведнасці з рэкамендацыямі па развіцці маўлення з “Прыкладнага каляндарна-тэматычнага планавання…” (5 клас). Рэкамендацыя: можна выкарыстаць матэрыял з Дадатка 4. Мэта працы з гэтым матэрыялам – засвоіць адзін з варыянтаў працы з фальклорным матэрыялам па сістэме перспектыўных ліній і выкарыстаць яго пры распрацоўцы прапанаванага вышэй задання.
3. Складзіце табліцу *“Тэматыка беларускіх прыказак”*.
4. Складзіце табліцу *“Прыёмы пабудовы загадак”*.
5. Падрыхтуйце канспект урока (пазакласнага мерапрыемства) па вывучэнні фальклорнай спадчыны ў школе (клас, тэма – на выбар).
6. Складзіце рэестр літаратуразнаўчых тэрмінаў, якія вучні павінны засвоіць пры вывучэнні фальклору ў школе. Да кожнага з паняццяў гэтага рэестра падбярыце 3-5 прыкладаў з фальклорных твораў, якія вывучаюцца ў адпаведных класах.
7. Падрыхтуйце паведамленне *“Выкарыстанне краязнаўчага матэрыялу на ўроках беларускай літаратуры”*.

Літаратура: 6, 16, 23, 33, 57, 58, 59, 73.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Практычныя заняткі № 12

**Тэма: Вывучэнне аглядавых тэм у курсе літаратуры**
Колькасць гадзін – 2

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Спецыфіка выкладання курса беларускай літаратуры на гісторыка-храналагічнай аснове.
2. Спецыфіка вывучэння аглядавых тэм у курсе літаратуры IX–XI класаў.
3. Методыка правядзення ўрокаў па вывучэнні аглядавых тэм.
4. Спецыфіка выкарыстання нагляднасці, тэхнічных і інфармацыйных сродкаў пры вывучэнні аглядавых тэм.

**Заданні:**

1. Падрыхтуйце паведамленне па адной з прапанаваных тэм:
   *a) Як зрабіць лекцыю актыўным метадам навучання;*
   *b) Арганізацыя самастойнай працы пры вывучэнні аглядавых тэм.*

2. Распрацуйце канспект урока па вывучэнні аглядавай тэмы (клас, тэма – на выбар).

Літаратура: 12, 39, 40, 26, 57, 58, 59, 73.

## Практычныя заняткі № 13

**Тэма: Вывучэнне манаграфічных тэм у курсе літаратуры**
Колькасць гадзін – 2

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Асаблівасці вывучэння манаграфічных тэм у курсе літаратуры на гістарычнай аснове.
2. Структура манаграфічнай тэмы.
3. Методыка вывучэння манаграфічнай тэмы: мэты, этапы, форма і змест.
4. Шляхі аналізу (паслядоўны, паралельны) манаграфічнага матэрыялу.

**Заданні:**

1. Распрацуйце сістэму ўрокаў па вывучэнні манаграфічнай тэмы *“Іван Шамякін. Аповесці “Непаўторная вясна” або “Гандлярка і паэт”; раман Сэрца на далоні” (6 гадзін)”.*

2. Распрацуйце канспект аднаго ўрока ў кантэксце прапанавай вышэй тэмы.

Літаратура: 4, 15, 17, 57, 58, 59, 73, 85.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Практычныя заняткі № 14

**Тэма: Тэорыя літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.**
Колькасць гадзін – 2

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Сістэма тэарэтыка-літаратурных паняццяў, якія вывучаюцца ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, іх месца ў літаратурнай адукацыі вучняў.

2. Паслядоўнасць фарміравання тэарэтыка-літаратурных паняццяў пры вывучэнні літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.
3. Прыёмы вывучэння тэорыі літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

**Заданні:**

1. Складзіце казку пра адно з тэарэтыка-літаратурных паняццяў, якое вывучаецца ў 5 – 7 класах. Рэкамендацыя на прафесійную перспектыву: гэту казку можна будзе выкарыстаць пры вывучэнні гэтага паняцця ў адпаведным класе.
2. Распрацуйце фрагмент урока па вывучэнні тэарэтыка-літаратурнага паняцця (клас, тэма – на выбар студэнта).

Літаратура: 3, 37, 49, 57, 58, 59, 66, 67, 73, 77, 84, 88.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Практычныя заняткі № 15-16

**Тэма: Развіццё вуснага і пісьмовага маўлення на ўроках літаратуры**
Колькасць гадзін – 4

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Патрабаванні школьнай праграмы па літаратуры да заняткаў па развіцці вуснага маўлення вучняў.
2. Прыёмы развіцця вуснага маўлення навучэнцаў, іх сутнасць і спецыфіка.
3. Пісьмовыя працы як сродак развіцця маўленчых навыкаў.
4. Сачыненні як від творчых работ па літаратуры: патрабаванні, класіфікацыя, этапы і формы падрыхтоўчай працы навучэнцаў, кампазіцыя.
5. Аналіз сачынення па літаратуры.
6. Развіццё маўлення лагічнага тыпу на ўроках літаратуры: складанне плана, тэзісаў, канспекта, напісанне рэферата, даклада па адной і некалькіх крыніцах.

**Заданні:**

1. Карыстаючыся праграмай па беларускай літаратуры, запоўніце наступную табліцу:

*Асноўныя віды вусных і пісьмовых работ па літаратуры*

| *Клас* | *Асноўныя віды вусных работ* | *Асноўныя віды пісьмовых работ* | *Заўвагі* |
|---|---|---|---|
| *5* | | | |
| *6* | | | |
| *7* | | | |
| *8* | | | |
| *9* | | | |
| *10* | | | |
| *11* | | | |

2. Складзіце алгарытм аналізу школьнага сачынення.
3. Складзіце памятку для навучэнцаў *“Як выконваць работу над памылкамі”.*
4. Распрацуйце сістэму працы настаўніка і навучэнцаў ў кантэксце іх дзейнасці па развіцці вуснага і пісьмовага маўлення ў 6 (7) класе (планаванне этапаў працы, форм і іх зместу – для настаўніка; этапы і формы працы вучняў). Рэкамендацыя: можна выкарыстаць матэрыялы з Дадатка 4. Мэта працы з гэтым матэрыялам: засвоіць адзін з варыянтаў працы настаўніка і вучняў па развіцці маўлення ў кантэксце сістэмы перспектыўных ліній з мэтай выкарыстання яго ў будучай прафесійнай дзейнасці.
5. Праверце сачыненне, зрабіце класіфікацыю памылак і пастаўце адзнаку:

*Кніга ў маім жыцці*

*Любая кніга для кожнага чалавека – гэта крыніца ведаў. Менавіта ў ёй можна знайсці адказы на ўсе пытанні. Але не кожны ўмее чытаць кнігу. Гартаць старонкі і ведаць змест – гэта зусім не значыць разумець. Трэба абавязкова падумаць над ідэяй, сэнсам. У кожным творы заложаны нейкі сэнс, і гэта не абавязкова будзе тое, аб чым гаворацца.*

*У цяперашнім часе вельмі шмат літаратуры, і мы не зусім разумеем значэнне кніг, не цэнім іх. Але на самой справе кніга – гэта каштоўнасць, у якой схавана вялікая мудрасць. Усе веды нашых пращураў, людзей, якія самі зрабілі нейкія вывады, пераданы нам менавіта праз кнігу.*

*Умець чытаць кнігу – гэта вялікае майстэрства, і, калі чалавек зможа ім авалодаць, то ён, зразумела, знойдзе сябе ў жыцці, авалодае*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*духоўнымі каштоўнасцямі, знойдзе адказы на ўсе пытанні. Жывым прыкладам гэтаму з’яўляецца Францыск Скарына. Гэты чалавек лічыў, што ў Бібліі можна знайсці ўсе навукі і адказы на пытанні, але для гэтага трэба ўмець чытаць.*

*Для мяне кніга – гэта не той сродак, якім я карыстаюся кожны дзень. Я чытаю не дужа часта, але кнігу не выключаю са свайго жыцця. Акрамя тых кніх, якія мы павінны чытаць, я час ад часу перачытваю літаратуру па спецыяльнасці, кнігі пра жывапіс, мастацкія аповесці, апавяданні, якія мне здаюцца цікавымі. Люблю чытаць літаратуру, якая дае магчымасць паразважаць, глыбока прадумаць вобразы. Вельмі цікава чытаць пра лёс людзей, вельмі розных, але ў нечым і падобных. Калі чытаеш мастацкую літаратуру, то робіш для сябе нейкія вывады, атрымліваеш вопыт, які можа спатрэбіцца ў жыцці. Пагэтаму нават мастацкая літаратура можа стаць крыніцай нейкіх ведаў.*

*Кніга нават у сучасным жыцці застаецца для мяне помнікам аб мінулым, вялікім скарбам, які застаўся нам ад нашых продкаў і які мы па вінны перадаць сваім унукам.*

Якім нарматыўным прававым актам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь вы кіраваліся пры ацэнцы?

Літаратура: 7, 37, 46, 50, 55, 57, 58, 59, 73, 75, 80, 82.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Практычныя заняткі № 17

**Тэма: Факультатыўныя заняткі па літаратуры**
Колькасць гадзін – 2

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Месца факультатыўных заняткаў у сістэме адукацыі і развіцці навучэнцаў, іх сувязь з вучэбнай і пазакласнай працай.
2. Мэты, структура факультатыўных заняткаў у сістэме літаратурнай адукацыі.

3. Віды факультатыўных заняткаў: уводныя, паглыбляльныя, развівальныя (міжпрадметныя).
4. Форма навучання на факультатыўных занятках.
5. Тэматыка факультатыўных занятаў і методыка іх правядзення ў V–VIII і IX–XI класах.

**Заданні:**

1. Пазнаёмцеся з праграмамі факультатыўных заняткаў па беларускай літаратуры для розных класаў на афіцыйным сайце Навукова-метадычнай установы “Нацыянальны інстытут адукацыі”: www.adu.by. Вызначце іх тэматыку, актуальнасць, мэтазгоднасць іх правядзення ў сучаснай школе. Свае назіранні сістэматызуйце ў адпаведнасці з наступнай схемай:

| Клас | Назва факультатыва | Тэма | Мэта правядзення | Актуальнасць для вучняў | Колькасць гадзін |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | |

2. Прапануйце свае тэмы факультатыўных заняткаў (класы – на выбар).

3. Распрацуйце канспект факультатыўных заняткаў па беларускай літаратуры (тэма, клас – на выбар).

4. Падрыхтуйце паведамленне *“Выкарыстанне краязнаўчага матэрыялу на факультатыўных занятках па беларускай літаратуры”*.

Літаратура: 16, 44, 45, 57, 58, 59, 73, 74.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Практычныя заняткі № 18

**Тэма: Планаванне вучэбнай дзейнасці настаўніка беларускай літаратуры**
Колькасць гадзін – 2

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Значэнне планавання вучэбнай дзейнасці настаўніка ў павышэнні эфектыўнасці заняткаў па літаратуры і ў пазакласнай дзейнасці.
2. Перспектыўнае планаванне: каляндарны, тэматычны, каляндарна-тэматычны план (мэты, структура, змест).
3. Бягучае планаванне: план, план-канспект, канспект урока, тэхналагічная карта ўрока (мэты, структура, змест).

**Заданні:**

1. Зрабіце каляндарна-тэматычнае планаванне ўрокаў беларускай літаратуры для IX–XI класаў (на выбар) на першае або другое паўгоддзе (на выбар) навучальнага года. У спісе літаратуры адзначце, якімі нарматыўнымі прававымі актамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь вы кіраваліся пры гэтым?
2. Распрацуйце план-канспект і тэхналагічную карту ўрока (клас, тэма – на выбар).

Літаратура: 1, 57, 58, 59, 73.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Практычныя заняткі № 19

**Тэма: Улік і ацэнка ведаў, уменняў і навыкаў навучэнцаў. Крытэрыі ацэнкі**

Колькасць гадзін – 2

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Агульная характарыстыка метадаў кантролю вучэбнай дзейнасці навучэнцаў.
2. Апытванне як асноўны від кантролю і ўліку ведаў навучэнцаў: мэты, этапы, формы і змест.
3. Роля самастойных, кантрольных прац, залікаў пры ацэнцы ведаў навучэнцаў па літаратуры.
4. Дамашнія заданні па беларускай літаратуры: мэты, месца ў сістэме ўрока, формы і іх змест.
5. Тэматычны кантроль па беларускай літаратуры: мэты, этапы, формы і іх змест.
6. Тэсты як форма праверкі ведаў і ўменняў па літаратуры: мэты, віды, форма, змест, выхад на сістэму перспектыўных ліній.
7. Дзесяцібальная сістэма ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў: агульная характарыстыка, практычнае выкарыстанне ў працы настаўніка, этапы звароту да яе школьнікаў і асаблівасці выкарыстання яе навучэнцамі.
8. Крытэрыі і паказчыкі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці па беларускай літаратуры: агульная характарыстыка, асаблівасці практычнага выкарыстання іх у працы настаўніка.

**Заданні:**

1. Распрацуйце пытанні і заданні для індывідуальнай праверкі ведаў і ўменняў навучэнцаў па пэўнай тэме (тэма, клас – на выбар студэнта), зрабіце пяць картак для апытвання (па два пытанні – асноўнае і дадатковае).
2. Пазнаёмцеся з прапанаваным варыянтам тэматычнага кантролю:

*Іван Мележ “Людзі на балоце”*

*Першы ўзровень*

*Што вы ведаеце з гісторыі напісання “Палескай хронікі” І. Мележа?*

*З якіх раманаў яна складаецца.*

*Другі ўзровень*

*Адносінамі да якіх падзей выпрабоўвае сваіх герояў пісьменнік?*

*Трэці ўзровень*

*Дайце сваю ацэнку ўчынкам і паводзінам Ганны Чарнушкі. Што дае падставу назваць яе “прыгожай і калючай кветкай палескай шыпшыны”?*

*Чацвёрты ўзровень*

*Якое ўражанне на вас зрабіў вобраз Васіля Дзятла, якія пачуцці абудзіў – спагады да яго, сімпатыі, шкадавання ці асуджэння?*

*Пяты ўзровень*

*Праблема калектывізацыі – адна з асноўных у рамане І. Мележа “Людзі на балоце”. Прыгадайце імёны пісьменнікаў, якія звярталіся да гэтай праблемы і назвы твораў. У якіх з іх, на ваш погляд, найбольш поўна раскрыта гістарычная праўда калектывізацыі?*

Ці адпавядаюць прапанаваныя пытанні і заданні ўзроўням засваення вучэбнага матэрыялу? Прапануйце свой варыянт тэматычнага кантролю (клас, тэма – на выбар).

3. Распрацуйце 10 тэставых заданняў рознага тыпу для тэматычнага кантролю (твор, тэма – на выбар).
4. Падрыхтуйце паведамленне па адной з прапанаваных тэм:
   *a) Асаблівасці арганізацыі самастойнай работы вучняў на ўроках беларускай літаратуры.*
   *b) Арганізацыя самастойнай вучэбнай дзейнасці вучняў у пазаўрочны час.*
   *c) Спецыфіка арганізацыі навукова-даследчай дзейнасці вучняў па беларускай літаратуры.*

Літаратура: 11, 28, 36, 37, 58, 59, 73, 83.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## *Тэставыя заданні для кантролю*

### Блок I “Гісторыя выкладання методыкі беларускай літаратуры першай паловы XX ст.”

**1. У якім годзе Пастановай урада БССР у школах усіх тыпаў на тэрыторыі рэспублікі была ўведзена беларуская літаратура як абавязковы прадмет?**

а) 1917 г.;
б) 1923 г.;
в) 1935 г.;
г) 1948 г.

**2. У які перыяд методыка выкладання беларускай літаратуры развівалася надзвычай плённа?**

а) 90-я гады XIX ст.;
б) 20-я гады XX ст.;
в) 30-я гады XX ст.;
г) першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.

**3. Аўтарам кнігі “Методыка роднае мовы” з’яўляецца:**

а) І.І. Замоцін;
б) А.Я. Багдановіч;
в) К.М. Міцкевіч;
г) Цётка.

**4. Праца прафесара І.І. Замоціна называлася:**

а) “Беларуская літаратура ў школе”;
б) “Мастацкая літаратура”;
в) “Мастацкая літаратура ў школьным выкладанні”;
г) “Методыка беларускай літаратуры”.

**5. З 1924 года беларуская літаратура ў 5–7 класах уваходзіла ў комплекс:**

а) праца;
б) грамадства;
в) прырода;
г) чалавек.

**6. У якім годзе была апублікавана першая праграма па беларускай літаратуры для 5–7 класаў?**

а) 1917 г.;
б) 1924 г.;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

в) 1937 г.;
г) 1948 г.

**7. Хто з пералічаных асоб з'яўляецца аўтарам чытанкі "Родныя шляхі"?**
а) І.К. Самковіч;
б) І.І. Пратасевіч;
в) Я. Колас;
г) Цётка.

**8. Першыя падручнікі гісторыка-літаратурнага тыпу для 8–10-х класаў былі створаны:**
а) у канцы 40-х гг.;
б) у пачатку 50-х гг.;
в) у канцы 30-х гг.;
г) у пачатку 60-х гг.

**9. У аснову Дальтона-плана быў пакладзены:**
а) метад творчага чытання;
б) лабараторны метад;
в) даследчы метад;
г) метад дэманстрацыі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Блок II "Гісторыя выкладання методыкі беларускай літаратуры другой паловы XX ст."

**1. Калі выйшла праца В.Я. Ляшук "Методыка выкладання беларускай літаратуры", якая была зацверджана Міністэрствам асветы БССР у якасці навучальнага дапаможніка:**
а) у 1986 г.;
б) у 1996 г.;
в) у 2002 г.;
г) у 2005 г.

**2. Якая з пералічаных кніг серыі "Пісьменнік у школе" НЕ змяшчала распрацоўкі ўрокаў па творчасці пісьменніка?**
а) Л. Семяноўская "Міхась Лынькоў у школе";
б) У. Міцкевіч "Пятрусь Броўка ў школе";
в) В. Ляшук "Іван Мележ у школе";
г) М. Барсток "Нарыс аб жыцці і творчасці М. Багдановіча".

**3. Хто з’яўляецца аўтарам распрацоўкі “Праблемнае выкладанне літаратуры ў X – XI класах па сістэме перспектыўных ліній”?**

а) А.М. Макарэвіч;
б) В.І. Русілка;
в) М.І. Мішчанчук;
г) І.І. Замоцін.

**4. Гэты метадычны часопіс пачаў выходзіць у 1988 годзе, зараз ён называецца**

а) “Школа і культура Савецкай Беларусі”;
б) “Беларуская думка”;
в) “Роднае слова”;
г) “Працаўнік асветы”.

**5. Дзейнасць якога метадыста адносіцца да канца XX – пачатку XXI стст.**

а) К. Міцкевіч;
б) І. Замоцін;
в) В. Ляшук;
г) М. Каспяровіч.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Блок III “Методыка выкладання беларускай літаратуры як навукова-педагагічная дысцыпліна”

**1. Прадметам методыкі выкладання літаратуры з’яўляецца:**

а) даследаванне заканамернасцей працэсу вывучэння літаратуры ў сярэдняй школе;
б) даследаванне метадаў і прыёмаў выкладання літаратуры ў сярэдняй школе;
в) разгляд асноўных шляхоў вывучэння літаратуры ў сярэдняй школе;
г) беларуская літаратура.

**2. Задачай методыкі выкладання беларускай літаратуры НЕ з’яўляецца:**

а) пазнаёміць вучняў з тэарэтычнымі асновамі выкладання літаратуры;
б) выпрацаваць першапачатковыя практычныя ўменні і навыкі для падрыхтоўкі да ўрокаў роднай літаратуры;

в) навучыць карыстацца тэхнічнымі і інфармацыйнымі сродкамі навучання;

г) даць напрамкі да самаадукацыі і творчага пошуку.

**3. Методыка выкладання беларускай літаратуры цесна звязана з такой навукай, як:**

а) хімія;

б) матэматыка;

в) фізіка;

г) лінгвістыка.

**4. Аб'ектам вывучэння беларускай літаратуры як навучальнага прадмета ў школе з'яўляюцца:**

а) гістарычныя падзеі;

б) законы развіцця грамадства;

в) мастацкія творы;

г) мастацтва ў цэлым.

**5. Агульныя мэты школьнага курса літаратуры акрэслены:**

а) Адукацыйным стандартам вучэбнага прадмета "Беларуская літаратура" (I – XI класы);

б) Кодэксам аб адукацыі Рэспублікі Беларусь;

в) Інструкцыяй аб парадку фарміравання культуры вуснага і пісьмовага маўлення ў агульнаадукацыйных установах Рэспублікі Беларусь;

г) Ацэнкамі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па вучэбным прадмеце "Беларуская літаратура".

**6. Метадам даследавання методыкі выкладання беларускай літаратуры НЕ з'яўляецца:**

а) абагульненне перадавога вопыту аднаго ці групы настаўнікаў;

б) метад зрэзаў;

в) параўнанне зместу падручніка з праграмай;

г) навукова-метадычны эксперымент.

## Блок IV "Арганізацыйныя асновы методыкі беларускай літаратуры"

**1. Канцэпцыя вучэбнага прадмета "Беларуская літаратура" была распрацавана і зацверджана:**

а) у 1991 г.;

б) у 1998 г.;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

в) у 2004 г.;
г) у 2009 г.

**2. З якога класа беларуская літаратура пачынае вывучацца як самастойны прадмет?**
а) з 1 класа;
б) з 4 класа;
в) з 5 класа;
г) з 9 класа.

**3. З якога класа згодна з канцэпцыяй вучэбнага прадмета “Беларуская літаратура” літаратура вывучаецца на гісторыка-храналагічнай аснове?**
а) 8 класа;
б) 9 класа;
в) 10 класа;
г) 11 класа.

**4. У якіх класах згодна з канцэпцыяй вучэбнага прадмета “Беларуская літаратура” літаратура вывучаецца на гісторыка-літаратурнай аснове?**
а) 5 – 6 класах;
б) 7 – 8 класах;
в) 8 – 9 класах;
г) 10 – 11 класах.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Блок V “Метады і прыёмы выкладання беларускай літаратуры”

**1. Метады навучання – гэта...**
а) адзінка вучэбнага працэсу;
б) спосабы работы настаўніка і вучняў, пры дапамозе якіх дасягаецца авалодванне ведамі, уменнямі і навыкамі, фарміруецца светапогляд вучняў, развіваюцца іх здольнасці;
в) структурны элемент урока;
г) асноўныя правілы настаўніка на ўроку.

**2. Да славесных метадаў навучання адносяцца:**
а) дэманстрацыя;
в) гутарка;
г) ілюстрацыя;
д) самастойная работа вучняў.

**3. Да наглядных метадаў навучання адносяцца:**
а) лекцыя;
б) каменціраванае чытанне;
в) ілюстрацыя;
г) самастойная работа вучняў.

**4. Які від пераказу выкарыстоўваецца з мэтай засяродзіць увагу на самым галоўным, арыентуе вучняў карыстацца сваімі словамі?**
а) падрабязны;
б) сціслы;
в) творчы;
г) выбарачны.

**5. Які від пераказу вядзецца ад імя адной з дзеючых асоб?**
а) падрабязны;
б) сціслы;
в) творчы;
г) выбарачны.

**6. Метад, пры якім ажыццяўляецца паслядоўны выклад навучальнага матэрыялу настаўнікам, называецца:**
а) лекцыя;
б) пераказ;
в) мастацкае расказванне;
г) дэманстрацыя.

**7. Якая гутарка праводзіцца для таго, каб вучні аднавілі веды, атрыманыя з мастацкага твора, са слоў настаўніка, з падручніка і іншых крыніц інфармацыі?**
а) рэпрадуктыўная;
б) эўрыстычная;
в) рэпрадуктыўна-эўрыстычная;
г) праблемная.

**8. Які метад з'яўляецца найвышэйшай ступенню навучання літаратуры, прымяняецца толькі ў тым выпадку, калі вучні авалодалі прыёмамі самастойнай працы?**
а) даследчы;
б) эўрыстычны;
в) рэпрадуктыўны;
д) метад творчага чытання.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**9. Сутнасць якога метаду ў тым, што вучні атрымліваюць веды ў гатовым выглядзе са слоў настаўніка, са школьнага падручніка, з навукова-папулярнай літаратуры?**

а) даследчага;

б) эўрыстычнага;

в) рэпрадуктыўнага;

д) метаду творчага чытання.

**10. Асноўным метадам вывучэння аглядавых тэм з'яўляецца:**

а) лекцыя;

б) гутарка;

в) дэманстрацыя;

г) самастойная работа.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Блок VI "Прынцыпы выкладання беларускай літаратуры"

**1. Да агульнаадукацыйнага прынцыпу выкладання беларускай літаратуры адносіцца**

а) гістарызм;

б) паслядоўнасць;

в) цэласнае ўспрыманне мастацкага твора;

г) вывучэнне мастацкага твора ў адзінстве формы і зместу.

**2. Да прыватнага прынцыпу выкладання беларускай літаратуры адносіцца**

а) навуковасць;

б) сістэматычнасць;

в) цэласнае ўспрыманне мастацкага твора;

г) паслядоўнасць.

**3. Які прынцып выкладання беларускай літаратуры рэалізуецца, калі настаўнік абавязвае чытаць мастацкі твор поўнасцю?**

а) навуковасць;

б) гістарызм;

в) цэласнае ўспрыманне мастацкага твора;

г) паслядоўнасць.

**4. Які прынцып выкладання беларускай літаратуры рэалізуецца, калі настаўнік падае вучэбны матэрыял у адпаведнасці з самымі новымі дасягненнямі літаратуразнаўства?**

а) гістарызм;

б) навуковасць;

в) цэласнае ўспрыманне мастацкага твора;
г) вывучэнне мастацкага твора ў адзінстве формы і зместу.

**5. Дэманстрацыя карціны на ўроку па вывучэнні верша Я. Коласа “Ручэй” – гэта выкарыстанне:**
а) слыхавой нагляднасці;
б) зрокавай нагляднасці;
в) дынамічнай нагляднасці;
г) не з’яўляецца нагляднасцю.

**6. Нагляднасць на ўроках беларускай літаратуры выкарыстоўваецца, каб:**
а) своеасабліва адрэгуляваць сувязь паміж пачуццёвым і лагічным пазнаннем у працэсе ўспрымання мастацкага вобраза;
б) прадэманстраваць вучням інтэлектуальнае развіццё настаўніка;
в) скасаваць сувязь паміж пачуццёвым і лагічным пазнаннем у працэсе ўспрымання мастацкага вобраза;
г) заняць больш часу на ўроку.

**7. Нагляднасць на ўроку беларускай літаратуры:**
а) павінна падмяніць сабой вывучэнне мастацкага твора;
б) служыць сродкам міжпрадметных сувязяў;
в) не павінна выкарыстоўвацца;
г) адцягвае ўвагу вучня ад вывучэння мастацкага твора.

**8. Праграма па беларускай літаратуры:**
а) не дае ніякіх рэкамендацый па выкарыстанні нагляднасці;
б) дае рэкамендацыі па выкарыстанні нагляднасці адным блокам у пачатку праграмы;
в) дае рэкамендацыі па выкарыстанні нагляднасці адным блокам у канцы праграмы;
г) дае рэкамендацыі па выкарыстанні нагляднасці ў рубрыцы “Мастацтва” пасля асобных раздзелаў.

**9. Прынцып нагляднасці:**
а) адносіцца да агульнадыдактычных прынцыпаў навучання;
б) адносіцца да прыватных прынцыпаў выкладання беларускай літаратуры;
в) адносіцца да агульнадыдактычных і прыватных прынцыпаў выкладання беларускай літаратуры;
г) не з’яўляецца прынцыпам дыдактыкі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Блок VII “Нізкі (рэцэптыўны) узровень вучэбных дасягненняў школьнікаў”

**1. Якімі баламі ацэньваецца нізкі (рэцэптыўны) узровень вучэбных дасягненняў школьнікаў?**

а) 1-2;
б) 3-4;
в) 5-6;
г) 7-8.

**2. Які ўзровень засваення вучэбнага матэрыялу адпавядае ацэнцы 1-2 балы?**

а) узровень пазнавання аб’екта вывучэння;
б) узровень неўсвядомленага ўзнаўлення вучэбнага матэрыялу;
в) узнаўленне вучэбнага матэрыялу на ўзроўні разумення;
г) узровень прымянення ведаў у знаёмай сітуацыі.

**3. Вызначце ўзровень засваення вучэбнага матэрыялу, калі вучань можа адказаць толькі на пытанні “Што адбываецца ў творы? Пра каго ідзе гаворка ў творы?”**

а) нізкі (рэцэпцыйны);
б) здавальняльны (рэцэптыўна-рэпрадуктыўны);
в) сярэдні (рэпрадуктыўна-прадуктыўны);
г) высокі (прадуктыўны, творчы).

**4. Выкананне вучнем задання тыпу “Назавіце галоўных герояў мастацкага твора” адносіцца да ўзроўню:**

а) здавальняльнага (рэцэптыўна-рэпрадуктыўнага);
б) нізкага (рэцэптыўнага);
в) дастатковага (прадуктыўнага);
г) высокага (прадуктыўнага, творчага)

## Блок VIII “Здавальняльны (рэцэптыўна-рэпрадуктыўны) узровень вучэбных дасягненняў школьнікаў”

**1. Якімі баламі ацэньваецца здавальняльны (рэцэптыўна-рэпрадуктыўны) узровень вучэбных дасягненняў школьнікаў?**

а) 1-2;
б) 3-4;
в) 5-6;
г) 7-8.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**2. Які ўзровень засваення вучэбнага матэрыялу адпавядае ацэнцы 3-4 балы?**

а) узровень пазнавання аб'екта вывучэння;

б) узровень неўсвядомленага ўзнаўлення вучэбнага матэрыялу;

в) узнаўленне вучэбнага матэрыялу на ўзроўні разумення;

г) узровень прымянення ведаў у знаёмай сітуацыі.

**3. Вызначце ўзровень засваення вучэбнага матэрыялу, калі вучань можа адказаць толькі на пытанні "Якая тэма твора? Станоўчы ці адмоўны гэта герой?"**

а) нізкі (рэцэптыўны);

б) здавальняльны (рэцэптыўна-рэпрадуктыўны);

в) сярэдні (рэпрадуктыўна-прадуктыўны);

г) высокі (прадуктыўны, творчы).

**4. Выкананне вучнем задання тыпу "Назавіце асаблівасці пэўнага літаратурнага роду" адносіцца да ўзроўню:**

а) здавальняльны (рэцэптыўна-рэпрадуктыўнага);

б) нізкага (рэцэптыўнага);

в) дастатковага (прадуктыўнага);

г) высокага (прадуктыўнага, творчага).

## Блок IX "Сярэдні (рэпрадуктыўна-прадуктыўны) узровень вучэбных дасягненняў школьнікаў"

**1. Якімі баламі ацэньваецца сярэдні (рэпрадуктыўна-прадуктыўны) узровень вучэбных дасягненняў школьнікаў?**

а) 3-4;

б) 5-6;

в) 7-8;

г) 9-10.

**2. Які ўзровень засваення вучэбнага матэрыялу адпавядае ацэнцы 5-6 балаў?**

а) узровень неўсвядомленага ўзнаўлення вучэбнага матэрыялу;

б) узнаўленне вучэбнага матэрыялу на ўзроўні разумення;

в) узровень прымянення ведаў у знаёмай сітуацыі;

г) узровень прымянення ведаў у незнаёмай сітуацыі, перанос ведаў.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**3. Вызначце ўзровень засваення вучэбнага матэрыялу, калі вучань можа адказаць на пытанні: “Як Вы ацэньваеце падзеі, апісаныя ў творы? Чаму такі герой і яго ўчынкі”:**

а) нізкі (рэцэптыўны);
б) здавальняльны (рэцэптыўна-рэпрадуктыўны);
в) сярэдні (рэпрадуктыўна-прадуктыўны);
г) высокі (прадуктыўны, творчы).

**4. Выкананне вучнем задання тыпу “Абгрунтуйце прапанаваны настаўнікам тэзіс” адносіцца да якога ўзроўню:**

а) сярэдняга (рэпрадуктыўна-прадуктыўнага);
б) нізкага (рэцэптыўнага);
в) дастатковага (прадуктыўнага);
г) высокага (прадуктыўнага, творчага).

## Блок X “Дастатковы (прадуктыўны) узровень вучэбных дасягненняў школьнікаў”

**1. Якімі баламі ацэньваецца дастатковы (прадуктыўны) узровень вучэбных дасягненняў школьнікаў?**

а) 3-4;
б) 5-6;
в) 7-8;
г) 9-10.

**2. Які ўзровень засваення вучэбнага матэрыялу адпавядае ацэнцы 7-8 балаў?**

а) узровень неўсвядомленага ўзнаўлення вучэбнага матэрыялу;
б) узнаўленне вучэбнага матэрыялу на ўзроўні разумення;
в) узровень прымянення ведаў у знаёмай сітуацыі;
г) узровень прымянення ведаў у незнаёмай сітуацыі, перанос ведаў.

**3. Вызначце ўзровень засваення вучэбнага матэрыялу, калі вучань можа адказаць на пытанні “Якая аўтарская пазіцыя выказана ў мастацкім творы?”:**

а) нізкі (рэцэптыўны);
б) здавальняльны (рэцэптыўна-рэпрадуктыўны);
в) дастатковы (прадуктыўны);
г) сярэдні (рэпрадуктыўна-прадуктыўны).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**4. Выкананне вучнем задання тыпу “Вызначыць кампазіцыйную будову твора, ролю пейзажу, партрэта, мастацкай дэталі” adносіцца да ўзроўню:**

а) нізкага (рэцэптыўнага);
б) здавальняльнага (рэцэптыўна-рэпрадуктыўнага);
в) дастатковага (прадуктыўнага);
г) высокага (прадуктыўнага, творчага).

## Блок XI “Высокі (прадуктыўны, творчы) узровень вучэбных дасягненняў школьнікаў”

**1. Якімі баламі ацэньваецца высокі (прадуктыўны, творчы) узровень вучэбных дасягненняў школьнікаў?**

а) 3-4;
б) 5-6;
в) 7-8;
г) 9-10.

**2. Які ўзровень засваення вучэбнага матэрыялу адпавядае ацэнцы 9-10 балаў?**

а) узровень неўсвядомленага ўзнаўлення вучэбнага матэрыялу;
б) узнаўленне вучэбнага матэрыялу на ўзроўні разумення;
в) узровень прымянення ведаў у знаёмай сітуацыі;
г) узровень прымянення ведаў у незнаёмай сітуацыі, перанос ведаў.

**3. Вызначце ўзровень засваення вучэбнага матэрыялу, калі вучань можа адказаць на пытанні “Якія вы можаце прасачыць паралелі з ужо вядомым, іншымі творамі аўтара і творамі?”:**

а) нізкі (рэцэптыўны);
б) здавальняльны (рэцэптыўна-рэпрадуктыўны);
в) сярэдні (рэпрадуктыўна-прадуктыўны);
г) высокі (прадуктыўны, творчы).

**4. Выкананне вучнем задання тыпу “Супастаўце літаратурны твор з яго інтэрпрэтацыяй у іншых відах мастацтва” адносіцца да ўзроўню:**

а) сярэдняга (рэпрадуктыўна-прадуктыўнага);
б) нізкага (рэцэптыўнага);
в) дастатковага (прадуктыўнага);
г) высокага (прадуктыўнага, творчага).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Блок XII “Урок – асноўная форма арганізацыі выкладання беларускай літаратуры”

**1. Урок – гэта:**

а) пэўныя метадалагічныя палажэнні, якімі вызначаецца працэс навучання і выхавання;

б) навукова арганізаваная сістэма сумеснай дзейнасці настаўніка і вучняў, накіраваная на дасягненне мэты навучальна-выхаваўчага працэсу;

в) форма навучання, у якой настаўнік на працягу ўстаноўленага часу кіруе ў спецыяльна адведзеным месцы калектыўнай пазнавальнай дзейнасцю пастаяннай групы вучняў для дасягнення адукацыйнай, выхаваўчай, развіваючай задачы;

г) калектыўнае абмеркаванне пытанняў, якія могуць выклікаць несупадзенне думак.

**2. Якая мэта пры складанні канспекта ўрока па беларускай літаратуры НЕ ставіцца?**

а) адукацыйная;

б) развіваючая;

в) тэарэтычная;

г) выхаваўчая.

**3. Да нетрадыцыйных урокаў адносяцца:**

а) урок-канферэнцыя;

б) урок тлумачэння новага матэрыялу;

в) урок абагульнення і сістэматызацыі;

г) урок камбінаванай будовы.

**4. У залежнасці ад роду вывучаемага твора вылучаецца:**

а) урок па вывучэнні лірыкі;

б) урок па развіцці мовы вучняў;

в) урок-лекцыя;

г) урок аналізу творчых работ.

**5. У залежнасці ад асноўнага метаду і прыёму працы вылучаецца:**

а) урок кантролю і карэкцыі ведаў, уменняў;

б) урок па вывучэнні манаграфічных тэм;

в) урок па вывучэнні аглядавых тэм;

г) урок-гутарка.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**6. Адукацыйная тэхналогія – гэта:**

а) навукова арганізаваная сістэма сумеснай дзейнасці настаўніка і вучняў, накіраваная на дасягненне мэты навучальна-выхаваўчага працэсу, кампанентамі яе разгортвання з'яўляюцца пастаноўка мэтаў, канструяванне працэсу, мадэляванне ўзаемадзеяння настаўніка і вучняў;

б) форма навучання, у якой настаўнік на працягу ўстаноўленага часу кіруе ў спецыяльна адведзеным месцы калектыўнай пазнавальнай дзейнасцю пастаяннай групы вучняў для дасягнення адукацыйнай, выхаваўчай, развіваючай задачы;

в) пэўныя метадалагічныя палажэнні, якімі вызначаецца працэс навучання і выхавання;

г) калектыўнае абмеркаванне пытанняў, якія могуць выклікаць несупадзенне думак.

**7. Спецыфічным патрабаваннем да ўрока літаратуры НЕ з'яўляюцца:**

а) эмацыянальна-псіхалагічнае адзінства ўрока;

б) абавязковае чытанне і мэтанакіраваны адбор мастацкіх тэкстаў і ўрыўкаў з іх;

в) вывучэнне літаратуры ў кантэксце з іншымі відамі мастацтва, узаемасувязь з урокамі гуманітарнага цыклу;

г) пастаянны кантроль і самакантроль, эканомія часу.

**8. Класіфікацыя ўрокаў па дыдактычных мэтах НЕ ўключае наступны тып урока:**

а) урок пазакласнага чытання;

б) урок камбінаванай будовы;

в) урок вывучэння мастацкіх твораў;

г) урок абагульнення і сістэматызацыі матэрыялу.

**9. Структура ўрока НЕ залежыць:**

а) ад тыпу ці віду ўрока;

б) ад педагагічных задач;

в) ад узроставых асаблівасцей вучняў;

г) ад асаблівасцей настрою вучняў.

**10. НЕ адносіцца да традыцыйных (стандартных):**

а) урок – жывая газета;

б) урок камбінаванай будовы;

в) урок вывучэння новага матэрыялу;

г) урок развіцця мовы.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Блок XIII “Этапы вывучэння мастацкага твора”

**1. Да якіх заняткаў адносяцца наступныя задачы: звязаць вывучаемы матэрыял з раней вядомым, зацікавіць школьнікаў, падрыхтаваць іх інтэлектуальна і эмацыянальна да яго ўспрымання?**

а) арыенціровачныя заняткі;
б) уступныя заняткі;
в) аналіз мастацкага твора;
г) заключныя заняткі.

**2. Да якіх заняткаў адносяцца наступныя задачы: дапамагчы вучням запомніць змест твора, абмяняцца ўражаннямі пра твор, высветліць узровень, глыбіню, дакладнасць успрымання твора і пошукі праблемы аналізу?**

а) арыенціровачныя заняткі;
б) уступныя заняткі;
в) аналіз мастацкага твора;
г) заключныя заняткі.

**3. Да якіх заняткаў адносяцца наступныя мэты: паглыбіць і пашырыць першапачатковае ўспрыманне тэксту, зрабіць больш асэнсаваным і мэтанакіраваным, навучыць славесна афармляць свае ўражанні, фарміраваць чытацкія ўменні і развіваць культуру чытання?**

а) арыенціровачныя заняткі;
б) уступныя заняткі;
в) аналіз мастацкага твора;
г) заключныя заняткі.

**4. Якога шляху аналізу мастацкага твора НЕ існуе?**

а) “следам за аўтарам”;
б) павобразны;
в) сюжэтны;
г) праблемна-тэматычны.

**5. У аснове якога шляху аналізу ляжыць разгляд асноўных частак у той паслядоўнасці, у якой яны размешчаны ў мастацкім творы?**

а) “следам за аўтарам”;
б) павобразны;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

в) праблемна-тэматычны;
г) камбінаваны.

**6. У аснове якога шляху аналізу мастацкага твора ўвага вучняў канцэнтруецца на сацыяльных, маральных, філасофскіх, эстэтычных праблемах, якія вынікаюць з яго ідэйна-мастацкай асаблівасці?**
а) “следам за аўтарам”;
б) павобразны;
в) праблемна-тэматычны;
г) камбінаваны.

**7. Пры якім шляху аналізу мастацкі твор ахопліваецца цэласна, толькі яго ідэя раскрываецца праз вычляненне цэнтральнага ці некалькіх галоўных герояў, якія разглядаюцца ў іх функцыянальным значэнні?**
а) “следам за аўтарам”;
б) павобразны;
в) праблемна-тэматычны;
г) камбінаваны.

**8. Мэтай якіх заняткаў з’яўляецца падвядзенне вынікаў у сістэме працы над літаратурным творам?**
а) арыенціровачныя заняткі;
б) уступныя заняткі;
в) аналіз мастацкага твора;
г) заключныя заняткі.

**9. На якім этапе вывучэння байкі мэтазгодна выкарыстанне чытання па ролях?**
а) у пачатку вывучэння;
б) пры высвятленні чытацкага ўражання;
в) пры аналізе твора;
г) у час абагульнення.

**10. Асноўным этапам вывучэння мастацкага твора з’яўляецца:**
а) чытанне мастацкага твора;
б) уступныя заняткі;
в) напісанне сачынення па мастацкім творы;
г) арыенціровачныя заняткі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Блок XIV “Пазакласная і пазашкольная праца па літаратуры”**

**1. Які з відаў вучэбнай дзейнасці НЕ адносіцца да пазакласнай працы?**

а) літаратурнае краязнаўства;
б) літаратурныя гурткі;
в) літаратурны дыспут;
г) факультатыўныя заняткі.

**2. Які прынцып навучання адрознівае пазакласную працу ад класна-ўрочнай?**

а) прынцып сістэмнасці;
б) прынцып свядомасці;
в) прынцып уліку індывідуальных асаблівасцей вучняў;
г) прынцып добраахвотнасці.

**3. Якая задача НЕ ставіцца на ўроках пазакласнага чытання?**

а) выхаванне свядомага і ўмелага чытача;
б) прывіццё любові да самастойнага чытання;
в) пашырэнне літаратурнай адукацыі;
г) развіццё арфаграфічнай пільнасці.

**4. Як часта мэтазгодна праводзіць урокі пазакласнага чытання?**

а) 1 раз на тыдзень;
б) 2 разы на тыдзень;
в) 1 раз на год;
г) 1 раз на чвэрць.

**5. Спіс твораў для пазакласнага чытання ў вучэбнай праграме з’яўляецца:**

а) абавязковым;
б) рэкамендацыйным;
в) адвольным;
г) нарматыўным.

**6. Да формаў кантролю па выніках урока пазакласнага чытання НЕ адносяцца:**

а) гутаркі;
б) літаратурныя дзённікі;
в) урок вывучэння новага матэрыялу;
г) кантроль чытацкіх фармуляраў.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**7. Сістэматычнай формай пазакласнай працы па літаратуры з'яўляецца:**

а) літаратурны вечар;
б) літаратурны гурток;
в) літаратурны дыспут;
г) школьны спектакль.

**8. Да гурткоў літаратурнага профілю НЕ адносіцца:**

а) гурток выразнага чытання;
б) гурток "Юны літаратуразнаўца";
в) гурток "Юны мовазнаўца";
г) літаратурна-творчы.

**9. Да пастаянных форм пазакласнай працы адносіцца:**

а) пазакласнае чытанне;
б) літаратурная экскурсія;
в) літаратурная экспедыцыя;
г) літаратурны дыспут.

**10. Якая колькасць вучняў лічыцца аптымальнай для школьнага літаратурнага гуртка?**

а) 1-3;
б) 30-40;
в) 10-15;
г) 40-50.

## Блок XV "Развіццё вуснага і пісьмовага маўлення"

**1. Асноўнай мэтай работы па развіцці маўлення на ўроках літаратуры НЕ з'яўляецца**

а) выхаванне культуры моўных зносін;

б) выпрацоўка навыкаў правільнага, аптымальнага выкарыстання разнастайных моўных сродкаў;

в) падрыхтоўка вучняў да інтэлектуальнага і эмацыянальнга ўспрымання твора;

г) выпрацоўка ўменняў лагічна і выразна выражаць свае думкі і перадаваць пачуцці.

**2. Сярод патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да вуснай і пісьмовай мовы школьнікаў вылучаецца:**

а) змястоўнасць;
б) аб'ёмнасць;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

в) легкадумнасць;
г) абцяжаранасць.

**3. Спецыфічным прынцыпам работы па развіцці мовы з’яўляецца:**
а) сувязь паміж мовай і мысленнем;
б) навуковасць;
в) сістэматычнасць;
г) лагічнасць.

**4. Асноўныя патрабаванні да ўменняў і навыкаў па развіцці вуснай і пісьмовай мовы вучняў акрэслены:**
а) у Кодэксе аб адукацыі Рэспублікі Беларусь;
б) у праграме па беларускай літаратуры;
в) у школьных падручніках;
г) у каляндарным плане настаўніка.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**5. Адным з асноўных відаў развіцця пісьмовай мовы адносіцца:**
а) завучванне на памяць;
б) вуснае славеснае маляванне;
в) напісанне сачыненняў;
г) складанне партытуры мастацкага твора.

**6. У залежнасці ад навучальных задач і методыкі работы над імі вылучаецца наступны від пераказу:**
а) падрабязны;
б) адвольны;
в) сістэмны;
г) мэтанакіраваны.

**7. Пры аналізе сачынення на ўроку можна ўключаць:**
а) паўторны аналіз мастацкага твора;
б) чытанне ўзорнага сачынення;
в) чытанне найгоршага сачынення;
г) перапісванне выпраўленага настаўнікам сачынення.

**8. Адзначце пункт, у якім даецца азначэнне *водгука*:**
а) самастойны, лагічна прадуманы роздум вучня над тэмай, выказаны пісьмова па плану, абгрунтаваны фактамі і прыкладамі з аналізуемых твораў;

б) перадача ўражанняў ад прачытанага, убачанага і тлумачэнне, чым выкліканы гэтыя пачуцці;

в) від пісьмовага паведамлення, пры якім аналізуецца, ацэньваецца сачыненне, кніга, спектакль, фільм;

г) паведамленне зместу навуковай працы, артыкула.

**9. Крытычная, першая, аб’ектыўная, усебаковая ацэнка твора з пункту гледжання вартасцяў і недахопаў формы і зместу – гэта:**

а) водгук;

б) рэцэнзія;

в) анатацыя;

г) пераказ.

**10. Пры праверцы работ па развіцці маўлення (сачыненні, водгукі, пераказы) настаўнік складае наступную табліцу памылак:**

а) $\frac{\text{З – М}}{\text{I – V – Г}}$; б) $\frac{\text{М – З}}{\text{V – Г – З}}$; в) $\frac{\text{V – Г – I}}{\text{М – З}}$; г) $\frac{\text{Г – V – I}}{\text{М – З}}$.

## Блок XVI “Вывучэнне тэорыі літаратуры”

**1. Праз вывучэнне тэорыі літаратуры ў школе рэалізуецца прынцып:**

а) гістарызму;

б) навуковасці;

в) паслядоўнасці;

г) улік эмацыйнага настрою вучняў.

**2. Тэарэтычнае паняцце “апавяданне” ўводзіцца ў апарат школьнікаў:**

а) 10-11 класах;

б) 7-9 класах;

в) 5-8 класах;

г) 1-4 класах.

**3. Вывучэнне тэарэтычных паняццяў у школе адбываецца:**

а) на асобных уроках;

б) у час вывучэння пэўных мастацкіх твораў;

в) у час пазакласнай работы па беларускай літаратуры;

г) самастойна.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**4. Як называецца род літаратуры, які характарызуецца апавядальнасцю, адлюстраваннем рэчаіснасці праз падзеі (сюжэтнасць) у іх прасторава-часавай працягласці?**

а) лірыка;
б) драматургія;
в) эпас;
г) ліра-эпас.

**5. Пры вывучэнні якога мастацкага твора можна замацаваць паняцце пра эпічны род?**

а) “Людзі на балоце” І. Мележа;
б) “Бацьку” Р. Барадуліна;
в) “Князь Вітаўт” А. Дударава;
г) “Ручэй” Я. Коласа.

**6. Пры вывучэнні якога мастацкага твора можна замацаваць паняцце пра драму як род літаратуры?**

а) “Дзівак з Ганчарнай вуліцы” І. Чыгрынава;
б) “Зімой” М. Багдановіча;
в) “Хто смяецца апошнім” К. Крапівы;
г) “Курган” Я. Купалы.

**7. Пры вывучэнні якога мастацкага твора можна замацаваць паняцце пра лірыку як род літаратуры?**

а) “Сотнікаў” В. Быкава;
б) “Зімой” М. Багдановіча;
в) “Зацюканы апостал” А. Макаёнка;
г) “Каласы пад сярпом тваім” У. Караткевіча.

**8. Пры вывучэнні якога мастацкага твора можна замацаваць паняцце пра апавяданне як жанр эпасу?**

а) “Сябры” А. Васілевіч;
б) “Знак бяды” В. Быкава;
в) “Родная мова” М. Танка;
г) “Пошукі будучыні” К. Чорнага.

**9. Пры вывучэнні якога мастацкага твора можна замацаваць паняцце пра раман як жанр эпасу?**

а) “Маналог” А. Куляшова;
б) “Ворагі” М. Зарэцкага;
в) “Людзі на балоце” І. Мележа;
г) “Дыпламаваны баран” К. Крапівы.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**10. У праграме па беларускай літаратуры звесткі з тэорыі літаратуры:**

а) падаюцца асобна ў рубрыцы “Тэорыя літаратуры” пасля асобных раздзелаў;

б) падаюцца адным блокам у пачатку праграмы;

в) зусім не разглядаюцца;

г) падаюцца адным блокам у канцы праграмы.

**11. Звесткі па тэорыі літаратуры ў сярэдняй школе вучань атрымлівае:**

а) пачынаючы з 5 класа;

б) пачынаючы з 7 класа;

в) пачынаючы з 9 класа;

г) пачынаючы з 10 класа.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Блок XVII “Вывучэнне гісторыі літаратуры”

**1. Сістэматычны курс літаратуры ў старшых класах складаецца:**

а) з манаграфічных тэм;

б) з аглядавых тэм;

в) з манаграфічных і аглядавых тэм;

г) з тэм для пазакласнага чытання.

**2. Для аглядавых тэм характэрна:**

а) вывучэнне жыццёвага і творчага шляху пісьменніка;

б) падрабязны, дэталёвы, тэкстуальны аналіз аднаго мастацкага твора;

в) стварэнне агульнай карціны літаратурнага развіцця;

г) складанне партытуры мастацкага твора.

**3. Да адной з задач вывучэння аглядавых тэм адносіцца:**

а) разгляд жыццёвага і творчага шляху пісьменніка;

б) забеспячэнне навучання сачыненням розных відаў;

в) выпрацоўка навыкаў выразнага чытання;

г) вызначэнне заканамернасцяў літаратурнага развіцця.

**4. Тэма “Шляхі развіцця беларускай літаратуры ў пачатку XX ст.” з’яўляецца:**

а) манаграфічнай;

б) аглядавай;

в) тэмай для самастойнага вывучэння;
г) тэмай для пазакласнага чытання.

**5. Пры вывучэнні аглядавых тэм у старшых класах, акрамя лекцыі настаўніка, мэтазгодна выкарыстоўваць:**
а) каменціраванае чытанне твора;
б) чытанне па ролях;
в) завучванне на памяць;
г) падрыхтоўку вучнёўскіх дакладаў, рэфератаў, паведамленняў.

**7. У якіх класах прадугледжана сістэмнае вывучэнне біяграфій пісьменнікаў у гісторыка-літаратурным кантэксце?**
а) у 1-4 класах;
б) у 5-7 класах;
в) у 8-9 класах;
г) у 10-11 класах.

**8. Якая мэта ставіцца пры вывучэнні жыццёвага і творчага шляху пісьменніка?**
а) зацікавіць асобай творцы;
б) прааналізаваць асобныя творы пісьменніка;
в) завучыць як мага болей фактаў з біяграфіі;
г) завучыць мастацкі твор пісьменніка на памяць.

**9. Якія метады і прыёмы прымяняюцца пры вывучэнні біяграфіі пісьменніка?**
а) складанне партытуры мастацкага твора;
б) інсцэніраванне мастацкага твора пісьменніка;
в) складанне храналагічных табліц жыцця і творчасці пісьменніка;
г) напісанне падрабязнага пераказу тэксту.

**10. У якіх класах вывучаюцца пераважна тэарэтыка-літаратурныя паняцці, звязаныя з гісторыка-літаратурным працэсам?**
а) у 1-4 класах;
б) у 5-7 класах;
в) у 8-9 класах;
г) у 10-11 класах.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Блок XVIII “Вывучэнне эпасу”

**1. Які шлях аналізу эпічных твораў вялікай формы з’яўляецца найменш прадуктыўным?**

а) павобразны;
б) праблемна-тэматычны;
в) “следам за аўтарам”;
г) камбінаваны.

**2. Раман як твор вялікай эпічнай формы вывучаецца:**

а) у 1-4 класах;
б) у 5-6 класах;
в) у 10-11 класах;
г) не вывучаецца.

**3. Асноўнай у аповесці В. Быкава “Сотнікаў” з’яўляецца тэма:**

а) кахання;
б) вайны;
в) экалогіі;
г) навукі і тэхнікі.

**4. Апавяданне І. Пташнікава “Львы” ў 6 класе вывучаецца ў кантэксце:**

а) экалагічнай тэматыкі;
б) патрыятычнай тэматыкі;
в) ваеннай тэматыкі;
г) гістарычнай тэматыкі.

**5. Які шлях вывучэння рамана Ул. Караткевіча “Каласы пад сярпом тваім” выбраў настаўнік, калі ўрокі размеркаваны наступным чынам: *1 урок* Гістарычная аснова рамана “Каласы пад сярпом тваім”. Рэальныя і гістарычныя асобы ў творы – Каліноўскі, Шаўчэнка, Серакоўскі, Манюшка, Дунін-Марцінкевіч. *2 урок* Духоўны воблік галоўнага героя рамана Алеся Загорскага. *3 урок* Прадстаўнікі дваранства ў рамане?**

а) “следам за аўтарам”;
б) павобразны;
в) сюжэтны;
г) праблемна-тэматычны.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**6. Які шлях вывучэння рамана І. Шамякіна “Сэрца на далоні” выбраў настаўнік, калі ўрокі размеркаваны наступным чынам: *1 урок* Тэма вайны і праблема выбару ў рамане. *2 урок* Праблема бацькоў і дзяцей у рамане. *3 урок* Тэма кахання ў рамане?**

а) “следам за аўтарам”;
б) павобразны;
в) сюжэтны;
г) праблемна-тэматычны.

**7. Па праграмным змесце вызначце, пра які твор ідзе гутарка: “Маштабнасць характараў галоўных герояў – Петрака і Сцепаніды. Глыбокі псіхалагізм аповесці. Зварот аўтара да эпізодаў даваеннага жыцця з мэтай больш глыбокага раскрыцця характараў”:**

а) “Сэрца на далоні” І. Шамякіна;
б) “Знак бяды” В. Быкава;
в) “Паром на бурнай рацэ” Ул. Караткевіча;
г) “Курган” Я. Купалы.

**8. У 5 класе пры разглядзе раздзела “Прыгоды і падарожжы” праграма вызначае для чытання і вывучэння:**

а) аповесць М. Лынькова “Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў”;
б) апавяданне М. Лынькова “Васількі”;
в) раман І. Шамякіна “Сэрца на далоні”;
г) аповесць В. Быкава “Сотнікаў”.

**9. Закончыце фразу вядомага рускага метадыста М.А. Рыбнікавай: “Кожны твор павінен быць прачытаны і разабраны адпаведна яго прыродзе <…>. Невялікае апавяданне…”**

а) разбіраецца, калі выбраць найбольш паказальныя часткі;
б) чытаецца і разбіраецца ў поўным аб’ёме;
в) не трэба чытаць і разбіраць;
г) дастаткова проста прачытаць дома і не трэба разбіраць у класе.

**10. Да якога жанру належыць твор Ул. Караткевіча “Нямоглы бацька”, які вывучаецца ў 5 класе?**

а) міф;
б) раман;
в) літаратурная казка;
г) аповесць.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Блок XIX “Вывучэнне лірыкі”

**1. У якім родзе літаратуры рэчаіснасць па-мастацку ўзнаўляецца праз адлюстраванне пачуццяў, настрояў, перажыванняў, эмоцый лірычнага героя?**

а) эпас;

б) драматургія;

в) лірыка;

г) мемуарная літаратура.

**2. У 8 класе пры вывучэнні жанраў лірыкі верш Я. Купалы “Спадчына” разглядаецца ў кантэксце:**

а) інтымнай лірыкі;

б) пейзажнай лірыкі;

в) грамадзянскай лірыкі;

г) не вывучаецца ў школе.

**3. У 8 класе пры вывучэнні жанраў лірыкі верш М. Багдановіча “Цёплы вечар, ціхі вечар, свежы стог…” разглядаецца ў кантэксце:**

а) інтымнай лірыкі;

б) пейзажнай лірыкі;

в) грамадзянскай лірыкі;

г) не вывучаецца ў школе.

**4. У 8 класе пры вывучэнні жанраў лірыкі верш М. Танка “Шчасце” разглядаецца ў кантэксце:**

а) інтымнай лірыкі;

б) пейзажнай лірыкі;

в) філасофскай лірыкі;

г) не вывучаецца ў школе.

**5. Як правіла, вывучэнне лірычнага твора ў 5-7 класах пачынаецца:**

а) з напісання водгуку на лірычны твор;

б) з вызначэння вершаванага памеру і жанравай прыналежнасці лірычнага твора;

в) з выразнага чытання;

г) лірычныя творы ў 5-7 класах не вывучаюцца.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**6. У 5-7 класах лірыка вывучаецца:**

а) у кантэксце манаграфічных тэм з улікам аўтарскай прыналежнасці мастацкіх твораў;

б) толькі на факультатыўных занятках;

в) на ўроках беларускай літаратуры з улікам тэматычнай прыналежнасці;

г) не вывучаецца.

**7. Па праграмным змесце з раздзела "Тэорыя літаратуры" вызначце клас, у якім вывучаецца: "Нацыянальнае і агульначалавечае ў літаратуры (развіццё паняцця). Паняцце аб прыгожым. Форма і змест верша (паглыбленне паняцця)":**

а) 1 клас;

б) 3 клас;

в) 5 клас;

г) 9 клас.

**8. Якая форма работы па вывучэнні лірычнага твора выкарыстоўваецца толькі ў 10-11 класах?**

а) выразнае чытанне;

б) падрыхтоўка супастаўляльнага аналізу творчасці розных паэтаў на падставе розных літаратуразнаўчых крыніц;

в) эўрыстычная гутарка;

г) напісанне сачынення па прачытаным творы.

**9. У якім класе лірыка А. Куляшова вывучаецца ў кантэксце манаграфічнай тэмы?**

а) 4 клас;

б) 6 клас;

в) 7 клас;

г) 10 клас.

**10. Творчасць Алеся Разанава вывучаецца:**

а) у 8 класе ў тэме "Класічныя жанры лірыкі";

б) у 10 класе ў раздзеле "Беларуская літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны";

в) у 10 класе ў раздзеле "Беларуская літаратура пасляваеннага часу (да сярэдзіны 1960-х гадоў);

г) у 11 класе ў раздзеле "Беларуская літаратура на сучасным этапе (з сярэдзіны 1980-х гадоў).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Блок XX “Вывучэнне драматургіі”

**1. Які род літаратуры адлюстроўвае рэчаіснасць непасрэдна праз рэплікі (маналогі, дыялогі, палілогі) і дзеянне персанажаў?**

а) ліра-эпас;

б) лірыка;

в) драматургія;

г) эпас.

**2. Па праграмным змесце вызначце, пра які твор ідзе гутарка: “Выкрыццё царскага чыноўніцтва. Вобраз Кручкова, яго тыповасць. Духоўная абмежаванасць засцянковай шляхты. Праблема бацькоў і дзяцей. Вобраз Куторгі”.**

а) “Паўлінка” Я. Купалы;

б) “Пінская шляхта” В. Дуніна-Марцінкевіча;

в) “Пагарэльцы” А. Макаёнка;

г) “Вечар” А. Дударава.

**3. Па праграмным змесце вызначце, пра які твор ідзе гутарка: “Пошукі маладым пакаленнем рэальных шляхоў вызвалення Бацькаўшчыны. Праўда Сымона і праўда Зоські. Старац як выразнік народнай маралі. Вобраз Незнаёмага ў сістэме дзеючых асоб п’есы”.**

а) “Зацюканы апостал” А. Макаёнка;

б) “Датрымаў характар” А. Гаруна;

в) “Раскіданае гняздо” Я. Купалы;

г) “Кім” А. Дударава.

**4. Спецыфічнай формай работы пры вывучэнні драматургічнага твора ў школе з’яўляецца**

а) эўрыстычная гутарка;

б) складанне “рэжысёрскіх рэмарак”;

в) выразнае чытанне ўрыўка з мастацкага твора;

г) напісанне сачынення па прачытаным творы.

**5. Які шлях вывучэння камедыі Я. Купалы “Паўлінка” выбраў настаўнік, калі ўрокі размеркаваны наступным чынам: *1 урок* Жыццё і побыт засцянковай шляхты. *2 урок* Проціпастаўленне шляхецкай пыхлівасці і народнай кемлівасці. *3 урок* Праблема бацькоў і дзяцей у рамане. 4 урок Адлюстраванне самабытнай беларускай культуры ў п’есе:**

а) “следам за аўтарам”;

б) павобразны;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

в) сюжэтны;

г) праблемна-тэматычны.

**6. Які шлях вывучэння камедыі К. Крапівы “Хто смяецца апошнім” выбраў настаўнік, калі ўрокі размеркаваны наступным чынам: *1 урок* Актуальнасць праблем, узнятых у камедыі. Маштабнасць сатырычных вобразаў Гарлахвацкага і Зёлкіна. *2 урок* Эвалюцыя характару Тулягі. *3 урок* Вобразы – носьбіты аўтарскай пазіцыі: Чарнавус, Левановіч, Вера:**

а) “следам за аўтарам”;

б) павобразны;

в) сюжэтны;

г) праблемна-тэматычны.

**7. Творчасць Сяргея Кавалёва вывучаецца:**

а) у 8 класе ў тэме “Драматычныя жанры”;

б) у 10 класе ў раздзеле “Беларуская літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны”;

в) у 10 класе ў раздзеле “Беларуская літаратура пасляваеннага часу (да сярэдзіны 1960-х гадоў);

г) у 11 класе ў раздзеле “Беларуская літаратура на сучасным этапе (з сярэдзіны 1980-х гадоў).

**8. М.А. Рыбнікава раіла пачынаць аналіз драматургічнага твора:**

а) з напісання сачынення, каб пазней вучні маглі знайсці пацверджанне сваім думкам;

б) з пераказу сюжэта твора, каб праверыць, ці прачытаны твор вучнямі;

в) з вызначэння вобразна-выяўленчых сродкаў, каб затым вучням лягчэй было напісаць сачыненне;

г) з вызначэння канфлікту п’есы, каб затым на ўроку вучні маглі сачыць за яго развіццём.

**9. Пры вывучэнні мастацкіх твораў якога роду мэтазгодна паведаміць пра гісторыю сцэнічнага ўвасаблення?**

а) лірыка;

б) драматургія;

в) эпас;

г) ліра-эпас.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**10. Для якіх твораў характэрным з’яўляецца наяўнасць аўтарскіх рэмарак?**
а) лірычных;
б) драматургічных;
в) эпічных;
г) ліра-эпічных.

**Блок XXI “Вывучэнне вуснай народнай творчасці”**

**1. Творы вуснай народнай творчасці характарызуюцца:**
а) пісьмовай формай існавання;
б) варыятыўнасцю, бо створаны калектыўным аўтарам (народам);
в) тым, што створаны канкрэтным аўтарам;
г) тым, што можна вызначыць канкрэтную дату напісання.

**2. З творамі вуснай народнай творчасці ў сярэдняй школе вучні пачынаюць знаёміцца:**
а) з 5 класа;
б) з 6 класа;
в) з 8 класа;
г) з 9 класа.

**3. Пры аналізе народных казак пра жывёл у 5 класе асноўную ўвагу вучняў трэба звярнуць на:**
а) увасабленне праз канфлікты рэальных жыццёвых сітуацый;
б) жыццё жывёл у рэальных умовах;
в) ускладненасць кампазіцыі;
г) фантастычных персанажаў.

**4. Назіранні над выяўленчымі сродкамі мовы пры вывучэнні народных казак дапамогуць вучням:**
а) навучыцца лічыць;
б) засвоіць ідэйны змест твора;
в) задаваць пытанні;
г) засвоіць паняцце пра аўтарскі стыль.

**5. Легенда як жанр вуснай народнай творчасці вызначаецца:**
а) пісьмовай формай існавання;
б) нявызначанасцю месца і часу дзеяння;
в) гістарычнай і геаграфічнай канкрэтнасцю апісваемага;
г) тыпізаванасцю персанажаў.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**6. Пры засваенні праграммы сярэдняй адукацыі вывучаюцца казкі:**

а) толькі народныя;

б) народныя і літаратурныя;

в) толькі літаратурныя;

г) не вывучаюцца.

**7. Пра які цыкл народных песень ідзе гутарка ў вучэбнай праграме: "Сувязь <…> з асноўнымі этапамі жыццёвага шляху чалавека – нараджэннем, шлюбам і смерцю. Мэта песень – абараніць чалавека ад усяго злога і шкоднага, спрыяць шчасліваму жыццю":**

а) пазаабрадавая;

б) каляндарна-абрадавая;

в) сямейна-абрадавая;

г) гутарка не ідзе пра які-небудзь цыкл народных песень.

**8. Пра які цыкл народных песень ідзе гутарка ў вучэбнай праграме: "Увасабленне <…> мар і спадзяванняў народа, паэтызацыя яго побыту. Выяўленне поглядаў на свет, прыроду і чалавека, міфалагічныя матывы <…>. Еднасць чалавека і прыроды":**

а) пазаабрадавая;

б) каляндарна-абрадавая;

в) сямейна-абрадавая;

г) гутарка не ідзе пра які-небудзь цыкл народных песень.

**9. Міф як твор вуснай народнай творчасці вызначаецца:**

а) тым, што расказвае пра багоў і герояў;

б) тым, што расказвае пра звычайных людзей;

в) мае канкрэтнага аўтара;

г) існуе выключна ў пісьмовай форме.

**10. Вывучэнне тэмы "Загадкі" ў 5 класе мэтазгодна пачаць:**

а) з напісання сачынення па загадцы;

б) з параўнання загадак розных народаў на падставе розных навуковых крыніц;

в) з аднаўлення ў памяці вядомых вучням твораў;

г) з напісання рэцэнзіі на прачытаны твор.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Блок XXII “Сістэма арганізацыйных мер, накіраваных на дзейнасць настаўніка беларускай літаратуры па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі ”**

**1. Колькі сшыткаў для навучальных работ неабходна мець вучням па вучэбным прадмеце “Беларуская літаратура”?**

а) 1;

б) 2;

в) 3;

г) 4.

**2. Ці патрэбны асобны сшытак для кантрольных работ па беларускай літаратуры ў IX-XI класах?**

а) патрэбны;

б) неабавязковы, кантрольныя работы дапускаецца выконваць у сшытках для навучальных работ;

б) неабавязковы, кантрольныя работы выконваюцца ў сшытках для навучальных работ;

в) не патрэбны, кантрольныя работы па беларускай літаратуры ў IX–XI класах не выконваюцца.

**3. Колькі лінеек трэба прапускаць паміж заключным радком тэксту навучальнай або кантрольнай работы і датай наступнай навучальнай або кантрольнай работы?**

а) 1;

б) 2;

г) кожную работу трэба пачынаць з новай старонкі;

д) дата наступнай работы ставіцца адразу пасля адзнакі настаўніка без пропуску лінеек.

**4. Наколькі часта павінны правярацца сшыткі па вучэбным прадмеце “Беларуская літаратура”, у якіх выконваюцца *навучальныя работы*?**

а) у 5-7 класах правяраюцца выбарачна, але не менш чым адзін раз на тыдзень ва ўсіх вучнў; у 8-11 класах – не менш чым адзін раз на два тыдні;

б) ва ўсіх класах выбарачна, аднак сшытак кожнага вучня павінен правярацца не менш за адзін раз на месяц;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

в) у 5-7 класах правяраюцца ў кожнага вучня адзін раз у тыдзень, у 8-11 класах правяраюцца выбарачна, але не менш чым адзін раз у месяц ва ўсіх вучнў;

г) ва ўсіх класах правяраюцца ў кожнага вучня пасля кожнага ўрока.

**5. *Кантрольныя класныя сачыненні* па беларускай літаратуры правяраюцца і вяртаюцца вучням:**

а) да наступнага ўрока;

б) не пазней чым праз тыдзень;

в) не пазней чым праз тыдзень у 5-8 класах і не пазней 10 дзён у 9-11 класах;

г) да наступнага ўрока ў 5-8 класах і не пазней чым праз тыдзень у 9-11 класах.

**6. Работа над памылкамі, якая выконваецца вучнямі пасля кантрольных работ па беларускай літаратуры, праводзіцца:**

а) толькі ў класе;

б) толькі дома;

в) у класе або дома (на выбар настаўніка);

г) работа над памылкамі пасля кантрольных работ можа не выконвацца (па меркаванні настаўніка).

**7. У навучальных і кантрольных сачыненнях памылкі на правілы, якія яшчэ не вывучаліся, настаўнік:**

а) падкрэслівае, выпраўляе і адзначае на палях;

б) падкрэслівае, выпраўляе, але на палях не адзначае;

в) не падкрэслівае і не выпраўляе;

г) не звяртае на такія памылкі ўвагу.

**8. Умоўным знакам “I” на палях настаўнік адзначае:**

а) граматычныя памылкі;

б) пунктуацыйныя памылкі;

в) арфаграфічныя памылкі;

г) маўленчыя памылкі.

**9. Умоўным знакам “V” на палях настаўнік адзначае:**

а) граматычныя памылкі;

б) пунктуацыйныя памылкі;

в) арфаграфічныя памылкі;

г) маўленчыя памылкі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**10. Умоўным знакам “Г” на палях настаўнік адзначае:**
а) граматычныя памылкі;
б) пунктуацыйныя памылкі;
в) арфаграфічныя памылкі;
г) маўленчыя памылкі.

**11. Умоўным знакам “М” на палях настаўнік адзначае:**
а) граматычныя памылкі;
б) пунктуацыйныя памылкі;
в) арфаграфічныя памылкі;
г) маўленчыя памылкі.

**12. Умоўным знакам “З” на палях настаўнік адзначае:**
а) граматычныя памылкі;
б) пункуацыйныя памылкі;
в) памылкі ў змесце;
г) маўленчыя памылкі.

**13. З якога класа вучні пачынаюць пісаць *абавязковыя кантрольныя сачыненні* па беларускай літаратруры?**
а) з 5 класа;
б) з 7 класа;
в) з 9 класа;
г) з 10 класа.

**14. Колькі адзнак выстаўляецца за сачыненне па літаратуры?**
а) дзве адзнакі: першая – за змест, другая – за пісьменнасць;
б) адна адзнака – за змест;
в) адна адзнака – за пісьменнасць;
г) дзве адзнакі: першая – за пісьменнасць, другая – за змест.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Блок XXIII “Планаванне працы настаўніка літаратуры ”

**1. Планаванне настаўніцкай працы накіравана:**
а) на захаванне прынцыпу паслядоўнасці ў вучэбным працэсе;
б) на захаванне прынцыпу гістарызму ў вучэбным працэсе;
в) на захаванне прынцыпу вывучэння мастацкага твора ў адзінстве формы і зместу;
г) на захаванне прынцыпу навуковасці ў вучэбным працэсе.

**2. Як называецца план, які ўяўляе сабой пералік праграмных тэм, размеркаваных <u>па тыднях навучальнага года</u>?**

а) каляндарны;

б) тэматычны;

в) каляндарна-тэматычны;

г) бягучы.

**3. Як называецца план, які прадугледжвае размеркаванне гадзін на вывучэнне канкрэтных пытанняў <u>пэўнай тэмы</u>?**

а) каляндарны;

б) тэматычны;

в) каляндарна-тэматычны;

г) бягучы.

**4. Як называецца план, які ўяўляе сабой пералік праграмных тэм, размеркаваных па <u>тыднях навучальнага года</u> з размеркаванне гадзін на вывучэнне канкрэтных пытанняў <u>пэўнай тэмы</u>?**

а) каляндарны;

б) тэматычны;

в) каляндарна-тэматычны;

г) бягучы.

**5. Як называецца самая сціслая форма бягучага планавання, у якой фіксуецца фабула ўсяго ўрока?**

а) канспект урока;

б) план урока;

в) план-канспект урока;

г) тэхналагічная карта ўрока.

**6. Як называецца падрабязны рабочы план, у якім падаецца не проста ход урока, а яго дэталёвае апісанне, своеасаблівы сцэнарый з давядзеннем усіх пытанняў і заданняў да класа ці асобнага вучня, а таксама прыкладнымі адказамі на іх?**

а) канспект урока;

б) план урока;

в) план-канспект урока;

г) тэхналагічная карта ўрока.

**7. У чым заключаецца адрозненне плана-канспекта ўрока ад канспекта ўрока?**

а) у плане канспекце не акрэсліваюцца мэты ўрока;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

б) у плане-канспекце настаўнік не прыводзіць прыкладныя, мяркуемыя адказы вучня;

в) у плане-канспекце не вызначаецца структура ўрока, паслядоўнасць яго элементаў;

г) у плане-канспекце тэзісна не занатоўваюцца асноўныя пытанні да вучняў і асноўныя моманты слова настаўніка.

## Блок XXIV "Чытацкія асаблівасці вучняў у залежнасці ад узросту"

**1. Узроставая група <u>малодшага падлеткавага</u> ўзросту адпавядае:**

а) 8-9 гадам;
б) 10-12 гадам;
в) 13-15 гадам;
г) 16-17 гадам.

**2. Узроставая група <u>старшага падлеткавага</u> ўзросту адпавядае:**

а) 8-9 гадам;
б) 10-12 гадам;
в) 13-15 гадам;
г) 16-17 гадам.

**3. Узроставая група <u>старшага школьнага</u> ўзросту (юнацтва) адпавядае:**

а) 10-12 гадам;
б) 13-15 гадам;
в) 16-17 гадам;
г) 18-19 гадам.

**4. Вучні якой узроставай групы цікавяцца адлюстраваннем у літаратуры подзвігаў, прыгод, моцных валявых людзей?**

а) малодшага падлеткавага ўзросту (10-12 гадоў);
б) старшага падлеткавага ўзросту (13-15 гадоў);
в) старшага школьнага ўзросту (16-17 гадоў);
г) позняга юнацтва (18-21 гадоў).

**5. Для вучняў якой узроставай групы характэрна зацікаўленасць складанымі пачуццямі, перажываннямі герояў, імкненне даць ацэнку падзеям, праблемам, узнятым у творы?**

а) малодшага падлеткавага ўзросту (10-12 гадоў);
б) старшага падлеткавага ўзросту (13-15 гадоў);

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

в) старшага школьнага ўзросту (16-17 гадоў);

г) позняга юнацтва (18-21 гадоў).

**6. Для вучняў якой узроставай групы характэрна імкненне пазнаць свет і сваё месца ў ім, заявіць аб сабе як асобе?**

а) малодшага падлеткавага ўзросту (10-12 гадоў);

б) старэйшага падлеткавага ўзросту (13-15 гадоў);

в) старэйшага школьнага ўзросту (16-17 гадоў);

г) позняе юнацтва (18-21 гадоў).

**7. Вучні старшага школьнага ўзросту (ранняе юнацтва 16-17 гадоў) адрозніваюцца:**

а) уменнем скіроўваць ўвагу на светапогляд, перакананні, самаацэнкі герояў, аналітычна прачытаць мастацкі твор;

б) максімалізмам у ацэнках герояў, іх учынкаў;

в) просталінейнай ацэнкай падзей і герояў, наіўным рэалізмам ва ўспрыманні твораў;

г) абвостранай назіральнасцю, шчырасцю, уменнем эмацыйна перажываць.

## Блок XXV “Тэсты па беларускай літаратуры: віды, методыка правядзення”

**1. У тэставых заданнях якога тыпу гатовыя адказы не даюцца, іх неабходна сфармуляваць самастойна?**

а) заданні закрытага тыпу;

б) заданні адкрытага тыпу;

в) заданні на ўстанаўленне адпаведнасці;

г) заданні на ўстанаўленне правільнай паслядоўнасці.

**2. Што такое педагагічны тэст?**

а) сукупнасць тэставых заданняў, па выніках якіх вызначаецца ўзровень падрыхтаванасці вучняў па вучэбным прадмеце;

б) кароткі, строга стандартызаваны іспыт, які дазваляе колькасна вызначыць вынік;

в) найважнейшы сродак развіцця мовы вучняў, іх мыслення;

г) пералік пытанняў і прыкладныя варыянты адказаў на іх.

**3. Да якога віду адносяцца тэставыя заданні, у якіх вучань выбірае правільны адказ з прапанаванага набору адказаў?**

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

а) заданні адкрытага тыпу;
б) заданні на ўстанаўленне адпаведнасці;
в) заданні на ўстанаўленне правільнай паслядоўнасці;
г) заданні закрытага тыпу.

**4. Да якога віду адносяцца тэставыя заданні, якія патрабуюць ад вучня самастойна сфармуляваць адказ?**
а) заданні на ўстанаўленне адпаведнасці;
б) заданні на ўстанаўленне правільнай паслядоўнасці;
в) заданні адкрытага тыпу;
г) заданні закрытага тыпу.

**5. Да якога віду адносяцца тэставыя заданні, выкананне якіх звязана з выяўленнем адпаведнасці паміж элементамі дзвюх груп?**
а) заданні на ўстанаўленне адпаведнасці;
б) заданні на ўстанаўленне правільнай паслядоўнасці;
в) заданні адкрытага тыпу;
г) заданні закрытага тыпу.

**6. Да якога віду адносяцца тэставыя заданні, у якіх вучань павінен адзначыць правільны парадак дзеянняў або працэсаў?**
а) заданні на ўстанаўленне адпаведнасці;
б) заданні на ўстанаўленне правільнай паслядоўнасці;
в) заданні адкрытага тыпу;
г) заданні закрытага тыпу.

**7. Як называюцца <u>падобныя да праўдзівых</u> адказы ў тэставых заданнях закрытага тыпу:**
а) варыянты;
б) прыклады;
в) дыстрактары;
г) падказкі.

**8. Як называецца частка тэставага задання, якая змяшчае прапановы выканаць якія-небудзь канкрэтныя дзеянні – выбраць правільны адказ з шэрагу прапанаваных, устанавіць адпаведнасць або правільную паслядоўнасць, назваць тэрмін і г.д.?**
а) канстатуючая частка;
б) працэдурная частка;
в) рэгулюючая частка;
г) падагульняльная частка.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**9. Як называецца частка тэставага задання, якая апісвае сітуацыю і не патрабуе ад вучня якіх-небудзь актыўных дзеянняў?**

а) канстатуючая частка;

б) працэдурная частка;

в) рэгулюючая частка;

г) падагульняльная частка.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Правільныя адказы

| Блок I | |
|---|---|
| 1 | б |
| 2 | б |
| 3 | в |
| 4 | в |
| 5 | б |
| 6 | б |
| 7 | а |
| 8 | а |
| 9 | б |

| Блок II | |
|---|---|
| 1 | а |
| 2 | г |
| 3 | а |
| 4 | в |
| 5 | в |

| Блок III | |
|---|---|
| 1 | а |
| 2 | в |
| 3 | г |
| 4 | в |
| 5 | а |
| 6 | в |

| Блок IV | |
|---|---|
| 1 | г |
| 2 | в |
| 3 | б |
| 4 | г |

| Блок V | |
|---|---|
| 1 | б |
| 2 | в |
| 3 | в |
| 4 | б |
| 5 | в |
| 6 | а |
| 7 | а |
| 8 | а |
| 9 | в |
| 10 | а |

| Блок VI | |
|---|---|
| 1 | б |
| 2 | в |
| 3 | в |
| 4 | б |
| 5 | б |
| 6 | а |
| 7 | б |
| 8 | г |
| 9 | а |

| Блок VII | |
|---|---|
| 1 | а |
| 2 | а |
| 3 | а |
| 4 | б |

| Блок VIII | |
|---|---|
| 1 | б |
| 2 | б |
| 3 | б |
| 4 | а |

| Блок IX | |
|---|---|
| 1 | б |
| 2 | б |
| 3 | в |
| 4 | а |

| Блок X | |
|---|---|
| 1 | в |
| 2 | в |
| 3 | в |
| 4 | в |

| Блок XI | |
|---|---|
| 1 | г |
| 2 | г |
| 3 | г |
| 4 | г |

| Блок XII | |
|---|---|
| 1 | в |
| 2 | в |
| 3 | а |
| 4 | а |
| 5 | г |
| 6 | а |
| 7 | г |
| 8 | в |
| 9 | г |
| 10 | а |

| Блок XIII | |
|---|---|
| 1 | б |
| 2 | а |
| 3 | в |
| 4 | в |
| 5 | а |
| 6 | в |
| 7 | б |
| 8 | г |
| 9 | г |
| 10 | а |

| Блок XIV | |
|---|---|
| 1 | г |
| 2 | г |
| 3 | г |
| 4 | г |
| 5 | б |
| 6 | в |
| 7 | б |
| 8 | в |
| 9 | а |
| 10 | в |

| Блок XV | |
|---|---|
| 1 | в |
| 2 | а |
| 3 | а |
| 4 | б |
| 5 | в |
| 6 | а |
| 7 | б |
| 8 | б |
| 9 | б |
| 10 | а |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

| Блок XVI | |
|---|---|
| 1 | б |
| 2 | г |
| 3 | б |
| 4 | в |
| 5 | а |
| 6 | в |
| 7 | б |
| 8 | а |
| 9 | в |
| 10 | а |
| 11 | а |

| Блок XVII | |
|---|---|
| 1 | в |
| 2 | в |
| 3 | г |
| 4 | б |
| 5 | г |
| 6 | г |
| 7 | а |
| 8 | в |

| Блок XVIII | |
|---|---|
| 1 | в |
| 2 | в |
| 3 | б |
| 4 | а |
| 5 | б |
| 6 | г |
| 7 | б |
| 8 | а |
| 9 | б |
| 10 | б |

| Блок XIX | |
|---|---|
| 1 | в |
| 2 | в |
| 3 | б |
| 4 | в |
| 5 | в |
| 6 | в |
| 7 | г |
| 8 | б |
| 9 | г |
| 10 | г |

| Блок XX | |
|---|---|
| 1 | в |
| 2 | б |
| 3 | в |
| 4 | б |
| 5 | г |
| 6 | б |
| 7 | г |
| 8 | г |
| 9 | б |
| 10 | б |

| Блок XXI | |
|---|---|
| 1 | б |
| 2 | а |
| 3 | а |
| 4 | б |
| 5 | в |
| 6 | б |
| 7 | в |
| 8 | б |
| 9 | а |
| 10 | в |

| Блок XXII | |
|---|---|
| 1 | а |
| 2 | а |
| 3 | б |
| 4 | б |
| 5 | в |
| 6 | а |
| 7 | б |
| 8 | в |
| 9 | б |
| 10 | а |
| 11 | г |
| 12 | в |
| 13 | в |
| 14 | а |

| Блок XXIII | |
|---|---|
| 1 | а |
| 2 | а |
| 3 | б |
| 4 | в |
| 5 | б |
| 6 | а |
| 7 | б |

| Блок XXIV | |
|---|---|
| 1 | б |
| 2 | в |
| 3 | в |
| 4 | а |
| 5 | б |
| 6 | в |
| 7 | а |

| Блок XXV | |
|---|---|
| 1 | б |
| 2 | а |
| 3 | г |
| 4 | в |
| 5 | а |
| 6 | б |
| 7 | в |
| 8 | б |
| 9 | а |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# *Кароткі слоўнік тэрмінаў і паняццяў*

**Абагульненне** – адна з характарыстык пазнавальнага працэсу, сутнасць якой заключаецца ў вылучэнні і фіксацыі істотных, адносна ўстойлівых уласцівасцяў прадметаў і адносін гэтых уласцівасцяў. А. дазваляе ўніфікаваць і атаясамліваць мноства розных прадметаў і падзей.

**Абстракцыя** – адна з асноўных аперацый мыслення, з дапамогай якой у працэсе пазнання вылучаюцца істотныя ўласцівасці, заканамернасці ад неістотных. Вынікам гэтай аперацыі з’яўляецца абстрагаванне.

**Агляд** – сістэматызаваныя звесткі і навуковыя абагульненні пра стан прадмета гутаркі (даследавання) і тэндэнцыі пэўнай з’явы. А. уключае ў сябе апісанне, аналіз, ацэнку, абагульненне. Аглядавыя тэмы, якія выкарыстоўваюцца на ўроках літаратуры на II і III ступенях сярэдняй адукацыі, уключаюць у сябе кароткі аналіз асобных мастацкіх тэкстаў, звесткі пра развіццё культуры, літаратурнай крытыкі на пэўным этапе, інфармацыю пра асобных пісьменнікаў.

**Агульнаадукацыйныя мэты навучання** – гэта мэты навучання, якія прадугледжваюць развіццё асобы, якая з’яўляецца аб’ектам навучання. У працэсе вывучэння беларускай літаратуры А.м.н. дасягаюцца праз засваенне канкрэтных ведаў пра этапы развіцця літаратуры, звестак з біяграфій пісьменнікаў і інш.

**Адаптаваны тэкст** – спрошчаны тэкст, скарэктаваны з улікам узросту чытача, яго разумовага ўзроўню і ўзроўню ведання мовы.

***Адукацыйная праграма** – стратэгія адпаведнага тыпу адукацыі, падмацаваная сукупнасцю дакументацыі, якая рэгламентуе адукацыйны працэс, і ўмовы, неабходныя для атрымання адукацыі ў адпаведнасці з чакаемымі вынікамі пэўнага ўзроўню асноўнай адукацыі або пэўнага віду дадатковай адукацыі.

***Адукацыйны працэс** – навучанне і выхаванне, якія арганізуюцца ўстановай адукацыі (арганізацыяй, што рэалізуе адукацыйныя праграмы пасляінстытуцкай адукацыі, іншай арганізацыяй, якой у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць, індывідуальным прадпрымальнікам, якому ў адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць) з мэтай засваення навучэнцамі зместу адукацыйных праграм.

***Адукацыйны стандарт** – нарматыўны прававы дакумент, які вызначае змест адукацыйнай праграмы праз устанаўленне патрабаванняў да адукацыйнага працэсу і абавязковых мяркуемых пазітыўных вынікаў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

засваення зместу вучэбнага матэрыялу ў кантэксце адпаведных вучэбных дысцыплін.

**Актывізацыя вучэбнай дзейнасці** – удасканаленне метадаў і форм навучання ў агульнаадукацыйным працэсе з мэтай павышэння яго эфектыўнасці.

**Алгарытм** – набор правіл, які дазваляе механічна вырашаць шэраг задач сярод аднатыпных. У методыцы – інструкцыя, якая прадугледжвае паслядоўнасць дзеянняў навучэнца або настаўніка ў працэсе вырашэння пэўных задач.

**Аналіз** – метад навуковага даследавання (пазнання) з'яў праз вылучэнне частак сістэмы.

**Аналітычнае чытанне** – крытычнае вывучэнне зместу твора з мэтай яго глыбокага асэнсавання, якое суправаджаецца выпіскай фактаў, цытат, складаннем тэзісаў, рэфератаў і інш.

**Анатацыя** – кароткая даведка пра апублікаваны тэкст. Як правіла, А. уключае ў сябе бібліяграфічныя звесткі, асноўную ідэю і прызначэнне анатуемага тэксту.

**Анкетаванне** (па беларускай літаратуры) – пісьмовая форма апытвання, якая ажыццяўляецца з мэтай выяўлення начытанасці навучэнцаў, першаснага ўспрымання мастацкага твора і інш.

**Аперцэпцыя** – адна з уласцівасцяў псіхікі чалавека, якая выражаецца ў залежнасці ўспрыняцця асобай аб'екта ці з'явы ад запасу набытага гэтай асобай вопыту, ведаў, перакананняў, светапогляду, эмацыйнага стану. А. неабходна ўлічваць пры ўстанаўленні сувязі ўжо вядомага і новага вучэбнага матэрыялу ў працэсе вывучэння тэарэтычных паняццяў, аналізу мастацкага твора.

**Апісанне** – адзін з жанраў школьнага сачынення. Можа быць навуковым, дзелавым і мастацкім. Праца над апісаннем развівае назіральнасць навучэнцаў, а таксама іх мову.

**Апрабацыя** – праверка на практыцы тэарэтычных высноў, гіпотэз.

**Апытванне** – адзін з асноўных відаў праверкі і ўліку ведаў навучэнцаў, асновай якога з'яўляецца сфармуляванае пытанне. Па форме можа быць вуснае і пісьмовае. Вылучаюцца тры віды апытвання: індывідуальнае, франтальнае, камбінаванае.

**Асацыяцыя** – узаемасувязь некалькіх псіхічных працэсаў (адчуванняў, уяўленняў, пачуццяў і інш.), якая выражаецца ў тым, што з'яўленне аднаго з іх выклікае з'яўленне другога (другіх) псіхічнага працэсу. А. садзейнічае працэсу запамінання.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Аспект** – пункт погляду, які ляжыць у аснове разгляду перспектывы, з'явы, паняцця.

**Аўтаматызацыя дзеянняў** – выкананне асобных дзеянняў без рацыянальна спланаванага іх рэгулявання.

**Аўтаматызм** – дзеянні, што рэалізуюцца на падставе сфарміраваных раней навыкаў як механічныя ў пэўнай іх паслядоўнасці.

**Базавы слоўнікавы запас** – сукупнасць слоў і словазлучэнняў, на аснове якой грунтуецца актыўнае авалоданне вуснай і пісьмовай мовай.

**Веды** – важнейшы элемент зместу навучання; прадукт матэрыяльнай, духоўнай і грамадскай дзейнасці людзей. В. па беларускай літаратуры ўключаюць у сябе засвоены навучэнцамі матэрыял пра спецыфічныя асаблівасці літаратуры як віду мастацтва, тэарэтычныя і гістарычныя паняцці, якія ўключаны ў вучэбную праграму, асноўныя звесткі пра жыццё і творчасць пісьменнікаў, дзейнасць якіх вывучаецца, змест, жанравыя асаблівасці, ідэйную скіраванасць, стылёвыя асаблівасці вывучаемых мастацкіх твораў, асноўныя этапы развіцця нацыянальнай літаратуры, асноўныя тыпы мастацкай творчасці, змест вылучаных вучэбнай праграмай твораў на памяць.

**Вербалізацыя** – рэалізацыя пры дапамозе слоў, адпаведных іх словазлучэнняў уласных думак, пачуццяў, перажыванняў, паводзін.

**Віктарына літаратурная** – пазнавальная гульня, у аснове якой – адказы на пытанні, звязаныя з літаратурай, біяграфіяй пісьменнікаў і г.д.

**Водгук** – від школьнага сачынення, якое мае на мэце падзяліцца ўражаннямі пра прачытанае, пачутае, убачанае. В. уяўляе сабой разгорнутае выказванне эмацыйна-ацэначнага характару пра твор мастацтва.

**Вопыт педагагічны** – вынік сістэмнага назапашвання ведаў, практычных навыкаў педагогам, установай адукацыі; ён спрыяе паспяховаму вырашэнню педагагічных задач; назапашванню яго спрыяе педагагічная рэфлексія. В.п. можа быць гістарычным, масавым, перадавым.

***Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце** – прававы дакумент, які вызначае мэты і задачы вывучэння вучэбнага прадмета, яго змест, колькасць гадзін, адведзеных на вывучэнне асобных тэм, асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, рэкамендуемыя формы і метады навучання і выхавання.

**Вучэбны дапаможнік** – вучэбнае выданне, якое дапаўняе або часткова (поўнасцю) замяняе падручнік.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Выбарачнае чытанне** – чытанне, якое прадугледжвае пэўны адбор матэрыялу з мэтай далейшага яго паглыбленага вывучэння.

**Вывучэнне біяграфіі** – знаёмства навучэнцаў з фактамі жыцця і творчасці пісьменнікаў, творы якіх вывучаюцца. Задача В.б. – сфарміраваць у навучэнцаў цэласнае ўяўленне пра асобу пісьменніка, яе развіццё, грамадскія ўмовы, у якіх адбываўся працэс творчасці; пра яе вынікі на літаратурны працэс.

**Выразнае чытанне (дэкламацыя)** – адзін са спосабаў узнаўлення мастацкага твора пры дапамозе голасу з мэтай акцэнтавання вобразаў, эмоцый твора пры дапамозе адпаведных паўз, лагічных націскаў і інш. Да В.ч. настаўнік звяртаецца на ўсіх этапах разгляду мастацкага твора, каб наглядна паказаць асноўныя сродкі выразнасці, характарыстыкі герояў і г.д.

**Выхаваўчыя мэты навучання** – мэты дзейнасці настаўніка, якія прадугледжваюць фарміраванне ў навучэнцаў сістэмы маральна-этычных каштоўнасцяў, ацэначна-эмацыйных адносін да свету. У працэсе вывучэння беларускай літаратуры дасягненню гэтых мэтаў садзейнічаюць урочная і пазакласная работа, змест вучэбнага матэрыялу, каментарыі настаўніка і інш.

**Геданізм** – 1) напрамак у этыцы, які прызнае асалоду найвышэйшай выгадай жыцця; 2) этычная ўстаноўка асобы, у адпаведнасці з якой дзейнасць чалавека павінна арыентавацца на дасягненне асалоды як найвышэйшай мэты жыцця.

**Гуманізацыя** – распаўсюджванне і сцвярджэнне гуманістычных прынцыпаў, ідэй у грамадстве, скіраваных на культурнае і маральнае развіццё чалавека.

**Гутарка** – адзін з метадаў атрымання інфармацыі на аснове вербальнай камунікацыі; метад навучання ў форме дыялога. Г. можа быць рэпрадуктыўнай (разлічана на аднаўленне ведаў, набытых вучнямі) і эўрыстычнай (дапамагае навучэнцам рабіць назіранні над тэкстам і рабіць пэўныя высновы).

**Даклад** – падрыхтаванае паведамленне (у вуснай ці пісьмовай форме) на якую-небудзь тэму.

**Дамашняе заданне** – заданне, якое выконваецца навучэнцам пасля ўрокаў. Мэтай Д.з. з'яўляецца больш глыбокае засваенне вывучанага на ўроку альбо самастойнае засваенне новага матэрыялу. Д.з. павінна складацца настаўнікам з улікам рэальных узроставых (псіхафізіялагічных) магчымасцяў выканання гэтых заданняў навучэнцамі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Дзесяцібальная сістэма** – сістэма ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, якая заключаецца ў вызначэнні ўзроўню засваення навучэнцам вучэбнага матэрыялу. Вылучаецца пяць узроўняў: нізкі, здавальняльны, сярэдні, дастатковы і высокі. (Асаблівасці ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па беларускай літаратуры прадстаўлены ў Дадатку 1).

**Дыдактыка** – галіна педагагічнай навукі, якая даследуе праблемы навучання і змест адукацыі. Задача Д. – навуковае абгрунтаванне практыкі навучання.

**Дыдактычныя сродкі** – сродкі, з дапамогай якіх рэалізуюцца мэты навучання. Д.с. могуць быць матэрыяльнымі (табліцы, партрэты пісьменнікаў, аудыя- і відэязапісы і інш.) і нематэрыяльнымі (метады, прыёмы навучання, формы арганізацыі адукацыйнага працэсу).

**Дыскусія** – метад навучання, заснаваны на абмеркаванні спрэчнага пытання, розных пунктаў погляду.

**Дыспут** – метад навучання, заснаваны на калектыўным (у форме карэктнай спрэчкі) абмеркаванні якіх-небудзь актуальных праблем, пытанняў, якія могуць выклікаць процілеглыя адказы.

**Дэбаты** – адна з форм дыскусіі, абмен думкамі; спрэчкі.

**Дэдукцыя** – спосаб разважання, пры якім ажыццяўляецца пераход ад агульных ведаў да прыватных.

**Дэманстрацыя** – нагляднае тлумачэнне новага вучэбнага матэрыялу (паказ фільмаў, прэзентацыі і інш.).

**Заключныя заняткі** – фінальны этап вывучэння мастацкага твора і творчасці пісьменніка. З.з. скіраваны на абагульненне атрыманых ведаў, паглыбленне разумення аўтарскай грамадзянскай і мастацкай пазіцыі, месца твора ў гісторыі нацыянальнай і сусветнай літаратуры і г.д. Працягласць З.з. рэгламентуецца ўзростам навучэнцаў, памерам і складанасцю вучэбнага матэрыялу, часам на яго вывучэнне, адведзеным праграмай. Часавая працягласць – ад некалькіх хвілін (кароткія, тэзісныя абагульненні і вывады па творчасці пісьменніка) да цэлага ўрока (разгорнутыя абагульненні і вывады па творчасці пісьменніка, якія могуць мець розную форму іх рэпрэзентацыі).

**Замацаванне** – прыём навучання, які мае на мэце сістэмнае паўтарэнне вывучанага матэрыялу і больш глыбокае асэнсаванне раней засвоеных ведаў з мэтай іх далейшага выкарыстання.

**Здольнасці** – індывідуальна-псіхалагічныя якасці асобы, якія абумоўліваюць паспяховае вырашэнне тых або іншых задач. У працэсе

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А.Кулешова

вывучэння беларускай літаратуры ўзровень развіцця З. залежыць ад узроўню развіцця мовы, памяці, ступені вербальнага мыслення, крэатыўнасці. Развіццё З. абумоўлена наяўнасцю матывацыі.

**Індукцыя** – спосаб разважання, пры якім ажыццяўляецца пераход ад прыватных ведаў да агульных высноў, абагульненняў.

**Індывідуальны падыход** – адзін з прынцыпаў педагагічнай навукі, які прадугледжвае ўлік індывідуальных асаблівасцяў канкрэтнага навучэнца ў працэсе педагагічнага ўздзеяння.

**Інсцэніраванне** – наданне мастацкаму твору сцэнічнай формы. І. стымулюе пазнавальную дзейнасць вучняў, дазваляе глыбей асэнсаваць ідэйную скіраванасць мастацкага твора.

**Інтэрпрэтацыя** – тлумачэнне сутнасці, сэнсу пэўнага аб'екта, з'явы з выкарыстаннем не толькі паказчыкаў, якія ўтрымлівае прадмет гутаркі, а і інфармацыі з іншых галін ведаў (гісторыя, філасофія, грамадазнаўства, сацыялогія і інш.), у поле якіх непасрэдна не ўваходзіць прадмет ці з'ява інтэрпрэтацыі.

**Калёквіум** – форма праверкі і замацавання ведаў навучэнцаў у выглядзе гутаркі (міні-экзамен) настаўніка з навучэнцам па зараней аб'яўленых пытаннях па адной ці некалькіх тэмах.

**Каментарый** – заўвагі, меркаванні, гіпотэзы, дакументальныя сведчанні адносна канкрэтных прадметаў, з'яў, падзей, твораў і інш.

**Каменціраванае чытанне** – від чытання, які прадугледжвае ў працэсе чытання мастацкага твора на занятках крытычныя заўвагі, тлумачэнні, каментарыі настаўніка.

**Кампетэнцыя** – веды, уменні і вопыт, неабходныя для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

**Канспект** – вынік сціслай пісьмовай фіксацыі лекцыі, артыкула, даклада і інш.

**Кансультацыя** – адзін з відаў вучэбных заняткаў, у аснове якіх ляжыць гутарка настаўніка з навучэнцамі для пашырэння і паглыблення іх ведаў. К. можа мець наступныя формы: а) рэкамендацыі настаўніка па засваенні і характарыстыцы адпаведных пытанняў, б) адказы настаўніка на тыя пытанні навучэнцаў, якія выклікалі ў іх цяжкасці пры падрыхтоўцы да заняткаў, калёквіуму, заліку, экзамену і інш.

**Катарсіс** – моцнае душэўнае ўзрушэнне, выклікана не рэальнымі падзеямі рэчаіснасці, а іх сімвалічным адлюстраваннем, напрыклад, у мастацкім творы.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Краязнаўства** – сукупнасць ведаў пра пэўны край. Літаратурнае К. адносіцца да галіновага К., якое мае на мэце вывучэнне фальклорнай спадчыны і літаратурных твораў, крыніцай натхнення якіх сталі гістарычныя падзеі, звычаі, абрады, прырода і г.д. пэўнага краю, а таксама творчасці пісьменнікаў-землякоў.

**Літаратуразнаўства** – навука, якая вывучае мастацкую літаратуру, асаблівасці яе гістарычнага і сучаснага развіцця, а таксама тэарэтычныя праблемы прыгожага пісьменства ў гістарычным зрэзе і на сучасным этапе.

**Манаграфічная тэма** – тэма, якая прадугледжвае вывучэнне творчасці аднаго пісьменніка на працягу некалькіх урокаў.

**Метад навучання** – навукова абгрунтаваная мадэль дзейнасці настаўніка і навучэнцаў, якая скіравана на дасягненне мэтаў навучання.

**Методыка выкладання літаратуры** – педагагічная навука, прадметам якой у сярэдняй школе з'яўляецца працэс вывучэння школьнікамі літаратуры ў межах адпаведнага вучэбнага прадмета.

***Навукова-метадычнае забеспячэнне** – працэс, які здзяйсняецца з мэтай забеспячэння атрымання адукацыі, павышэння якасці адукацыі; заснавана на выніках фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў у сферы адукацыі. Н.-м.з. агульнай сярэдняй адукацыі ўключае ў сябе: вучэбна-праграмную дакументацыю адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі; праграмна-плануючую дакументацыю выхавання; вучэбна-метадычную дакументацыю; вучэбныя выданні; інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы.

***Навучанне** – мэтанакіраваны працэс арганізацыі, стымулявання і здзяйснення вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па авалоданні імі ведамі, уменнямі і навыкамі, развіцці іх творчых здольнасцяў.

**Навык** – здольнасць аўтаматычна выконваць дзеянне; фарміруецца на аснове ўмення.

**Падручнік** – вучэбнае выданне, якое ўтрымлівае сістэматызаваны выклад вучэбнага матэрыялу, які адпавядае вучэбнай праграме.

**Пазакласная праца** – праца педагога з навучэнцамі ў час, які не прадугледжаны раскладам заняткаў. П.п. божа быць масавай, групавой і індывідуальнай.

**Пазакласнае чытанне** – арганізаванае настаўнікам чытанне твораў навучэнцамі для інтэлектуальнага, маральнага і эстэтычнага іх развіцця, а таксама развіцця літаратурных інтарэсаў і густу, далучэння да самастойнага чытання.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Паўтарэнне** – адзін са спосабаў навучання, які заснаваны на ўзнаўленні раней засвоенага матэрыялу, дэманстрацыі ўменняў і навыкаў з мэтай іх удасканалення і прымянення для вырашэння новых навучальных задач.

**Прыём навучання** – канкрэтныя дзеянні настаўніка, мэта якіх перадаць веды, фарміраваць уменні і навыкі, стымуляваць вучэбную дзейнасць навучэнцаў.

**Прынцып навучання** – рэальныя ці мяркуемыя заканамернасці, сфармуляваныя як нарматыўныя палажэнні, якімі павінен кіравацца настаўнік у працэсе сваёй педагагічнай дзейнасці.

**Развіваючыя мэты навучання** – перадача навучэнцам вопыту творчай і пошукавай дзейнасці, скіраваныя на развіццё мыслення (аналіз, сінтэз, індукцыя, дэдукцыя, параўнанне), маўлення, на фарміраванне адпаведных навыкаў і ўменняў.

**Развіццё маўлення (мовы)** – працэс, скіраваны на фарміраванне і ўдасканаленне ў навучэнцаў уменняў і навыкаў правільнай, выразнай вуснай і пісьмовай мовы.

**Рэпрадуктыўны метад** – спосаб арганізацыі вучэбнай дзейнасці праз шматразовае паўтарэнне ў адпаведнасці з заданнем настаўніка. Пры гэтым настаўнік выбірае ўзор, а навучэнцы выконваюць заданні паводле гэтага ўзору.

**Рэцэнзія** – від школьнага сачынення, якое мае на мэце даць аргументаванае тлумачэнне і ацэнку ідэйным і мастацкім асаблівасцям твора. Р. уяўляе сабой разгорнуты крытычны аповед, у аснове якога ляжыць аналіз мастацкага твора ў адзінстве яго формы і зместу.

**Самастойная работа** – форма навучання, якая прадугледжвае індывідуальную работу навучэнца ў адпаведнасці з устаноўкамі, заданнямі настаўніка ці падручніка.

**Сачыненне** – від пісьмовай працы ў школе, які прадугледжвае выклад меркаванняў, разважанняў, супастаўленняў, вывадаў навучэнцаў, а таксама іх ведаў на зададзеную тэму. С. могуць быць класнымі і дамашнімі; навучальнымі і кантрольнымі.

**Семінар** – форма правядзення заняткаў, якая прадугледжвае абмеркаванне дакладаў, паведамленняў, даследаванняў.

**Сінтэз** – метад навуковага даследавання (пазнання) з'яў праз злучэнне частак сістэмы ў адзінае цэлае.

**Сістэматызацыя** – працэдура аб'яднання прыкмет пэўных адзінак паводле іх аднароднасці ў адпаведныя (вылучанаму падабенству) групы.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Тлумачэнне** – працэс, пры якім пэўная інфармацыя прапаноўваецца ў выглядзе тэзісаў, іх развіцця, доказаў, ілюстрацый з мэтай разумення, засваення гэтай інфармацыі для далейшага эфектыўнага яе ўспрымання, асэнсавання, развіцця і прымянення тымі, каму накіравана гэтае тлумачэнне.

**Тэзіс** – палажэнне, якое сцісла перадае думку твора, даклада і г.д.

**Тэрмін** – слова або словазлучэнне, якое абазначае пэўнае навуковае паняцце з якой-небудзь спецыяльнай галіны навукі, тэхнікі, мастацтва і інш.

**Тэст** – сродак кантролю ведаў, уменняў і навыкаў навучэнцаў у выглядзе стандартызаваных заданняў і прадугледжанай шкалы вынікаў. Т. можа быць дыягнастычным і прагназуючым.

**Узроставая перыядызацыя** – перыядызацыя этапаў жыцця чалавека і вызначэння ўзроставых межаў гэтых этапаў; прынятая ў грамадстве сістэма ўзроставай стратыфікацыі.

**Уменне** – засвоены спосаб выканання вучэбнага дзеяння, які грунтуецца на падставе раней набытых ведаў і навыкаў; фарміруецца шляхам выканання шэрагу практыкаванняў. Сістэмная і выніковая праца па фарміраванні ўменняў – адна з умоў фарміравання навыкаў, на падставе якіх могуць фарміравацца новыя ўменні. У. характарызуецца ўсвядомленасцю, дынамізмам, самастойнасцю, прадуктыўнасцю.

**Урок** – форма арганізацыі навучання па вучэбным прадмеце з мэтай авалодання вучнямі ведамі, уменнямі, навыкамі, светапогляднымі і маральна-эстэтычнымі ідэямі. Такая форма выкарыстоўваецца пры класна-ўрочнай сістэме навучання і праводзіцца для адпаведнага класа (адносна пастаяннага навучальнага калектыву).

**Успрыманне** – цэласнае адлюстраванне ў свядомасці навучэнца прадметаў, падзей, з'яў, фактаў, якія прапануе адпаведны вучэбны матэрыял. У. ажыццяўляецца ў працэсе тлумачэння, дэманстрацыі, самастойнай працы з пісьмовымі, візуальнымі (відэа-) і слыхавымі (аўдыя-) крыніцамі інфармацыі.

***Установа адукацыі** – арганізацыя, якая ў адпаведнасці з прававой формай яе ўтварэння і дзейнасці ажыццяўляе працэс навучання і выхавання.

**Уступныя заняткі** – першы этап вывучэння новага матэрыялу, які характарызуецца такімі спосабамі навучання, як азнаямленне і пошук. Працягласць У.з. рэгламентуецца узростам навучэнцаў, памерам і складанасцю вучэбнага матэрыялу, часам на яго вывучэнне, адведзеным вучэбнай праграмай. Часавая працягласць – ад некалькіх хвілін (карот-

кая, тэзісная інфармацыя па адпаведнай тэме) да цэлага ўрока (разгорнутая інфармацыя, ілюстрацыі, пацвярджэнні і вывады па адпаведнай тэме, якія могуць мець розную форму іх рэпрэзентацыі).

**Факультатыў** – навучальны курс, які праводзіцца як неабавязковы для ўсіх навучэнцаў.

**Хрэстаматыя** – вучэбнае выданне, якое ўтрымлівае ў сабе літаратурна-мастацкія і гістарычныя тэксты, мастацкія творы або ўрыўкі з іх, што складаюць аб’ект вывучэння вучэбнага прадмета.

**Чытанне па ролях** – выразнае чытанне тэксту, які належыць дзеючым асобам; для яго ўласціва выкарыстанне элементаў мастацкага чытання: імкненне перадаць асаблівасці маўлення, характару, эмоцый дзеючых асоб.

**Шляхі аналізу мастацкага твора** – спосабы аналізу мастацкага твора. У методыцы замацавалася пяць Ш.а.м.т.: “следам за аўтарам”, павобразны, кампазіцыйны, праблемна-тэматычны, камбінаваны.

**Этапы вывучэння мастацкага твора** – часткі сістэмы вывучэння мастацкага твора: уступныя заняткі, чытанне, вывучэнне першаснага ўспрымання твора вучнямі, аналіз, заключныя заняткі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# *Спіс літаратуры*


1. Абсталяванне кабінета беларускай мовы і яго выкарыстанне ў навучальна-выхаваўчым працэсе. – Мінск, 1980. – 36 с.

2. *Альшук, С.І.* Методыка выпрацоўкі самастойных навукова-даследчых навыкаў старшакласнікаў на ўроках па вывучэнні творчасці Янкі Купалы / С.І. Альшук // Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні : зб. навук. прац /рэдкал. : У.І. Каяла (адк. рэд.) [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2007. – С. 88-100.

3. *Арцімёнак, Т.М.* Тэарэтычныя веды як аснова спасціжэння мастацкага твора / Т.М. Арцімёнак // Літаратурная адукацыя ў Беларусі на сучасным этапе: новыя падыходы і тэндэнцыі : зб. навук. арт. / уклад. А.І. Бельскі; рэдкал.: Г.У. Пальчык [і інпі.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2008. – С. 13-16.

4. *Аскірка, В.* Вывучэнне біяграфіі пісьменнікаў з выкарыстаннем камп'ютэрнай тэхналогіі : на прыкладзе біяграфіі Максіма Багдановіча : XI клас / В. Аскірка // Роднае слова. – 2007. – № 4. – С. 44-45.

5. *Бельскі, А.І.* Вучэбна–метадычны комплекс па беларускай літаратуры (структура, склад, крытэрыі і паказчыкі ацэнкі якасці) / А.І. Бельскі, І.Л. Шаўлякова-Барзенка // Беларуская мова і літаратура. – 2008. – № 2. – С. 3-8.

6. *Бельскі, А.І.* Літаратурацэнтрызм : педагагічныя артыкулы, нарысы / А.І. Бельскі. – Мінск : Адук. і вых., 2008. – 143 с.

7. *Бельскі, А.І.* Методыка напісання сачынення / А.І. Бельскі // Беларуская мова і літаратура. – 2003. – № 2. – С. 91-115.

8. *Буслакова, Т.П.* Как анализировать лирическое произведение : учеб. пособие / Т.П. Буслакова. – М. : Высш. школа, 2005. – 201 с.

9. *Верціхоўская, М.* Вывучэнне камедыі К. Крапівы “Хто смяецца апошнім” / М. Верціхоўская // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1989. – № 9. – С. 54-58.

10. Вучні 8 класа як чытачы // Родная літаратура у 8 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў / уклад. Л.В. Асташонак. – Мінск : Экаперспектыва, 1999. – С. 5-11.

11. Вучэбная праграма для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Беларуская літаратура V – XI класы. / Зацв. Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010.

12. Вывучэнне аглядавых тэмаў па беларускай літаратуры / уклад. В.Я. Ляшук, Г.М. Снітко . – Мінск : Юніпрэс, 2001. – 240 с.

13. Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій на ўроках беларускай мовы і літаратуры / В.У.Бухавец [і інш.] ; пад агульн. рэд. С.І. Цыбульскай. – Мінск : Сэр-Вит, 2006. – 207 с.

14. *Гаварушка, Я.* Колас і Замоцін / Я. Гаварушка // Маладосць. – 1982. – № 11. – С. 160-167.

15. *Грынько, М.У.* Вывучэнне біяграфіі пісьменніка / М.У. Грынько // Беларуская мова і літаратура. – 2007. – № 6. – С. 50-52.

16. *Грынько, М.У.* Рэгіянальны аспект пры вывучэнні тэмы “Беларускія народныя песні” (5 клас) / М.У. Грынько // Актуальныя праблемы выкладання


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

мовы і літаратуры ў вышэйшай і сярэдняй школе : мат. рэсп. навук. канф. 30 кастр. 2002 г. / пад рэд. У.І. Каялы, Т.І. Тамашэвіча. – Гродна : ГрДУ, 2003. – С. 29–32.

17. *Грынько, М.У.* Асаблівасці вывучэння біяграфіі Янкі Купалы ў сярэдняй школе / М.У. Грынько // Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні : зб. навук. прац. – Гродна : ГрДУ, 2006. – С. 84-88.

18. *Грынько, М.У.* Вывучэнне асобных лірычных твораў Янкі Купалы ў спалучэнні з сумежнымі відамі мастацтва / М.У. Грынько // Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні : мат-лы навук. канф., Гродна, 24 кастр. 2003 г. / пад рэд. У.І. Каялы. – Гродна : ГрДУ, 2003. – С. 105-108.

19. *Грыцаль, Т.М.* Беларуская літаратура ў школе: вывучэнне сучаснай прозы ў старэйшых класах : метад. дапам. / Т.М. Грыцаль. – Мінск: Тэхнапрынт, 2004. – 20 с.

20. *Грыцаль, Т.М.* Праблема вывучэння жанравай спецыфікі празаічных твораў на ўроках беларускай літаратуры ў 11 класе / Т.М.Грыцаль. – Мінск : Тэхнапрынт, 2003. – 97 с.

21. *Жук, Н.П.* Вывучэнне сучаснай беларускай гістарычнай літаратуры ў X-XI класах па сістэме перспектыўных ліній / Н.П. Жук // Актуальныя праблемы выкладання мовы і літаратуры ў вышэйшай і сярэдняй школе : мат. рэсп. навук. канф., Гродна, 30 кастр. 2002 г. / пад рэд. У.І. Каялы, Т.І. Тамашэвіча. – Гродна : ГрДУ, 2003. – С 53-57.

22. *Захаранка, Н.В.* Якуб Колас. “На ростанях” (план–канспект урока) / Н.В. За-харанка // Беларуская мова і літаратура. – 2003. – № 6. – С. 79-84.

23. *Казакова, І.В.* Роля фальклору ў сістэме адукацыі / І.В. Казакова // Літаратурная адукацыя ў Беларусі на сучасным этапе : новыя падыходы і тэндэнцыі : зб. навук. арт. / уклад. А.І. Бельскі; рэдкал.: Г.У. Пальчык [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2008. – С. 81–82.

24. *Караткевіч, В.І.* Вобраз Францыска Скарыны, асветніка і чалавека, у беларускай драматургіі канца 70 – 90-х гадоў / В.І. Караткевіч // Мастацкі вобраз: генезіс, эвалюцыя, сучасны стан : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Брэст, 28-30 вер. 2000 г. / Брэсц. дзярж. ун-т. ; пад рэд. М.І. Мішчанчука. – Брэст : БрДУ, 2001. – С. 90-93.

25. *Караткевіч, В.І.* Вобразны свет п’есы-містыфікацыі Сяргея Кавалёва “Звар’яцелы Альберт” / В.І. Караткевіч // Проблемы истории и культуры Верхнего Поднепровья : тезисы докл. Междунар. науч.-практ. конф., Могилев, 25-26 октября 2001 г. / Могилевс. гос. ун-т ; под ред. Я.Г. Риера – Могилев : МГУ, 2001. – С. 157–159.

26. *Караткевіч, В.І.* Некаторыя пытанні выкладання курса “Гісторыя беларускай літаратуры 80–90-х гадоў XX стагоддзя / В.І. Караткевіч // Традиционное и новаторское в преподавании литературы в школе и вузе : материалы междунар. науч. конф., Брест, 20-21 нояб. 2001 г.: в 2-х ч. / Брест. гос. ун-т ; под общ. ред. М.И. Мищенчука – Брест : БрДУ, 2002. – Ч. 1.– С. 136–140.

27. *Клышка, А.К.* Лірычны твор на ўроку / А.К. Клышка // Вывучэнне літаратуры : пытанні методыкі : зб. артыкулаў / пад рэд. В.У. Івашына. – Мінск : Нар. асвета, 1980. – С. 91–136.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

28. Кодекс Республики Беларусь об образовании. – Минск : РИВШ, 2011. – 352 с.
29. *Кудряшев, Н.И.* Взаимосвязь методов обучения на уроках литературы / Н.И. Кудряшев. – М. : Просвещение, 1981. – 320 с.
30. *Кухарава, І.А.* Схема аналізу мастацкага твора / І.А. Кухарава // Беларуская мова і літаратура. – 2001. – № 1. – С. 95–100.
31. *Лазарук, М.А.* Навучанне і выхаванне творчасцю : педагагічныя роздумы і пошукі / М.А. Лазарук. – Мінск : Нар. асвета, 1994. – 200 с.
32. *Лернер, И.Я.* Дидактические основы методов обучения / И.Я. Лернер. – М. : Педагогика, 1981.–185 с.
33. *Літвіновіч, А.Ф.* Праблемы вывучэння беларускага фальклору ў V класе / А.Ф. Літвіновіч // Літаратурная адукацыя ў Беларусі на сучасным этапе : новыя падыходы і тэндэнцыі : зб. навук. арт. / уклад. А.І. Бельскі; рэдкал.: Г.У. Пальчык [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2008. – С. 112–114.
34. *Логінава, Т.* Актуальная спадчына : методыка выкладання літаратуры паводле І.І. Замоціна / Т. Логінава // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1990. – № 7. – С. 17-18.
35. *Лугоўскі, А.І.* Літаратуразнавец і метадыст / А.І. Лугоўскі // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1988. – № 11. – С. 69-72.
36. *Лугоўскі, А.І.* Методыка выкладання беларускай літаратуры : вучэб. дапам. / А.І. Лугоўскі. – Мінск : БДПУ, 2005. – 92 с.
37. *Лугоўскі, А.І.* Слоўнік студэнта-філолага па методыцы выкладання беларускай літаратуры / А.І. Лугоўскі. – Мінск : БДПУ, 2006. – 127 с.
38. *Лявонава, П.І.* Беларуская літаратура ў пытаннях і адказах : 10 клас : дапам. для настаўнікаў агульнаадукацыйных устаноў з 12-гадовым тэрмінам навучання / П.І. Лявонава, М.У. Грынько, М.В. Савіцкі. – Мінск : УніверсалПрэс, 2007. – 384 с.
39. *Лясун, Л.* Мастацкая літаратура і гісторыя : метадычныя падыходы да вывучэння твораў на гістарычную тэму / Л. Лясун // Роднае слова. – 2007. – № 1. – С. 54–57.
40. *Ляшук, В.Я.* Вывучэнне аглядавай тэмы “Беларуская літаратура 20-х гадоў ХХ ст.” / В.Я. Ляшук. // Беларуская мова і літаратура. – 2003. – № 6. – С. 43–65.
41. *Ляшук, В.Я.* Вывучэнне беларускай літаратуры ў школе : гісторыка-метадычны нарыс (даваенны перыяд) / В.Я. Ляшук. – Мінск : Універсітэцкае, 1994. – 128 с.
42. *Ляшук, В.Я.* Вывучэнне творчасці Кандрата Крапівы ў школе / В.Я. Ляшук, М.У. Яніцкі. – Мінск : Аверсэв, 2007. – 192 с.
43. *Ляшук, В.Я.* Вывучэнне эпічных твораў : 5-8-я класы : для шк. з беларус. і рус. мовамі навучання : дапам. для настаўніка / В.Я. Ляшук. – Мінск : Нар. асвета, 1987. – 150 с.
44. *Ляшук, В.Я.* Краязнаўчы матэрыял на ўроках літаратуры / В.Я. Ляшук – Мінск : Нар. асвета, 1980. – 128 с.
45. *Ляшук, В.Я.* Літаратурнае краязнаўства ў школе / В.Я. Ляшук. – Мінск : Выш. школа, 1991. – 148 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

46. *Ляшук, В.Я.* Міжпрадметныя сувязі ў выкладанні беларускай мовы і літаратуры. / В.Я. Ляшук – Мінск : Нар. асвета, 1992. – 126 с.

47. *Ляшук, В.Я.* Урокі-семінары / В.Я. Ляшук // Роднае слова. – 1993. – № 6. – С. 34-38.

48. *Макарэвіч, А.М.* Вобразы Данілкі і Зосі з драмы “Раскіданае гняздо” ў кантэксце сэнсавых асаблівасцей спадчыны Янкі Купалы і драм Ф. Аляхновіча / А.М. Макарэвіч // Роднае слова. – 2003. – № 3. – С. 18–23.

49. *Макарэвіч, А.М.* Асаблівасці вывучэння артыкула Цёткі “Шануйце роднае слова” ў VII класе / А.М. Макарэвіч // Беларуская мова і літаратура. – 2011. – № 7. – С. 18–21.

50. *Макарэвіч, А.М.* Метадычныя рэкамендацыі па развіцці пісьмовай мовы вучняў і іх творчых здольнасцей (у кантэксце дзесяцібальнай сістэмы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў) / А.М. Макарэвіч // Беларуская мова і літаратура. – 2003. – № 1. – С. 3–21.

51. *Макарэвіч, А.М.* Праблемнае выкладанне беларускай літаратуры ў X – XI класах па сістэме перспектыўных ліній / А.М. Макарэвіч // Роднае слова. – 1994. – № 9. – С. 35–39.

52. *Макарэвіч, А.М.* Праблемнае выкладанне беларускай літаратуры ў X – XI класах па сістэме перспектыўных ліній / А.М. Макарэвіч // Роднае слова. – 1994. – № 10. – С. 37–40.

53. *Макарэвіч, А.М.* Праблемнае выкладанне беларускай літаратуры ў X – XI класах па сістэме перспектыўных ліній / А.М. Макарэвіч // Роднае слова. – 1994. – № 12. – С. 43–46.

54. *Макарэвіч, А.М.* Творчасць У. Караткевіча, А. Куляшова ў кантэксце этапаў і формаў звароту ў старэйшых класах сярэдняй школы да мастацкай версіі гістарычнага факту ў літаратуры / А.М. Макарэвіч // А.А.Куляшоў і вывучэнне яго творчасці ў ВНУ і школе ў кантэксце сучаснага літаратурнага працэсу: матэрыялы трэціх рэспублік. навук. чытанняў / Магілёўскі дзярж. пед. ін-т. – Магілёў, 1994. – С. 5–7.

55. Мастацкае чытанне ў школе : 5-11 класы : кніга для настаўніка / А.А. Каляда. – Мінск : Нар. асвета , 1992. – 200 с.

56. Методика преподавания литературы : в 2 ч. / под ред. О.Ю. Богдановой, В.Г. Маранцмана. – М. : Просвещение : Гуманит. изд. центр “Владос”, 1995. – Ч. 2. – 288 с.

57. Методыка выкладання беларускай літаратуры : вучэб. дапам. / пад рэд. В.Я. Ляшук. – Мінск : Экаперспектыва , 1999. – 445 с.

58. Методыка выкладання беларускай літаратуры : вучэб. дапам. для ВНУ / пад рэд. В. Я. Ляшук. – Мінск : Асар, 2002. – 416 с.

59. Методыка выкладання беларускай літаратуры : вучэб. дапам. для філал. фак. пед. ін-таў / Л.В. Асташонак, Ю.І. Валынец ; пад агул. рэд. В.Я. Ляшук. – Мінск : Выш. шк., 1986. – 366 с.

60. *Мішчанчук, М.І.* Аб некаторых праблемах вывучэння лірыкі ў старэйшых класах сярэдняй школы і ВНУ / М.І. Мішчанчук // Беларуская мова і літаратура. – 2001.– № 2. – С. 26–40.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

61. *Мішчанчук, М.І.* Вывучэнне творчасці Кандрата Крапівы: байка “Ганарысты парсюк” : 8 клас / М.І. Мішчанчук // Роднае слова. – 2007. – № 2. – С. 52–58.

62. *Мішчанчук, М.І.* І сэрцам, і розумам (асоба, ідэі, запаветы М.А. Лазарука) / М.І. Мішчанчук // Літаратурная адукацыя ў Беларусі на сучасным этапе : новыя падыходы і тэндэнцыі : зб. навук. арт. / уклад. А.І. Бельскі; рэдкал.: Г.У. Пальчык [і інпі.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2008. – С. 145–147.

63. *Мішчанчук, М.І.* Настаўніку – пра настаўнікаў : нарысы, рэпартажы з урокаў, эсэ / М.І. Мішчанчук. – Мінск : Нар. асвета, 1989.–118 с.

64. Праблемнае навучанне на ўроках беларускай літаратуры : 5-11 клас / уклад. В.А. Ганжына. – Мазыр : Белы вецер, 2002. – 164 с.

65. *Праскаловіч, В.У.* Народная педагогіка і сучасныя ідэі педагагічнай навукі на ўроках беларускай літаратуры ў старшых класах / В.У. Праскаловіч // Літаратурная адукацыя ў Беларусі на сучасным этапе : новыя падыходы і тэндэнцыі : зб. навук. арт. / уклад. А.І. Бельскі ; рэдкал.: Г.У. Пальчык [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2008. – С. 165–168.

66. *Рагойша, В.* Паэтычны слоўнік / В. Рагойша. – Мінск : Бел. навука, 2004. – 576 с.

67. *Рагойша, В.* Тэорыя літаратуры ў тэрмінах : дапаможнік / В. Рагойша. – Мінск : БелЭн, 2001. – 384 с.

68. Родная літаратура ў 7 класе : вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў / В.Я. Ляшук ; А.А. Майсейчык . – Минск : Асар, 1997. – 208 с.

69. Родная літаратура ў 6 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў / М.М. Аляшчэня, Л.В. Асташонак, Г.С. Гарадко [і інш.] ; пад рэд. В.Я. Ляшук. – Мінск : Асар, 2000. – 231 с.

70. Родная літаратура ў 9 класе / пад рэд. В.Я. Ляшук. – Мінск : Асар, – 2000. – 256 с.

71. *Русілка, В.І.* Эпас, лірыка, драма: дыферэнцыяцыя метадаў і прыёмаў школьнага аналізу твораў / В.І. Русілка // Літаратурная адукацыя ў Беларусі на сучасным этапе : новыя падыходы і тэндэнцыі : зб. навук. арт. / уклад. А.І. Бельскі ; рэдкал.: Г.У. Пальчык [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2008. – С. 171–174.

72. *Руцкая, А.В.* Заключныя заняткі ў сістэме працы над творам / А.В. Руцкая // Беларуская мова і літаратура. – 2008. – № 3. – С. 20-23.

73. *Руцкая, А.В.* Методыка выкладання беларускай літаратуры / А.В. Руцкая, М.У. Грынько. – Мінск : Изд-во Гревцова, 2010. – 184 с.

74. *Руцкая, А.В.* Пазакласная праца па беларускай літаратуры : дапам. для настаўнікаў / А.В. Руцкая. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 165 с.

75. *Руцкая, А.В.* Творчыя працы па беларускай літаратуры як сродак рэалізацыі камунікатыўнага навучання / А.В. Руцкая // Актуальныя праблемы выкладання мовы і літаратуры ў вышэйшай і сярэдняй школе : мат. рэсп. навук. канф. 30 кастр. 2002 г. / пад рэд. У.І. Каялы, Т.І. Тамашэвіча. – Гродна : ГрДУ, 2003. – С. 62-67.

76. *Руцкая, А.В.* Шляхі аналізу мастацкага твора / А.В. Руцкая, М.У. Грынько / Беларуская мова і літаратура. – № 5. – 2006. – С. 9-12.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

77. *Савіцкі, М.* Пра тэарэтыка-літаратурную падрыхтоўку ў сістэме літаратурнай адукацыі / М. Савіцкі // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай : VIII Міжнар. навук. канф., прысвеч. 125-годдзю з дня нарадж. Янкі Купалы і Якуба Коласа, 1–3 лістап. 2007 г., Мінск, БДУ: зб. навук. арт. / рэдкал. Т.І. Шамякіна (адк. рэд.) [і інш.]; пад агул. рэд. І.С. Роўды. – Мінск : БДУ, 2008. – С. 287–291.

78. Сазанкова, В. “Мая Радзіма – Беларусь” : урок-свята па нарысе У. Караткевіча “Зямля пад бельмі крыламі” / В. Сазанкова // Роднае слова. – 1997. – № 10. – С. 86–99.

79. *Сенькавец, У.А.* Выразнае чытанне : практыкум для студэнтаў дзённай і завочнай форм навучання філалагічнага факультэта / У.А. Сенькавец. – Брэст : БрДУ, 2006. – 53 с.

80. *Смыкоўская, В.І.* Развіццё мовы на ўроках літаратуры ў школе / В.І. Смыкоўская. – Мінск : Нар. асвета, 1988. – 149 с.

81. *Смыкоўская, В.* Вывучэнне п’есы “Зацюканы апостал” Андрэя Макаёнка. X клас / В. Смыкоўская // Роднае слова. – 2006. – № 10. – С. 46–52.

82. *Старычонак, В.Дз.* Як правільна пісаць сачыненні : у дапамогу абітурыентам і школьнікам / В.Дз. Старычонак. – Гродна : Выд. Ілюшы В. Мельнікава , 1997. – 32 с.

83. Тэсты па літаратуры: “за” і “супраць” // Беларуская мова і літаратура. – 2006. – № 10. – С. 33–42.

84. Урок літаратуры ў школе : кніга для настаўніка / пад рэд. М.А. Лазарука, В.У. Івашына. – Минск : Нар. асвета, 1995. –148 с.

85. Урокі беларускай літаратуры ў 8 класе : вучэбна-метадычны дапаможнік / В.А. Карухіна, П.І. Лявонава, І.М. Слесарава . – Минск : Маст. літ., 2006. – 214 с.

86. *Цітова, Л.К.* Асаблівасці ўспрымання лірыкі вучнямі V – VIII класаў / Л.К. Цітова – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 1993. – 46 с.

87. *Шарапава, А.В.* Проза Максіма Гарэцкага ў кантэксце сусветнай літаратуры (метадычны аспект вывучэння творчасці пісьменніка ў X класе) / А.В. Шарапава // Актуальныя праблемы выкладання мовы і літаратуры ў вышэйшай і сярэдняй школе : мат. рэсп. навук. канф., Гродна, 30 кастр. 2002 г. / пад рэд. У.І. Каялы, Т.І. Тамашэвіча. – Гродна : ГрДУ, 2003. – С. 73–79.

88. *Шаўлякова-Барзенка, І.Л.* Навучанне тэорыі літаратуры ў V–VIII класах / І.Л. Шаўлякова-Барзенка // Беларуская мова і літаратура. – 2008. – № 10. – С. 47-53.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Дадатак 1*

ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
ад 18.06.2010 № 420

**Ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў**
**па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура»**

Плануемыя вынікі навучання ў прадметна-дзейнаснай форме вызначаны вучэбнымі праграмамі ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура». Падрыхтоўка вучняў прадугледжвае фарміраванне: тэарэтыка-літаратурных і гісторыка-літаратурных ведаў; чытацкіх уменняў; сістэмы эмацыянальна-каштоўнасных адносін; вопыту літаратурна-творчай дзейнасці.

Вынікі вучэбнай дзейнасці вучняў па беларускай літаратуры ацэньваюцца па наступных параметрах:

змястоўнасць і глыбіня вуснага і пісьмовага выказвання, якія адлюстроўваюць якасць успрымання і разумення мастацкага твора, сфарміраванасць аналітычных і маўленчых уменняў, здольнасць выкарыстоўваць іх на практыцы, самастойнасць ацэнак падзей і характараў у мастацкіх творах, іх аргументаванасць;

выразнасць чытання на памяць;

тэхніка чытання незнаёмага тэксту.

**Паўрочны кантроль** вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў ажыццяўляецца ў вуснай і пісьмовай формах ці ў іх спалучэнні шляхам правядзення індывідуальнага, групавога, франтальнага апытанняў з выкарыстаннем пытанняў і заданняў, змешчаных у падручніках, вучэбных, вучэбна-метадычных дапаможніках, а таксама іншых спосабаў кантролю.

Працуючы над тэкстам мастацкага твора згодна з пытаннямі і заданнямі падручніка, настаўнік выпраўляе сэнсавыя, а таксама маўленчыя і граматычныя памылкі ў адказе вучня. Аналітычныя пытанні падручніка могуць быць прапанаваны для пісьмовага адказу пасля абмеркавання іх на папярэдніх уроках.

**Пры ацэньванні** вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў улічваюцца іх узроставыя асаблівасці і магчымасці.

**Тэматычны кантроль** вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў ажыццяўляецца ў вуснай і пісьмовай формах ці ў іх спалучэнні.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Пры ацэнцы вусных адказаў і пісьмовых работ вучняў (разгорнуты адказ на пытанне, пераказ, аповед пра героя і інш.) улічваюцца:

разуменне ўзаемасувязі падзей, учынкаў, характараў персанажаў і важнейшых сродкаў іх паказу (у адпаведнасці з патрабаваннямі праграмы);

правільнасць і матываванасць адбору эпізодаў, малюнкаў, дэталяў для вырашэння пастаўленай настаўнікам задачы;

кампазіцыйная стройнасць і логіка пабудовы адказу;

моўная пісьменнасць, культура вымаўлення (захаванне арфаэпічных і акцэнталагічных нормаў; правільнае інтанаванне).

Заахвочваюцца самастойнасць думкі вучняў, аргументаванасць і пераканаўчасць довадаў, арыгінальнасць падыходаў да вырашэння задачы, эмацыянальнасць адказу, выразнасць і вобразнасць мовы.

Ацэнкай вусных адказаў і пісьмовых работ па літаратуры неабходна заахвочваць глыбокае, індывідуальна-асобаснае ўспрыманне літаратуры як мастацтва слова.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Ацэнка вуснага і пісьмовага выказвання**

| Бал | Паказчыкі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці |
|---|---|
| 1 | Тэкст літаратурнага твора прачытаны часткова. Вучань мае вельмі прыблізнае ўяўленне пра яго змест. Пастаўленыя пытанні не асэнсоўваюцца. Відавочная абмежаванасць слоўнікавага запасу, неразвітасць мовы, наяўнасць шматлікіх граматычных, лексічных, арфаэпічных памылак (больш за 8) |
| 2 | Тэкст прачытаны фрагментарна, спасцігнуты на элементарным узроўні.Навыкі пераказу тэксту адсутнічаюць. Мова неразвітая, са шматлікімі маўленчымі памылкамі (7–8) |
| 3 | Твор прачытаны, эмацыянальна ўспрыняты, але ўзнаўленне зместу не ўсвядомленае, фрагментарнае: вучань не бачыць сувязі паміж эпізодамі характарам героя, не разумее агульнага пафасу твора. Мова невыразная, з вялікай колькасцю маўленчых памылак (6–7) |
| 4 | Літаратурны твор эмацыянальна перажываецца, эмацыянальна ацэньваецца на ўзроўні «падабаецца – не падабаецца». Вучэбны матэрыял узнаўляецца неўсвядомлена. Мова аднастайная, са значнай колькасцю памылак (5–6) |
| 5 | Твор эмацыянальна перажываецца і асэнсоўваецца са спробай ацаніць характары і сітуацыі па маральных крытэрыях. Цікавасць да маральнага аспекту ўчынкаў і паводзін герояў. Спроба спасцігнуць вобразны лад твора, аўтарскія адносіны да герояў і падзей пры адсутнасці аналітычных уменняў. Змест твора пераказваецца ўсвядомлена. Мова невыразная, з памылкамі (4–5) |

| Бал | Паказчыкі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці |
|---|---|
| 6 | Дастаткова поўнае разуменне і асэнсаванне літаратурнага твора на фоне эмацыянальнага перажывання сітуацыі са спробай абгрунтаванай ацэнкі падзей і характараў па маральных крытэрыях. Сустракаюцца 3–4 маўленчыя памылкі |
| 7 | Валоданне тэкстам, эмацыянальна-маральныя ацэнкі характараў і сітуацый з улікам кампазіцыйнай будовы твора (роля пейзажу, партрэта, моўнай характарыстыкі і інш.). Дапускаюцца 2–3 маўленчыя памылкі |
| 8 | Разуменне праблематыкі літаратурнага твора. Свабоднае валоданне тэкстам, ужыванне цытат з яго для падмацавання сваіх меркаванняў. Самастойнасць ацэнкі стандартных сітуацый па маральных крытэрыях з улікам кампазіцыйнай будовы твора (асэнсаванне ідэйна-кампазіцыйнай ролі эпізоду). Дапускаюцца 1–2 маўленчыя памылкі |
| 9 | Уменне аналізаваць характар літаратурнага героя ў святле пастаўленай аўтарам праблемы, з улікам жанравай і стылёвай спецыфікі мастацкага твора. Самастойнасць у ацэнцы нестандартных сітуацый, характараў, абгрунтаванасць меркаванняў. Дапускаюцца 1–2 маўленчыя памылкі, якія выпраўляюцца самім вучнем |
| 10 | Уменне аналізаваць літаратурны твор, выяўляць яго праблематыку, ідэйны сэнс; уменне праводзіць літаратурныя аналогіі і супастаўленні. Уменне бачыць сувязь паміж характарамі ў вобразнай сістэме твора, паміж сістэмай вобразаў і кампазіцыйнай пабудовай твора з мэтай высвятлення аўтарскай канцэпцыі жыцця і асобы. Адсутнасць маўленчых памылак. Творчы падыход пры выкананні задання |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Ацэнка выразнага чытання на памяць

| Бал | Паказчыкі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці |
|---|---|
| 1 | Фрагментарнае ўзнаўленне тэксту, са шматлікімі арфаэпічнымі памылкамі (больш за 7) |
| 2 | Фрагментарнае ўзнаўленне тэксту. Чытанне манатоннае, з арфаэпічнымі памылкамі (6–7) |
| 3 | Няпоўнае ўзнаўленне тэксту. Узнаўленне тэксту са шматлікімі памылкамі (5–6). Слабае інтанаванне, без адчування аўтарскага настрою |
| 4 | Няпоўнае ўзнаўленне тэксту. Чытанне з 4–5 памылкамі. Спробы эмацыянальна адгукацца на перажыванні, увасобленыя ў мастацкім тэксце |
| 5 | Чытанне з 2–3 памылкамі. Спробы эмацыянальна ўключыцца ў маральна-этычную сітуацыю перажывання і перадаць голасам настрой |
| 6 | Чытанне з 1–2 памылкамі. Спробы ўзнавіць голасам і інтанацыяй перажыванні лірычнага героя |
| 7 | Выразная дыкцыя пры добрым веданні тэксту (1–2 запінкі). Спроба ўзнаўлення эмацыянальнага напружання тэксту |

*Заканчэнне табліцы*

| Бал | Паказчыкі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці |
|---|---|
| 8 | Добрае веданне тэксту. Аўтарская інтанацыя перададзена правільна. Узнаўленне эмацыянальнага напружання тэксту |
| 9 | Поўнае веданне тэксту. Спробы самастойнай інтэрпрэтацыі аўтарскай пазіцыі |
| 10 | Бездакорнае веданне тэксту. Выразнае чытанне на аснове самастойнай інтэрпрэтацыі аўтарскай пазіцыі |

## Ацэнка тэхнікі чытання (для V–VIII класаў) *

| Бал | Паказчыкі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці |
|---|---|
| 1 | Чытанне па складах або чытанне паасобных слоў без захавання інтанацыі сказа і без уліку знакаў прыпынку |
| 2 | Чытанне па словах, з памылкамі ў канчатках, без захавання інтанацыі сказа і без уліку знакаў прыпынку (неасэнсаванае чытанне) |
| 3 | Чытанне па словазлучэннях, з памылкамі ў націсках слоў і няправільным лагічным націскам |
| 4 | Чытанне па словазлучэннях. Слабае асэнсаванне тэксту, невыразная інтанацыя |
| 5 | Недастаткова асэнсаванае чытанне па фразах без неабходнай інтанацыі |
| 6 | Асэнсаванае фразавае чытанне з захаваннем сэнсавых паўз. Наяўнасць 2–3 нязначных арфаэпічных памылак |
| 7 | Беглае фразавае чытанне, асэнсаванае, з захаваннем сэнсавых паўз і інтанацыі сказа. Наяўнасць 1–2 нязначных арфаэпічных памылак |
| 8 | Свабоднае чытанне з захаваннем арфаэпічных норм. Дапускаецца 1 арфаэпічная памылка, якая самастойна выпраўляецца вучнем |
| 9 | Чытанне выразнае. Арфаэпічныя памылкі адсутнічаюць |
| 10 | Выразнае, інтанацыйна багатае чытанне тэксту з захаваннем арфаэпічных норм |

* Хуткасць чытання не ўлічваецца.

Пры ацэнцы вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў улічваецца характар дапушчаных **істотных** і **неістотных памылак.**

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Апісанне характару памылак

| Характар памылак | Тэхніка чытання | Выразнае чытанне на памяць | Вуснае і пісьмовае выказванне |
|---|---|---|---|
| Неістотныя памылкі (адзнака можа быць зніжана на 1 бал) | Адзінкавыя памылкі ў націсках і вымаўленні асобных слоў пры беглым асэнсаваным чытанні | Няправільна пастаўлены лагічны націск пры агульным правільным інтанаванні і добрым веданні тэксту | Недастатковая аргументацыя свайго пункту погляду на сітуацыю і характар у літаратурным творы |

*Заканчэнне табліцы*

| Характар памылак | Тэхніка чытання | Выразнае чытанне на памяць | Вуснае і пісьмовае выказванне |
|---|---|---|---|
| Істотныя памылкі (адзнака можа быць зніжана на 2–3 балы) | Абцяжаранае пафразавае чытанне, калі не асэнсоўваецца сувязь паміж сказамі | Манатоннасць. Адсутнасць неабходнага ўзроўню дыкцыі і невыразнае вымаўленне канчаткаў. Недарэчныя паўзы ці паскарэнне тэмпу чытання. Неадэкватная інтанацыя пры перадачы знакаў прыпынку | 1. Кепскае веданне тэксту мастацкага твора (з чужых слоў ці пераказаў, неразуменне прачытанага), што выяўляецца:<br>а) у блытанні імёнаў герояў, падобных сітуацый, месца дзеяння і да т. п.;<br>б) у прыпісванні слоў ці ўчынкаў іншаму літаратурнаму герою;<br>в) у зруху падзей па часе;<br>г) у неразуменні прычынна-выніковых сувязей.<br>2. Замена аналізу тэксту яго пераказам.<br>3. Няўменне асэнсаваць сувязь характараў з сюжэтам і кампазіцыяй літаратурнага твора. |

Пры правядзенні *выпускнога экзамену* па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» адказ вучня на кожнае пытанне экзаменацыйнага білета ацэньваецца асобна.

Выніковая адзнака вызначаецца як сярэдняе арыфметычнае адзнак, выстаўленых за адказ на кожнае з пытанняў экзаменацыйнага білета.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Дадатак 2*

ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
ад 18.06.2010 № 420

**_Вытрымкі_ з**
**Ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»**

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Ацэнка вуснага адказу

Вуснае апытанне з’яўляецца адным з метадаў кантролю вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў.

Вуснае звязнае выказванне паказвае ўзровень засваення вучнем агульных палажэнняў, правілаў, азначэнняў і ўменне прымяняць атрыманыя веды на практыцы, а таксама ўменне школьнікаў ствараць звязнае, лагічна паслядоўнае паведамленне на пэўную тэму.

Пры ацэнцы адказу вучня ўлічваюцца:

1) ступень усвядомленасці вывучанага;
2) пацвярджэнне тэарэтычных звестак прыкладамі;
3) паўната;
4) фактычная дакладнасць адказу;
5) лагічнасць і дакладнасць маўлення;
6) правільнасць маўлення.

### Крытэрыі і паказчыкі ацэнкі вуснага адказу

| Бал | Усвядомленасць | Пацвярджэнне тэарэтычных звестак прыкладамі | Паўната | Фактычная дакладнасць | Лагічнасць і дакладнасць маўлення | Правільнасць маўлення |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Узнаўляе матэрыял неўсвядомлена | Прыклады прывесці не можа | Фрагментарна ўзнаўляе нязначную частку матэрыялу | Пры ўзнаўленні матэрыялу робіць памылкі ў фармулёўках азначэнняў і правілаў, якія скажаюць іх сэнс | Выкладае хаатычна, бязладна | У маўленні вялікая колькасць памылак |

*Працяг табліцы*

| Бал | Усвядомленасць | Пацвярджэнне тэарэтычных звестак прыкладамі | Паўната | Фактычная дакладнасць | Лагічнасць і дакладнасць маўлення | Правільнасць маўлення |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 2 | Не можа абгрунтаваць свае меркаванні | Прыклады прывесці не можа | Узнаўляе нязначную частку матэрыялу | Пры ўзнаўленні матэрыялу робіць памылкі ў фармулёўках азначэнняў і правілаў | Выкладае непаслядоўна | Робіць шматлікія маўленчыя памылкі, якія не можа выправіць пры ўказанні на іх |
| 3 | Не можа доказна абгрунтаваць свае меркаванні | Адчувае цяжкасці ў прывядзенні прыкладаў | Узнаўляе матэрыял часткова | Пры ўзнаўленні матэрыялу дапускае ў азначэннях паняццяў і фармулёўцы правілаў недакладнасці, якія не можа выправіць пры ўказанні на іх | Выкладае непаслядоўна | Робіць нязначную колькасць маўленчых памылак, якія не можа выправіць пры ўказанні на іх |
| 4 | Паказвае разуменне асноўных палажэнняў, без глыбокага і доказнага іх абгрунтавання | Адчувае цяжкасці ў прывядзенні большай часткі прыкладаў | Узнаўляе матэрыял у няпоўным аб'ёме | Пры ўзнаўленні матэрыялу дапускае ў азначэннях паняццяў і фармулёўцы правілаў недакладнасці, якія не можа выправіць пры ўказанні на іх | Выкладае з парушэннямі паслядоўнасці | Робіць маўленчыя памылкі, якія выпраўляе з дапамогай настаўніка |
| 5 | Паказвае разуменне асноўных палажэнняў, але недастаткова абгрунтоўвае свае меркаванні | Тэарэтычныя звесткі падмацоўвае прыкладамі з падручніка без абгрунтавання | Узнаўляе асноўныя палажэнні | Пры ўзнаўленні матэрыялу дапускае ў азначэннях паняццяў і фармулёўцы правілаў недакладнасці, большую частку якіх не можа выправіць пры ўказанні на іх | Выкладае з пэўнай дакладнасцю, але з недахопамі ў паслядоўнасці | Робіць маўленчыя памылкі, якія выпраўляе самастойна або з дапамогай пытанняў настаўніка |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Працяг табліцы*

| Бал | Усвядомленасць | Пацвярджэнне тэарэтычных звестак прыкладамі | Паўната | Фактычная дакладнасць | Лагічнасць і дакладнасць маўлення | Правільнасць маўлення |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 6 | Ведае і разумее большую частку матэрыялу | Тэарэтычныя звесткі падмацоўвае прыкладамі з падручніка | Узнаўляе большую частку матэрыялу | Пры выкладанні матэрыялу дае азначэнні і фармулюе правілы, але дапускае недакладнасці, якія выпраўляе з дапамогай настаўніка | Выкладае ў асноўным у адпаведнасці з патрабаваннямі лагічнасці і дакладнасці | Дапускае асобныя маўленчыя памылкі |
| 7 | Ведае і разумее матэрыял, можа абгрунтаваць свае меркаванні | Тэарэтычныя звесткі падмацоўвае прыкладамі з падручніка | Узнаўляе матэрыял у цэлым | Выкладае тэарэтычны матэрыял, дакладна ўзнаўляючы азначэнні і правілы, дапускае неістотныя памылкі зместавага характару, якія выпраўляе з дапамогай пытанняў настаўніка | Выкладае ў цэлым у адпаведнасці з патрабаваннямі лагічнасці і дакладнасці | Дапускае асобныя маўленчыя недахопы |
| 8 | Паказвае поўнае разуменне вучэбнага матэрыялу, уменне аргументавана яго выкладаць | Тэарэтычныя звесткі ілюструе прыкладамі з падручніка і адзінкавымі, якія падабраны самастойна | Узнаўляе матэрыял поўнасцю | Выкладае тэарэтычны матэрыял з неістотнымі, самастойна выпраўленымі памылкамі зместавага характару, дакладна ўзнаўляе азначэнні і правілы | Выкладае з дастатковай лагічнасцю і дакладнасцю | Дапускае адзінкавыя маўленчыя недахопы |
| 9 | Паказвае высокую ступень усведамлення вучэбнага матэрыялу, уменне аргументавана яго выкладаць | Тэарэтычныя звесткі ілюструе прыкладамі не толькі з падручніка, але і самастойна падабранымі | Поўнасцю ўзнаўляе матэрыял | Правільна выкладае тэарэтычны матэрыял, дакладна ўзнаўляе азначэнні і правілы | Выкладае ў адпаведнасці з патрабаваннямі лагічнасці і дакладнасці | Дапускае адзінкавыя і нязначныя маўленчыя недахопы |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Заканчэнне табліцы*

| Бал | Усвядомленасць | Пацвярджэнне тэарэтычных звестак прыкладамі | Паўната | Фактычная дакладнасць | Лагічнасць і дакладнасць маўлення | Правільнасць маўлення |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 10 | Выкладае свабодна, з высокай ступенню ўсведамлення і аргументаванасці; робіць самастойныя высновы і абагульненні | Тэарэтычныя звесткі ілюструе прыкладамі не толькі з падручніка, але і самастойна падабранымі | Поўнасцю ўзнаўляе матэрыял | Правільна выкладае тэарэтычны матэрыял, дакладна ўзнаўляе азначэнні і правілы | Выкладае ў поўным аб'ёме ў адпаведнасці з патрабаваннямі лагічнасці і дакладнасці | Маўленчых недахопаў не дапускае |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Ацэнка камунікатыўных уменняў і навыкаў вучняў

На гэтым узроўні ацэньваюцца ўменні правільна і паслядоўна выкладаць думкі ў адпаведнасці з тэмай і задумай, узровень маўленчай падрыхтоўкі вучняў, г. зн. уменні карыстацца моўнымі сродкамі ў адпаведнасці са стылем і жанрам, тэмай і задачамі выказвання. Для ацэнкі камунікатыўных уменняў і навыкаў выкарыстоўваюцца розныя віды творчых работ, у першую чаргу пераказы, пераклады і сачыненні.

У якасці навучальных выкарыстоўваюцца падрабязныя, сціслыя, выбарачныя пераказы, пераказы з дадатковымі заданнямі. У якасці кантрольных – падрабязныя пераказы.

Аб'ём тэксту кантрольнага пераказу павінен адпавядаць патрабаванням Інструкцыі аб парадку фарміравання культуры вуснай і пісьмовай мовы ў агульнаадукацыйных установах Рэспублікі Беларусь.

У І паўгоддзі ў V класе агульнаадукацыйных устаноў праводзяцца толькі навучальныя пераказы, якія ацэньваюцца па нормах для IV класа.

Пераказы, пераклады і сачыненні ацэньваюцца дзвюма адзнакамі: першай ацэньваюцца змест і маўленчае афармленне, другой – арфаграфічныя, пунктуацыйныя і граматычныя памылкі:

**<u>З—М</u>**

**І—V—Г**

*Змест* ацэньваецца па наступных крытэрыях:

– адпаведнасці работы тэме і асноўнай думцы;
– паўнаце і глыбіні раскрыцця тэмы;
– правільнасці выкладу фактычнага матэрыялу;
– звязнасці, лагічнасці, паслядоўнасці выкладу.

Пры ацэнцы *маўленчага афармлення* творчых работ улічваюцца:

разнастайнасць слоўніка і граматычнага ладу маўлення вучняў;

стылявое адзінства і выразнасць маўлення, наяўнасць (адсутнасць) маўленчых недахопаў.

*Пісьменнасць* ацэньваецца паводле колькасці дапушчаных арфаграфічных, пунктуацыйных і граматычных памылак.

Наяўнасць арыгінальнай задумы і яе добрая рэалізацыя дазваляюць павысіць першую адзнаку за сачыненне на 1 бал.

**Крытэрыі і паказчыкі ацэнкі творчых работ вучняў**

| Бал | Змест | Маўленчае афармленне | Пісьмен-насць |
|---|---|---|---|
| 1 | 1. Работа не адпавядае тэме або тэма не раскрыта.<br>2. Парушаны сэнсавая сувязь сказаў і паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі.<br>3. Дапускаецца больш за 8 недахопаў у змесце. | 1. Работа характарызуецца беднасцю слоўнікавага запасу, кароткімі аднатыпнымі канструкцыямі.<br>2. Дапускаецца больш за 8 маўленчых недахопаў: парушэнняў дакладнасці словаўжывання, логікі выкладу матэрыялу, стылявога адзінства. | Больш як на 2 балы |
| 2 | 1. Работа не адпавядае тэме.<br>2. Сэнсавая сувязь сказаў і паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі часта парушаюцца.<br>3. Дапускаецца не больш за 8 недахопаў у змесце. | 1. Работа характарызуецца беднасцю слоўнікавага запасу, аднатыпнасцю канструкцый.<br>2. Дапускаецца не больш за 8 маўленчых недахопаў, у тым ліку парушэнняў дакладнасці словаўжывання, логікі выкладу матэрыялу, стылявога адзінства. | ад 7/2 да 10/1 і 10 граматычных памылак |
| 3 | 1. Работа часткова раскрывае тэму і асноўную думку.<br>2. Сэнсавая сувязь сказаў і паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі ў некаторых выпадках парушаюцца.<br>3. Дапускаецца не больш за 7 недахопаў у змесце. | 1. Работа вызначаецца беднасцю слоўнікавага запасу, аднатыпнасцю канструкцый.<br>2. Дапускаецца не больш за 7 маўленчых недахопаў, у тым ліку парушэнняў дакладнасці словаўжывання, логікі выкладу матэрыялу, стылявога адзінства. | 0/8, 1/7, 2/6, 3/5, 4/4, 5/3, 6/2, 7/1 і 7 граматычных памылак |
| 4 | 1. Работа часткова раскрывае тэму і асноўную думку, ёсць адхіленні ад тэмы.<br>2. Сэнсавая сувязь сказаў і паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі ў адзінкавых выпадках парушаюцца.<br>3. Дапускаецца не больш за 6 недахопаў у змесце. | 1. Работа вызначаецца пэўнай беднасцю слоўнікавага запасу і аднатыпнасцю сінтаксічных канструкцый.<br>2. Дапускаецца не больш за 6 маўленчых недахопаў, у тым ліку парушэнняў дакладнасці словаўжывання, логікі выкладу матэрыялу, стылявога адзінства. | 0/7, 1/6, 2/5, 3/4, 4/3, 5/2, 6/0, 6/1 і 6 граматычных памылак |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Працяг табліцы*

| Бал | Змест | Маўленчае афармленне | Пісьменнасць |
|---|---|---|---|
| 5 | 1. Работа ў цэлым раскрывае тэму і асноўную думку, ёсць адхіленні ад тэмы.<br>2. Вытрымліваецца агульнае сэнсавая цэласнасць у разгортванні асноўнай думкі, сэнсавая сувязь сказаў і паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі ў цэлым захоўваюцца.<br>3. Дапускаецца не больш за 5 недахопаў у змесце. | 1. У рабоце ёсць адзінкавыя выпадкі выкарыстання выяўленчых сродкаў мовы.<br>2. Дапускаецца не больш за 5 маўленчых недахопаў, у тым ліку парушэнняў дакладнасці словаўжывання, логікі выкладу матэрыялу, стылявога адзінства. | 0/6, 1/5, 3/3, 4/2, 5/0, 5/1 і 5 граматычных памылак |
| 6 | 1. Работа ў цэлым раскрывае тэму і асноўную думку, ёсць адхіленні ад тэмы.<br>2. Захоўваецца паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі, вытрымліваецца агульная сэнсавая цэласнасць у разгортванні асноўнай думкі, сэнсавая сувязь сказаў.<br>3. Дапускаецца не больш за 4 недахопы ў змесце. | 1. Работа ў цэлым вызначаецца разнастайнасцю выкарыстаных моўных сродкаў, дакладнасцю словаўжывання, выразнасцю.<br>2. Дапускаецца не больш за 4 маўленчыя недахопы, у тым ліку парушэнні логікі выкладу матэрыялу і стылявога адзінства. | 0/5, 1/4, 2/3, 3/2, 4/0, 4/1 і 4 граматычныя памылкі |
| 7 | 1. Работа раскрывае тэму і асноўную думку.<br>2. Захоўваецца паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі, вытрымліваецца агульная сэнсавая цэласнасць у разгортванні асноўнай думкі, сэнсавая сувязь сказаў.<br>3. Дапускаецца не больш за 3 недахопы ў змесце. | 1. Работа вызначаецца разнастайнасцю выкарыстаных моўных сродкаў, дакладнасцю словаўжывання, выразнасцю.<br>2. Дапускаецца не больш за 3 маўленчыя недахопы, у тым ліку парушэнні логікі выкладу матэрыялу або стылявога адзінства тэксту. | 0/4, 1/3, 2/1, 2/2, 3/0, 3/1 і 3 граматычныя памылкі |
| 8 | 1. Работа раскрывае тэму і асноўную думку.<br>2. Захоўваецца паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі, вытрымліваецца сэнсавая цэласнасць у разгортванні асноўнай думкі, сэнсавая сувязь сказаў.<br>3. Дапускаецца не больш за 2 недахопы ў змесце. | 1. Работа характарызуецца багаццем слоўніка, разнастай насцю выкарыстаных моўных сродкаў, дакладнасцю словаўжывання, агульнай лагічнасцю, выразнасцю, стыль работы ў цэлым характарызуецца адзінствам выкарыстання моўных сродкаў.<br>2. Дапускаецца не больш за 2 маўленчыя недахопы – парушэнні логікі выкладу матэрыялу або стылявога адзінства тэксту. | 2/0, 1/1, 1/2, 0/2, 0/3 і 2 граматычныя памылкі або 3 выпраўленні на месцы арфаграм (пунктаграм) |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Заканчэнне табліцы*

| Бал | Змест | Маўленчае афармленне | Пісьменнасць |
|---|---|---|---|
| 9 | 1. Работа цалкам раскрывае тэму і асноўную думку (наяўнасць тэматычнага адзінства).<br>2. Захоўваецца паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі, вытрымліваецца сэнсавая цэласнасць у разгортванні асноўнай думкі, сэнсавая сувязь сказаў.<br>3. Дапускаецца не больш за 1 недахоп у змесце. | 1. Работа характарызуецца багаццем слоўніка і разнастайнасцю выкарыстаных моўных сродкаў, лагічнасцю, дакладнасцю словаўжывання, выразнасцю, вызначаецца адзінствам выкарыстання моўных сродкаў.<br>2. Дапускаецца не больш за 1 маўленчы недахоп. | 1/0, 0/1 і 1 граматычная памылка, або 1–2 выпраўленні на месцы арфаграм (пунктаграм) |
| 10 | 1. Работа поўнасцю раскрывае тэму і асноўную думку (наяўнасць тэматычнага адзінства).<br>2. Захоўваецца паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі, вытрымліваецца сэнсавая цэласнасць у разгортванні асноўнай думкі, сэнсавая сувязь сказаў.<br>3. Недахопаў у змесце не дапускаецца. | 1. Работа характарызуецца багаццем слоўніка і разнастайнасцю выкарыстаных моўных сродкаў, дакладнасцю, лагічнасцю, дарэчнасцю, выразнасцю.<br>2. Маўленчыя недахопы адсутнічаюць. | 0/0, 1/0 (нягрубая), 0/1 (нягрубая), 1–2 выпраўленні не на месцы арфаграм (пунктаграм) |

## Ацэнка тэстаў

Эфектыўным спосабам праверкі вынікаў вучэбнай дзейнасці школьнікаў з’яўляюцца тэставыя заданні, на выкананне якіх патрабуецца мінімальная колькасць часу.

Тэсты можна выкарыстоўваць у якасці навучальных і кантрольных. З іх дапамогай настаўнік зможа праверыць, а вучні замацаваць вучэбны матэрыял па ўсіх тэмах і раздзелах курса беларускай мовы. Колькасць заданняў па розных тэмах можа быць неаднолькавая (ад 5 і больш). Тэст за ўзровень агульнай базавай адукацыі ўключае ад 10 да 30 заданняў, за ўзровень агульнай сярэдняй адукацыі – да 40 (у залежнасці ад мэт і задач праверкі).

### Крытэрыі ацэнкі тэставых работ

| Бал | Ступень выканання заданняў |
|---|---|
| 1 | Менш, як на 2 балы |
| 2 | Выканана не менш за 20 % прапанаваных заданняў |
| 3 | Выканана не менш за 30 % прапанаваных заданняў |
| 4 | Выканана не менш за 40 % прапанаваных заданняў |
| 5 | Выканана не менш за 50 % прапанаваных заданняў |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Заканчэнне таблицы*

| Бал | Ступень выканання заданняў |
|---|---|
| 6 | Выканана не менш за 60 % прапанаваных заданняў |
| 7 | Выканана не менш за 70 % прапанаваных заданняў |
| 8 | Выканана не менш за 80 % прапанаваных заданняў |
| 9 | Выканана не менш за 90 % прапанаваных заданняў |
| 10 | Выкананы ўсе прапанаваныя заданні |

## Класіфікацыя памылак

### *Тэкставыя (зместавыя) памылкі*

Памылкі, якія прыводзяць да парушэння асноўных прымет тэксту, у лінгваметодыцы называюць тэкставымі. Да тыповых тэкставых памылак адносяцца:

1) падмена тэмы, асноўнай думкі і аўтарскай пазіцыі тэксту-арыгінала пры напісанні пераказу;
2) неапраўданае скарачэнне або павелічэнне падтэм пры пераказе тэксту арыгінала;
3) непаўната раскрыцця асноўных падтэм, якія аб’ядноўваюць змест тэксту;
4) адсутнасць аргументаў для доказу выказаных у сачыненні думак;
5) няўменне выкарыстоўваць веды, уласныя назіранні, літаратурныя крыніцы, жыццёвы вопыт для абгрунтавання ўласнай пазіцыі ў сачыненні;
6) неадпаведнасць зместу сачынення заяўленай у загалоўку тэме;
7) скажэнне фактаў, падзей, імён, назваў, дат;
8) парушэнне паслядоўнасці развіцця думкі ў тэксце;
9) парушэнне прычынна-выніковых, часавых сувязей паміж сказамі;
10) парушэнне сэнсавай цэласнасці тэксту;
11) парушэнне лагічнай сувязі паміж сказамі ў межах адной сэнсавай часткі;
12) пропуск сказаў, неабходных для лагічнага развіцця думкі;
13) неабгрунтаваны падзел тэксту на абзацы;
14) парушэнне суразмернасці частак тэксту (уступ, асноўная частка, заключэнне).

Тэкставыя памылкі ў школьнай практыцы традыцыйна абазначаюцца літарай **З** (змест).

### *Маўленчыя памылкі*

Маўленчыя памылкі – гэта парушэнні патрабаванняў камунікатыўных якасцей маўлення (дакладнасці, лагічнасці, чысціні, дарэчнасці, выразнасці і багацця).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Да маўленчых памылак адносяцца наступныя:

1) ужыванне слова ці ўстойлівага выразу з неўласцівым яму значэннем: *Чарнавус валодае* добрымі *адносінамі з супрацоўнікамі інстытута* (правільна: *мае адносіны*). *Уверсе нешта звінела, як быццам нехта гуляў на дудачцы* (правільна: *іграў на дудачцы*).

2) парушэнне лексічнай спалучальнасці: *На паляўнічага накінуўся пажылы мядзведзь* (правільна: *стары*). *Васіль адчуваў сябе адзіночным чалавекам* (правільна: *адзінокім*).

3) выкарыстанне русізмаў: *Народ мог узнаць пра падзеі, якія былі ў далёкім прошлым. Вумныя і добрыя людзі.*

4) неадрозненне адценняў значэння сінонімаў ці блізкіх па значэнні слоў: *Ён шырока расчыніў вочы* (правільна: *расплюшчыў*). *Варыць чай* (малако) (правільна: *гатаваць* чай, *парыць* малако).

5) неадрозненне паронімаў (аднакаранёвых слоў з розным значэннем): *Абагуліць матэрыял* (правільна: *абагульніць*); *каменная дарога* (правільна: *камяністая*).

6) ужыванне лішняга слова (плеаназм): *Народныя песні спявалі маладыя маладзіцы* (правільна: *спявалі маладзіцы*).

7) ужыванне адзін каля аднаго (або блізка) аднакаранёвых слоў (таўталогія): *Шмат твораў стварыў Янка Купала для дзяцей.*

8) паўтарэнне аднаго і таго ж слова побач: *Ён прыехаў з Парыжа. Як толькі* ***ён*** *адчыніў дзверы, людзі кінуліся да яго*.

9) ужыванне слова або выразу іншай стылявой афарбоўкі: *Важна разгульвае па мястэчку ўраднік. Школьнікі рынуліся ўручаць букеты кветак любімым настаўнікам.*

10) неапраўданае ўжыванне прастамоўных і дыялектных слоў і выразаў: *Высокі ўраджай кіяхоў на палях краіны вывеў гаспадарку на першае месца ў раёне* (замест *кукурузы*).

11) неразмежаванне лексікі розных гістарычных эпох: *Абдумваючы адказ на пытанне, вучань нахмурыў чало* (замест *лоб*); *Лабановіч ведаў, што знойдзе пісара ў рэстаране* (замест *карчме*).

12) недакладнае ўжыванне асабовых і ўказальных займеннікаў: *Маці прапанавала сыну наліць сабе чаю* (*маці* ці *сыну?*). *Настаўнік параіў вучню прачытаць яго даклад* (*настаўніка* ці *вучня?*).

13) беднасць і аднастайнасць сінтаксічных канструкцый:

*Мы жылі ў палатцы. Палатка стаяла на беразе. Ён быў абрывісты. На беразе раслі сосны. Яны былі стромкія.*

14) неабгрунтаванае выкарыстанне сродкаў сувязі (злучнікаў, злучальных слоў, пабочных слоў, лексічных паўтораў) паміж сказамі і сэнсавымі часткамі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А.Кулешова

## *Граматычныя памылкі*

Граматычныя памылкі – гэта памылкі, дапушчаныя пры ўтварэнні слоў розных часцін мовы і іх формаў, пабудове словазлучэнняў і сказаў, г.зн. парушэнне словаўтваральнай, марфалагічнай або сінтаксічнай нормаў.

Да тыповых граматычных памылак адносяцца:

*І. Памылкі ў структуры слова*

1. Пры ўтварэнні слова: *стварацель* (правільна: *стваральнік*), *Толін* (правільна: *Толеў*), *ластаўкаў* (правільна: *ластаўчын*), *кароўскае* (правільна: *каровіна*).

2. Пры ўтварэнні формы

а) назоўніка: *дзвер* (правільна: *дзверы*), *праменні* (правільна: *праменне*), *медаллю* (правільна: *медалём*), на *жалюзях* (правільна: на *жалюзі*), *кусты ажынніка* (правільна: *ажынніку*), *пры доктары* (правільна: *пры доктару*), *кошык яблык* (правільна: *яблыкаў*);

б) прыметніка: *малодшы на пяць гадоў* (правільна: *маладзейшы*), *самы большы будынак* (правільна: *самы вялікі*), *бачу братава сына* (правільна: *братавага*); *сястра вышэй за мяне* (правільна: *вышэйшая*);

в) лічэбніка: *дзвюмя камандамі* (правільна: *дзвюма*), *стамі вучнямі* (правільна: *ста*), *паўтарамі кіламетрамі* (правільна: *паўтара*);

г) займенніка: *самаго сябе* (правільна: *самога*), *сваяго народа* (правільна: *свайго*); *сваі пытанні* (правільна: *свае*);

д) дзеяслова, дзеепрыметніка, дзеепрыслоўя: *ідзець* (правільна: *ідзе*), *гавора* (правільна: *гаворыць*), *змяркаць* (правільна: *змяркацца*), *ён было пайшоў* (правільна: *быў пайшоў*); *рассмяяўшаяся дзіця* (правільна: *дзіця, якое рассмяялася; рассмяянае*); *сядзеў, чытая кнігу* (правільна: *чытаючы*);

е) прыслоўя: *свяціў ярчэе* (правільна: *свяціў ярчэй*), *паступіў сама наймудрэй* (правільна: *сама мудра*).

*ІІ. Памылкі ў структуры словазлучэння*

1. Памылкі ў дапасаванні: *тры высокіх будынкі* (правільна: *высокія*), *два любімых творы* (правільна: *любімыя*), *даручыць заданне саміх дзецям* (правільна: *самім*).

2. Памылкі ў кіраванні: *дзякаваць настаўніка* (правільна: *настаўніку*), *звярнуцца па адрасе* (правільна: *на адрас*), *хварэць грыпам* (правільна: *хварэць на грып*), *пайсці за хлебам* (правільна: *па хлеб*), *загадчык бібліятэкай* (правільна: *бібліятэкі*), *заклапочанасць над пытаннямі* (правільна: *заклапочанасць пытаннямі*), *тры пятыя гектары* (правільна: *гектара*).

*ІІІ. Памылкі ў структуры сказа*

1. Парушэнне межаў сказа: *Нам радасна бачыць. Як прыгажэе родны Мінск.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. Парушэнне сувязі паміж дзейнікам і выказнікам: *Вакол вогнішча сядзелі і размаўлялі група аднакласнікаў* (правільна: *сядзела і размаўляла*). *Большасць кніг прачытаны Андрэем* (правільна: *прачытана*).

3. Парушэнне суаднесенасці трывання і часу дзеяслоўных формаў: *Калі пачалася вайна, яго мабілізоўваюць у армію. Ён накіроўваецца ў Санкт-Пецярбург і з лёгкасцю паступіў у інстытут.*

4. Памылкі ў пабудове сказаў з дзеепрыслоўнымі зваротамі: *Едучы ў цягніку, у мяне прапалі рэчы. Радуючы Максіма, на вуліцы стала марозна і сонечна. Падыходзячы да школы, мы зайшлі ў клас.*

5. Памылкі ў пабудове сказаў з дзеепрыметнымі зваротамі: *Каля дарогі ляжалі паваленыя дрэвы бурай* (правільна: *паваленыя бурай дрэвы* або *дрэвы, паваленыя бурай*). *Пякло нахіленае сонца на захад* (правільна: *нахіленае на захад сонца* або *сонца, нахіленае на захад*).

6. Памылкі ў пабудове сказаў з аднароднымі членамі: *На пасяджэнні савета класа гаварылі пра збор макулатуры, металалому і аб дапамозе шэфам.*

7. Памылкі ў пабудове складаных сказаў: *У вобразе дзядзькі Антося аўтар паказвае загубленую маладосць, і ва ўсім гэтым трэба вініць самадзяржаўе.*

8. Памылкі пры складанні сказаў з ускоснай мовай: *Ужо неяк пад восень сказала Аленка Сцёпку, што я хачу працягваць вучобу* (правільна: *што хоча працягваць вучобу*).

9. Пропуск слоў у сказе: *Вася хуценька паабедаў і пабег у валейбол* (замест *гуляць у валейбол*).

10. Няўдалы парадак слоў у сказе: *Ён выйшаў з ужо кепскім настроем.*

11. Дубліраванне дзейніка: *Маці, яна заўсёды намагалася дапамагчы мне.*

Граматычныя памылкі, дапушчаныя ў напісанні формаў слоў у дыктантах, пры падліку далучаюцца да арфаграфічных. Пры гэтым за адну памылку, напрыклад, лічыцца напісанне канчатка ***-а*** ў родным склоне адзіночнага ліку назоўнікаў *воск, жвір, лёд*. Але калі дапушчаны памылкі ў выразах тыпу *лісце дуба — шафа з дубу*, *падысці да перахода – не было пераходу праз вуліцу, другога лістапада – у час лістападу дрэвы стаяць аголеныя* і падобных, кожную такую памылку трэба лічыць за асобную.

### *Арфаграфічныя памылкі*

У пісьмовых работах вучняў могуць быць дапушчаны ***памылкі, якія паўтараюцца, аднатыпныя, грубыя (нягрубыя) памылкі.***

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***Памылкамі, якія паўтараюцца***, лічацца памылкі, дапушчаныя ў адным і тым жа слове некалькі разоў (напрыклад, *земля, да землі*) або ў аднакаранёвых словах (напрыклад, *мілодыя, міладычны*).

Памылкі, якія паўтараюцца, лічацца за адну.

Да ***аднатыпных*** адносяцца памылкі на адно правіла, калі выбар правільнага напісання вызначаецца аднымі і тымі ўмовамі: *зямля, вясна, сцяна* (**е, ё – я**); *на ўсходзе, ва ўмовах* (напісанне **ў** нескладовага), *па-першае, па-другое, па-трэцяе* (правапіс прыслоўяў з прыстаўкай ***па-***, утвораных ад парадкавых лічэбнікаў) і г. д.

Не кваліфікуюцца як аднатыпныя напісанні, якія вызначаюцца рознымі ўмовамі аднаго і таго правіла: *вясна, зямля, сцяна* (правапіс **я** ў першым складзе перад націскам – адна памылка), *завязь, пояс, месяц* (правапіс слоў з каранёвым **я** – другая памылка), *сезон, герой, кефір* (напісанне **е** ў запазычаных словах – трэцяя памылка) і г. д.; *на ўсходзе, ва ўмовах* (напісанне **ў** нескладовага пасля галосных у пачатку слова – адна памылка), *траўка, шаўковы, воўк* (другая памылка), *жанчына-ўрач, паўночна-ўсходні* (трэцяя памылка), *аўдыторыя, паўза, джоўль* (чацвёртая памылка) і г. д.

Першыя тры аднатыпныя памылкі лічацца за адну, кожная наступная з аднатыпных – як самастойная.

***Грубымі*** лічацца арфаграфічныя памылкі на вывучаныя правілы (перадача акання, якання на пісьме, правапіс **о, э, а, е, ё, я** ў складаных словах, правапіс прыстаўных галосных і зычных, нескладовага **ў** і **у** складовага, падоўжаных зычных, спалучэнняў зычных, апострафа і мяккага знака, напісанні суфіксаў і канчаткаў розных часцін мовы, **не** з рознымі часцінамі мовы, напісанні слоў розных часцін мовы разам, асобна або праз злучок і інш.).

Да ***нягрубых*** адносяцца арфаграфічныя памылкі:

пры пераносе слоў: *а-сака* замест *аса-ка*, *сенаў-борка* замест *се-на-ўбор-ка*;

няправільнае ўжыванне вялікай і малой літар у складаных уласных назвах і назвах неславянскага паходжання: *Беларускі Дзяржаўны ўніверсітэт* замест *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*; (возера) *Рыца;* (гара) *Манблан*;

у выбары літары **ы, і** пасля прыставак на зычны: *безідэйны* (замест *безыдэйны*);

у словах-выключэннях з правілаў: *бонна, мецца; фатаграфія, матавоз, вустрыца*;

у напісанні прыслоўяў і блізкіх да іх па значэнні спалучэнняў назоўнікаў з прыназоўнікамі: *напамяць* (замест *на памяць*), *без перастанку* (замест *бесперастанку*);

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

напісанні разам і асобна **не** з прыметнікамі і дзеепрыметнікамі ў ролі выказніка: *Праца няцяжкая. Праца не цяжкая. Заданне нявыкананае. Заданне не выкананае*;

напісанні **не, ні** ў спалучэннях *не хто іншы, як...*; *ніхто іншы не…*

Нягрубыя памылкі лічацца за паўпамылкі.

***Пунктуацыйныя памылкі***

Пунктуацыйныя – гэта памылкі, якія дапускаюцца вучнямі ў дыктантах, пераказах, сачыненнях і іншых пісьмовых работах. Яны звязаны з парушэннем пунктуацыйных правілаў. Класіфікацыя пунктуацыйных памылак даецца ў адпаведнасці з раздзеламі сінтаксісу:

знак прыпынку ў канцы сказа;

працяжнік паміж галоўнымі членамі;

працяжнік у няпоўным сказе;

знакі прыпынку пры зваротках;

знакі прыпынку пры пабочных і ўстаўных канструкцыях;

знакі прыпынку пры аднародных членах;

знакі прыпынку пры аднародных членах з абагульняльнымі словамі;

знакі прыпынку пры адасобленых азначэннях;

знакі прыпынку пры адасобленых прыдатках;

знакі прыпынку пры адасобленых акалічнасцях, выражаных дзеепрыслоўямі;

знакі прыпынку пры адасобленых акалічнасцях, выражаных назоўнікамі і прыслоўямі;

знакі прыпынку пры параўнальных зваротах;

знакі прыпынку для выдзялення простай мовы;

знакі прыпынку для аддзялення простай мовы ад слоў аўтара;

знакі прыпынку для выдзялення частак, якія ўваходзяць у склад складаназалежнага сказа;

знакі прыпынку ў складаназлучаным сказе;

знакі прыпынку для раздзялення аднародных частак, што ўваходзяць у склад складаназалежнага сказа;

коска і коска з кропкай для раздзялення частак, якія ўваходзяць у склад бяззлучнікавага сказа;

двукроп’е і працяжнік для выдзялення частак, якія ўваходзяць у склад бяззлучнікавага складанага сказа.

Сярод пунктуацыйных памылак выдзяляюць ***грубыя*** і ***нягрубыя. Аднатыпных*** пунктуацыйных памылак не бывае, паколькі ў кожным канкрэтным выпадку праблема выбару і пастаноўкі знака прыпынку вырашаецца з улікам структуры і сэнсу запісу. Сярод пунктуацыйных памылак могуць быць ***памылкі, якія паўтараюцца,*** калі ўявіць, што адна і тая ж канструкцыя, з адным і тым жа лексічным напаўненнем паўтараецца ў запісваемым тэксце некалькі разоў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***Грубымі пунктуацыйнымі памылкамі*** лічацца тыя, якія парушаюць структурна-сэнсавае чляненне пісьмовага маўлення, таму што з’яўляюцца вынікам незахавання асноўных пунктуацыйных правілаў.

***Нягрубыя*** пунктуацыйныя памылкі з’яўляюцца вынікам парушэння другасных, часцей негатыўных (якія адмяняюць дзеянне асноўных) правілаў, якія звычайна прыводзяцца ў заўвагах і рэгулююць норму, якая не мае шырокага распаўсюджання ці ўяўляе сабою прыватныя выпадкі пастаноўкі знакаў прыпынку.

**Тып памылкі**

| Правіла | Грубая | Нягрубая |
|---|---|---|
| 1. Знак прыпынку ў канцы сказа: *Раніца. Спеў жаўранка.* | Пропуск знака прыпынку: *Раніца_ Спеў жаўранка.* | Памылка ў выбары знака:<br>1. *Раніца**!** Спеў жаўранка**!***<br>2. *Бабуля запыталася, хто прынёс сюды красак**?***<br>3. Пастаноўка кропкі ў загалоўку тэксту: *Зіма**.*** |
| 2. Працяжнік паміж галоўнымі членамі | 1. Пастаноўка коскі паміж дзейнікам і выказнікам: *Белы пясок паблізу вады**,** быў зацканы зялёнымі верасамі.*<br>2. Пропуск працяжніка на месцы нулявой звязкі: *Плошча поля_20 гектараў.* | Пастаноўка працяжніка на месцы нулявой звязкі, калі дзейнік выражаны асабовым займеннікам, а выказнік – назоўнікам у назоўным склоне ці калі паміж дзейнікам і выказнікам, які выражаны назоўнікам у назоўным склоне, стаіць часціца ***не*:**<br>*Я _ чалавек. Кажан _ не птушка.* |
| У выпадку, калі дапускаюцца варыянты ўжывання ці неўжывання працяжніка, любое адхіленне ад нормы можна не браць у разлік пры выстаўленні адзнакі. | | |
| 3. Знакі прыпынку пры аднародных членах | 1. Пропуск коскі паміж аднароднымі членамі (акрамя пастаноўкі коскі паміж неаднароднымі азначэннямі): *Згінулі сцюжы_ марозы_ мяцеліцы.*<br>2. Пропуск двукроп’я ці працяжніка для аддзялення аднародных членаў ад абагульняльных слоў: *У хаце не было нікога_ ні старых, ні малых.* *Будынак, парк і агароджа _ было ўсё слаўна і прыгожа.* | 1. Пастаноўка лішняй коскі паміж аднароднымі членамі: *Пажар заўважылі**,** як з баракаў, так і з пасёлка. Я ўсміхаюся**,** і вясне, і сонцу, і дожджыку.*<br>2. Ужыванне коскі паміж неаднароднымі азначэннямі: *Насталі кароткія**,** летнія ночы. А пад бэзам раслі высокія**,** чырвоныя вяргіні.*<br>3. Няправільны выбар двукроп’я ці працяжніка пры абагульняльных словах: |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Працяг табліцы*

| Правіла | Грубая | Нягрубая |
|---|---|---|
| | | *Мы з талентамі ўсе – і лекар, і пажарнік, і слуцкі хлебасей.*<br>*У нас і цыбуля, і сала, і бульба: усё ёсць.* |
| 4. Знакі прыпынку пры зваротках | Пропуск знака для выдзялення звароткa:<br>*Я помню летнія часіны і вас _* ***грыбныя баравіны!***<br>*Тужыць_* ***браток_*** *не маем часу!*<br>***Мой сынок_*** *Усміхайся, шчаслівыя песні спявай!* | 1. Няправільны выбар знака прыпынку пры зваротках у выпадках, калі эмацыянальнасць выказвання падкрэсліваецца лексічна:<br>*“Алесь. Уцякай хутчэй! –* ***загаласіў*** *сусед.*<br>2. Пастаноўка лішняй коскі пасля часціцы **о** пры зваротку:<br>О, ***родны край****, не дай забыцца аб радасці сустрэчы.*<br>3. Пропуск косак для выдзялення паясняльных слоў да звароткa пры іх раздзяленні:<br>***Мая рыбка****, спі _* ***залатая!*** |
| 5. Знакі прыпынку пры пабочных словах і сказах | Пропуск знака прыпынку для выдзялення найбольш ужывальных пабочных слоў, сказаў:<br>***Словам****_сабраліся выходзіць удвух.*<br>*Спрадвеку_* ***як людзі сцвярджаюць****_праз бор гасцінец ляжаў.* | Няправільны выбар знакаў прыпынку для выдзялення пабочных і ўстаўных канструкцый:<br>*Хлопцы,* ***а іх было чалавек восем,*** *дружна запляскалі Сцёпку.* |
| 6. Знакі прыпынку пры адасобленых членах сказа | Памылкі, звязаныя з выдзяленнем знакамі прыпынку адасобленых членаў сказа (акрамя зваротаў з *як):*<br>*Полымем палае дол_* ***зарослы пералескамі****.*<br>***Здзіўлены_*** *я паволі ўстаю з лаўкі.*<br>*Час ад часу бліскала маланка_* ***асвятляючы паплавы****.* | 1. Пропуск другой коскі для выдзялення адасобленага члена сказа перад злучнікам ***і*** (ці пасля яго), які спалучае аднародныя члены:<br>*Сонца апусцілася зусім нізка і_* ***стаміўшыся****, пачало хіліцца на захад.*<br>2. Пропуск адасаблення адзіночных дзеепрыслоўяў:<br>*Раз-пораз стукалі_* ***падаючы****_спілаваныя дрэвы.*<br>3. Адасабленне акалічнасцей, выражаных адзіночнымі дзее-прыслоўямі, якія сваім значэн-нем набліжаюцца да прыслоўяў спосабу дзеяння ці часу:<br>*Лена бегла, не азіраючыся.* |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Працяг табліцы*

| Правіла | Грубая | Нягрубая |
|---|---|---|
| | | 4. Адсутнасць знакаў прыпынку для выдзялення адасобленых акалічнасцей, выражаных назоўнікамі з прыназоўнікамі *дзякуючы, адпаведна, насуперак, у адпаведнасці з, са згоды* і іншымі са значэннем прычыны, умовы, уступкі, спосабу дзеяння:<br>*Нягледзячы на трывожны час_ рынак жыў сваім звычайным жыццём.*<br>*У адпаведнасці з законам_ кожны мае права на працу.* |
| 7. Знакі прыпынку пры ўдакладняльных акалічнасцях месца і часу | Пропуск косак пры выдзяленні ўдакладняльных акалічнасцей месца і часу:<br>*За дваром_* ***на бярозах_*** *была пасека.*<br>*На другі дзень* ***_зранку_*** *па вёсцы пранеслася чутка пра дзіўнае здарэнне.* | |
| 8. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай | 1. Памылкі ў пропуску знакаў для выдзялення простай мовы:<br>***_Сцяпанка***, *– сказаў чалавек, –* ***ідзі пасядзі ў цяньку_***.<br>2. Памылкі ў пропуску знакаў для аддзялення простай мовы ад слоў аўтара, а таксама знакаў у канцы простай мовы:<br>*"Гэй, паромшчык!_ нехта гучна клікаў з другога берага.*<br><br>Пропуск аднаго з парных знакаў ці некалькіх лічыцца за адну памылку. | 1. Пастаноўка лішніх двукоссяў, коскі замест кропкі пасля слоў аўтара, што разрываюць простую мову, якая складаецца з рознатыпных па мэце выказвання і інтанацыі сказаў, замена двукроп'я кропкай ці коскай пасля слоў аўтара, у якіх ёсць указанне на працяг простай мовы, парушэнне паслядоўнасці размяшчэння знакаў пры іх спалучэнні.<br>2. Памылковы выбар знака прыпынку пры простай мове:<br>*Старож загадаў:* ***"Пакіньце памяшканне!",*** *і выключыў святло.* |
| 9. Знакі прыпынку ў складаназлучаным сказе | Пропуск коскі для раздзялення частак складаназлучанага сказа:<br>*Полівае стэпы дождж бойкі_* ***ды*** *шумяць высокія пшаніцы.* | Пастаноўка лішняй коскі ў складаназлучаным сказе з агульным даданым членам або агульным пабочным словам ці часціцай:<br>***Праз нейкі ча****с вецер разагнаў хмары, і дождж сціх.*<br>***Толькі*** *верхавіны соснаў гулі, ды шалясцелі асіны.* |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Заканчэнне табліцы*

| Правіла | Грубая | Нягрубая |
|---|---|---|
| 10. Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах | 1. Пропуск знака прыпынку для выдзялення даданай часткі:<br>*Мы пайшлі туды_ **адкуль чулася песня**.*<br>2. Пастаноўка коскі перад злучнікам ***і*** , які спалучае аднародныя даданыя часткі ў складаназалежным сказе:<br>*Чуваць было, **як** цвыркае конік у траве**,** і **як** гулка стукае дзяцел.* | |
| 11. Знакі прыпынку ў бяззлучнікавых складаных сказах | 1. Пропуск знака для раздзялення частак бяззлучнікавага складанага сказа:<br>*Цвітуць лугі_ ўздымае жыта каласы.*<br>*Падрасцеш вялікі _ раскажу тады.*<br>*Усе бачылі _ яна і прыгожая, і ўдалая.*<br>2. Памылковы выбар знака паміж часткамі бяззлучнікавага складанага сказа:<br>*Алесь зразумеў **–** нервовасць Кастуся можа сапсаваць справу.*<br>*Слова сказаў**:** сякераю адсек.* | |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## *Дадатак № 3*

### Асаблівасці характарыстыкі мастацкіх вобразаў лірычнага твора ў 5-м классе (на прыкладзе вершаў М. Багдановіча і А. Грачанікава)

Сістэма перспектыўных ліній (далей – СПЛ) прадугледжвае паэтапнае фарміраванне ў школьнікаў навучальных алгарытмаў, уменняў і навыкаў з мэтай больш эфектыўнага развіцця іх у далейшым навучанні. Пры гэтым важна, каб настаўнік і вучні ўсведамлялі, на якіх этапах дзейнасці, у якіх яе формах спатрэбяцца ім у далейшым алгарытмы, уменні і навыкі, да выпрацоўкі якіх яны звяртаюцца на тым ці іншым уроку. СПЛ – гэта працэс, вектары якога (настаўнік || вучні) накіраваны насустрач адно другому і маюць на мэце зыходжанне ў адной выніковай навучальнай кропцы. Спалучэнне такіх выніковых кропак спрыяе сістэмнасці ў навучанні і выхаду на працэс рацыянальнай арганізацыі працы настаўніка і вучня.

У пятым класе здзяйсняецца падрыхтоўчы этап да больш складанай (у наступных класах) працы з мастацкімі вобразамі, мэты якой у школьным навучанні наступныя: а) вучыць вылучаць мастацкія вобразы і параўноўваць іх з прадметамі, з’явамі, якія пакладзены ў аснову гэтых вобразаў; б) фарміраваць уменні вызначаць сэнс (сутнасць) мастацкага вобраза на падставе параўнання яго з прадметамі, з’явамі, якія пакладзены ў яго аснову; в) фарміраваць уменні вызначаць ідэйнае гучанне мастацкага твора на падставе асэнсавання сукупнасці значэнняў мастацкіх вобразаў твора.

Пры характарыстыцы працы з мастацкімі вобразамі твораў М. Багдановіча і А. Грачанікава ў 5 класе можна здзяйсняць выхад на такія перспектывы ў дзейнасці школьнікаў: фарміраванне ўменняў а) падрыхтоўкі да выканання творчых заданняў з мэтай развіцця маўлення вучняў, б) самастойнага стварэння вобразных выказванняў у вусным маўленні і творчай рабоце, в) правядзення параўнання вобразаў з твораў аднаго і таго ж і розных аўтараў[2].

Пры гэтым заўважым, што прапанаваныя далей этапы, формы і змест мэтазгодна выкарыстоўваць і пры вывучэнні твораў іншых пісьменнікаў. У такім выпадку пры ўмове эфектыўнай працы ў гэтым напрамку могуць фарміравацца ўмовы эфектыўнай дзейнасці вучняў пры вывучэнні літаратуры па СПЛ.

Для пятага класа “Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне…” прапануе пры вывучэнні вершаў М. Багдановіча “Зімой” і

[2] У дадзеным выпадку тут і далей не ставім перад сабой мэту даць падрабязныя планы ўрокаў. Яны залежаць ад узроўню падрыхтаванасці вучняў, метадычнай сістэмы, на якую арыентуецца настаўнік.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

А. Грачанікава “Зоры спяваюць”, з аднаго боку, звяртаць увагу на вобразы вершаванага твора з мэтай развіцця вобразнага ўяўлення вучняў, другога боку, – з мэтай набліжэння да разумення сутнасці мастацкага вобраза. Заўважым, што да гэтага ў пятым класе прапаноўвалася “*фарміраваць эмпірычнае ўяўленне пра мастацкі вобраз*” (пры вывучэнні “Дрымотна цiснуцца кусты…” А. Грачанікава і “Ёсць у кожнага з нас…” Я. Крупенькі) [2]. Фактычна названыя вышэй вершы М. Багдановіча і А. Грачанікава – гэта першыя творы, на прыкладзе якіх вучням прапаноўваецца “*паглыбіць уяўленне пра мастацкі вобраз і сродкі яго абмалёўкі*” [2]. Такім чынам, у дадзеным выпадку здзяйсняецца **першы этап працы з мастацкім вобразам у пятым класе**.

Найбольш прыдатныя **формы працы на гэтым этапе і іх змест**.

***Першы ўрок. Тэма: Максім Багдановіч. “Зімой” (1 гадзіна)*** [3].

1. Вылучэнне мэт працы і яе перспектыў (вызначэнне пачуццяў паэта, перададзеных у вершы; падрыхтоўка да выканання дамашняга задання па гэтым і наступным уроку: выразнае чытанне дадзенага верша на памяць, адказы на пытанні да верша; падрыхтоўка вуснай замалёўкі пра зімовы вечар, у якой неабходна стварыць паэтычныя вобразы на падставе ўласных назіранняў).

2. Вылучэнне вучнямі пры дапамозе настаўніка вобразаў твора. Чытанне настаўнікам верша з выразнымі лагічнымі націскамі на лексічных састаўляючых вобразаў верша, з якімі далей будзе праводзіцца праца. Пры гэтым варта лагічна падкрэсліваць не ўсе вобразы верша, а толькі тыя, на характарыстыцы якіх можна засяродзіцца найбольш эфектыўна ў пятым класе, не заглыбляючыся ў тэорыю літаратуры (першая страфа: *вечар*, *снег*; другая страфа: *бярозы*, *зоркі*; трэцяя страфа: *месяц*; чацвёртая страфа: *бары і гоні*). Заданні для вучняў: а) у працэсе чытання падкрэсліць алоўкам (дзвюма лініямі) у падрыхтаваных вучнямі ксеракопіях верша тыя вобразы, на якіх настаўнік зрабіў лагічны націск, – агучваецца перад чытаннем верша настаўнікам; б) пасля чытання верша назваць вобразы, інтанацыйна вылучаныя настаўнікам.

3. Вызначэнне аўтарскіх характарыстык (для гэтага этапу працы найбольш прыдатны такі тэрмін) у папярэдне вылучаных вобразах. Натуральна, што пяцікласнікі яшчэ не здольныя ўсвядоміць вобразную аб’ёмнасць гэтага твора. Таму мэтазгодна звяртаць увагу толькі на тыя з вобразных характарыстык, сутнасць якіх вучні гэтага ўзросту здольныя зразумець. Сэнс жа іншых настаўнік пры неабходнасці (калі вучні, магчыма, зададуць пытанні) толькі растлумачыць.

- Перад чытаннем верша настаўнікам на гэтым этапе мэтазгодна агучыць заданне для вучняў: алоўкам падкрэсліць (адной лініяй) вобразныя характарыстыкі, на якіх будуць зроблены лагічныя націскі. Пры гэ-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

тым варта звярнуць увагу вучняў на тое, што пры выкананні дамашняга задання і на наступным уроку яны яшчэ раз звернуцца да асэнсавання некаторых з гэтых вобразаў.

➢ Далей настаўнік чытае строфы верша, робячы лагічныя націскі на характарыстыках да вылучаных раней вобразаў (*Здароў,* ||[3] *марозны, звонкі* ***вечар****!* || *Здароў, скрыпучы мяккі* ***снег****!* || Мяцель не вее, || сціхнуў вецер,|| І волен || лёгкіх санак бег. |||[4] *Як мары,* || *белыя* ***бярозы*** *Пад сінявой начной стаяць,* || *У небе* || ***зоркі****,* || *ад марозу Пахаладзеўшыя,* || *дрыжаць.* ||| *Вільготны* ***месяц*** || *стуль на поле Празрысты, светлы стоўп спусціў* || *І рызай срэбнаю* || *раздолле Снягоў сінеючых* || *пакрыў.* ||| *Узрывайце ж іх санямі, коні!* || *Звіні, вясёлых бомаў медзь!* || *Вакол лятуць* ***бары і гоні****,* || *У грудзях* || *пачала кроў кіпець*[5]).

➢ Пасля чытання кожнай страфы вучням прапаноўваецца агучыць вылучаныя настаўнікам пры дапамозе лагічных націскаў характарыстыкі вобразаў.

➢ Далей можна прапанаваць вылучыць каляровымі алоўкамі вобразы і іх характарыстыкі. Пры гэтым важна зарыентаваць пяцікласнікаў, каб яны падбіралі колеры адпаведна іх уяўленням пра вобраз і яго характарыстыкі, а таксама на падставе ўласных назіранняў за прыродай у зімовы час.

Гэтая і вышэй названыя формы працы з вершаваным тэкстам спрыяюць абуджэнню вобразнага яго ўспрыняцця, запамінанню влучаныхы вобразаў, што, у сваю чаргу, будзе садзейнічаць больш эфектыўнаму завучванню дадзенага тэксту і выразнаму яго чытанню на памяць.

4. Суаднясенне вылучаных раней вобразных характарыстык з адпаведнымі з’явамі з рэчаіснасці, якія спрыялі іх узнікненню. Перад гэтым варта зрабіць невялікі ўступ аб асаблівасцях стварэння паэтычнага вобраза на падставе назіранняў, эмоцый, асацыяцый, мысленчых вобразаў аўтара. Названае вышэй суаднясенне праводзіцца на аснове гутаркі з вучнямі адносна таго, што ў рэчаіснасці азначаюць вылучаныя характарыстыкі вобразаў.

5. Характарыстыка вобразаў верша, уражанняў, эмоцый, якія яны выклікаюць. Здзяйсняецца адразу пасля праведзенага суаднясення вобразных характарыстык кожнай асобнай страфы з адпаведнымі з’явамі з рэчаіснасці.

6. Вывады настаўніка адносна сэнсавай шырыні верша М. Багдановіча “Зімой”.

[3] Знак паўзы пры чытанні.
[4] Знак паўзы паміж страфамі.
[5] Прапанаваная тут партытура прыдатная найбольш для гэтай формы працы. На этапе ж фінальнага чытання верша настаўнік можа карыстацца іншай партытурай. На адпаведны тып выразнага ўзнаўлення верша па памяці мэтазгодна зарыентаваць вучняў у адпаведнасці з узорам фінальнага чытання верша, агучанага настаўнікам.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

7. Выразнае чытанне верша настаўнікам з мэтай яшчэ раз інтанацыйна падкрэсліць вобразы верша, прадэманстраваць сістэму паўз, перадаць настрой твора з дапамогай адпаведнага тэмбру голасу. У дадзеным выпадку (у адрозненне ад чытання ў адпаведнасці з прапанаванай раней партытурай, якое было абумоўлена адпаведнымі дыдактычнымі мэтамі) гэтае чытанне павінна арыентаваць вучняў на пэўны ўзор выразнага ўзнаўлення верша на памяць, пасільнага для пяцікласнікаў.

8. Тлумачэнне дамашняга задання: падрыхтоўка адказаў на пытанні да верша "Зімой", падрыхтоўка выразнага чытання верша на памяць. Пры гэтым варта зарыентаваць вучняў на зрокавае ўзнаўленне вобразаў верша пры завучванні яго на памяць; дапамогуць гэта здзейсніць зробленыя на ўроку каляровыя графічныя вылучэнні гэтых вобразаў і іх характарыстыка. Вельмі важна звярнуць увагу пяцікласнікаў на неабходнасць выразнага і ўзнёслага завучвання на памяць дадзенага верша.

***Другі ўрок. Вершы Максіма Багдановіча "Зімой" і Анатоля Грачанікава "Зоры спяваюць": параўнальны аналіз (1 гадзіна)*** [3].

Адна з мэтаў гэтага ўрока – "*выпрацоўваць уменне супастаўляць пейзажныя вершы розных аўтараў*" [2]. Дасягненню такой мэты могуць спрыяць наступныя формы працы і адпаведны ім змест.

1. Тлумачэнне дамашняга задання. Яго варта агучыць у пачатку ўрока, каб гэтым самым падключыць прагматычныя памкненні пяцікласнікаў і адначасова зарыентаваць вучняў на больш эфектыўную працу на ўроку, вынікі якой спатрэбяцца ім у бліжэйшы час. Сутнасць задання: скласці "*вусную замалёўку пра зімовы вечар*" [2] на падставе прааналізаваных на мінулым і гэтым уроках літаратурных вобразаў з вершаў М. Багдановіча і А. Грачанікава, рэпрадукцыі з карціны Э. Рымаровіча "Раўбічы" і ўласных назіранняў. Паколькі дзецям гэтага ўзросту падабаецца пераймаць дарослых, то можна ім прапанаваць зрабіць у літаратурным сшытку невялікі дзённік назіранняў за выбраным аб'ектам ці з'явай прыроды ў зімовы вечар. Пры гэтым важна падказаць дзецям, што ў час назіранняў яны могуць адчуць сябе мастаком ці паэтам, могуць працаваць разам са сваімі сябрамі, гуляючы, напрыклад, у "пленэр" жывапісцаў альбо фотамастакоў. Пры гэтым пяцікласнікі могуць прапанаваць бацькам падключыцца да такіх "пленэраў" у якасці іх удзельнікаў, спонсараў, арганізатараў. Варта таксама звярнуць увагу на тое, што праца кожнага са старанных вучняў, іх клапатлівых бацькоў будзе ацэнена настаўнікам не толькі на наступным уроку, а і, калі пяцікласнікі пажадаюць, на літаратурным ранішніку "Мой зімовы вечар", на якім вучні-мастакі не толькі прачытаюць свае вусныя замалёўкі, а і падмацуюць іх фотаздымкамі ці малюнкамі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. Адказы на пытанні №№ 1-5 [1, с. 140] вучэбнага дапаможніка па вершы М. Багдановіча “Зімой”. Паколькі з прапанаванымі ў пытаннях вобразамі адбывалася праца на мінулым уроку, а таксама іх характарыстыку пяцікласнікі рыхтавалі дома перад завучваннем верша на памяць, то на дадзеным этапе мэтазгодна засяродзіцца на адказах на пытанні пасля выразнага чытання верша на памяць кожным асобным вучнем. Пры гэтым варта ўлічваць узровень падрыхтаванасці пяцікласніка і ў залежнасці ад гэтага адпаведным чынам фармуляваць пытанне. Такая форма працы на гэтым і наступных (падобных паводле навучальных задач) уроках спрыяе не механічнаму, а асэнсаванаму завучванню верша на памяць у кантэксце рацыянальна сфармуляванага настаўнікам дамашняга задання на мінулым уроку.

3. Характарыстыка верша А. Грачанікава “Зоры спяваюць”. У дадзеным выпадку мэтазгодна правесці такую працу ў той паслядоўнасці форм і зместу, якія выкарыстоўваліся пры характарыстыцы верша “Зімой” Б. Багдановіча. Гэта дазволіць зэканоміць час на асэнсаванне вучнямі сутнасці заданняў і іх тлумачэнне, бо алгарытмы такой працы пяцікласнікам ужо знаёмыя.

- Чытанне настаўнікам твора, вылучэнне разам з вучнямі галоўнага вобраза (зоры) і яго разгорнутых характарыстык.
- Адказы на пытанні №№ 1-3 [2, с. 141-142] да верша. Такая форма працы, акрамя іншага, можа быць адначасова і паралельным назапашваннем ведаў, неабходных для стварэння вучнямі вуснай замалёўкі пра зімовы вечар, падрыхтоўчую працу да якой мэтазгодна праводзіць на гэтым уроку. Варта звярнуць увагу вучняў на тое, што аб’екты і з’явы прыроды могуць “гучаць” у свядомасці таго, хто за імі назірае. Дзеля гэтага варта актывізаваць фантазію, уключыць вобразнае мысленне, настроіць сябе на ўзнёслы лад. Інакш кажучы, аналізуючы дадзены верш А. Грачанікава, варта падводзіць вучняў да такога паняцця, як натхненне, без якога немагчыма стварэнне вобразных, цікавых, нераканальных слоўных карцін прыроды.

4. Кароткая параўнальная характарыстыка вершаў “Зімой” М. Багдановіча і “Зоры спяваюць” А. Грачанікава ў кантэксце пытання № 4 да апошняга з іх [2, с. 142]. Такая характарыстыка найперш накіравана на высвятленне асаблівасцей адлюстравання пры дапамозе “*сродкаў моўнай выразнасці*” [2, с. 142] пачуццяў, настрою, агульнага эмацыйнага стану лірычнага героя М. Багдановіча і аўтара-назіральнака з верша А. Грачанікава. Важна пры гэтым зарыентаваць вучняў на вызначэнне месца назірання лірычнага героя М. Багдановіча і аўтара-назіральнака з верша А. Грачанікава за прыроднымі аб’ектамі, на тое, як гэта адбіваецца на выніках іх назіранняў. Такая форма працы з’яўляецца

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

своеасаблівым падрыхтоўчым этапам да стварэння пяцікласнікамі вуснай замалёўкі пра зімовы вечар.

5. Падрыхтоўка вучняў да стварэння імі вуснай замалёўкі ў адпаведнасці з дамашнім заданнем да наступнага ўрока. Такая форма працы, на наш погляд, акрамя іншага, спрыяе фарміраванню ў пяцікласнікаў уменняў вуснага творчага вобразнага выказвання, а таксама выхаванню імкнення да сістэмнасці працы ў працэсе падрыхтоўкі да выканання творчых работ ужо (на перспектыву) у кантэксце ўрокаў па развіцці маўлення.

➢ Абмеркаванне зместу замалёўкі ў залежнасці ад ўзроўню падрыхтаванасці вучняў і магчымасцей назірання імі таго ці іншага прыроднага аб'екта (замерзлай без снегу рэчкі, засыпанага снегам на фоне заходзячага сонца дрэва, кустоў з апалым падмерзлым лісцем пад імі, вячэрняга зорнага неба і інш.), з'явы (зімовага снежным марозным вечарам заходу сонца, першага снегападу ў марозны ці сыры вечар і інш.). Важна пры гэтым падказаць вучням, што змест замалёўкі аднаго і таго ж аб'екта ці з'явы будзе залежыць ад таго, дзе знаходзіцца яе аўтар: побач ці здалёк ён здзяйсняе свае назіранні.

➢ Вызначэнне формы замалёўкі: а) апісанне аб'екта, з'явы на фоне рэальнага надвор'я як вынік спецыяльна зробленага назірання; б) узнаўленне аб'екта, з'явы у форме ўспаміну пра ранейшыя несапланаваныя (нязмушаныя) назіранні і ўражанні.

➢ Вызначэнне магчымага месцазнаходжання аўтара замалёўкі (у цэнтры з'явы, каля аб'екта, збоку, удалечыні ад з'явы ці аб'екта) і вынікаў назірання на адлегласці альбо зблізку.

➢ Абмеркаванне рэпрадукцыі з карціны Э. Рымаровіча "Раўбічы", змешчанай у вучэбным дапаможніку для 5-га класа ў адпаведнасці з пытаннямі пункта № 7 да верша "Зімой" М. Багдановіча [2, с. 140]. Пасля адказу на пытанні варта звярнуцца да вызначэння месцазнаходжання аўтара карціны і выніку такой пазіцыі назірання (назіранне здалёк; яно дазваляе бачыць і ўзнаўляць аб'ёмна, рэльефна, шматгранна карціну прыроды, перадаваць яе рознымі колерамі, адценнямі гэтых колераў, сукупнасцю вобразаў: дрэвы – іх вяршаліны, цэлыя, адзінокія, хвойныя і ліственныя, астравы дрэў і інш.; рэльеф мясцовасці – пагоркі, нізіны; неба – бязвоблачнае, разарванае воблакамі, высокае, нізкае).

➢ Агучванне настаўнікам змадэляванага ім працэсу яго падрыхтоўкі да стварэння замалёўкі пра зімовы вечар і зместу гэтай замалёўкі (напрыклад, назіранне заходу сонца ў бясснежны зімовы вечар, падгледжаны з акна цягніка, калі хмары здаваліся гарамі, а чырванаваты колер неба перад імі чароўнай вадой у зачараваным вялікім возеры). Пры гэтым агучаную настаўнікам замалёўку можна праілюстраваць фотаздымкамі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Такім чынам настаўнік уключаецца працэс сутворчасці, а гэта вельмі важна для вучняў.

6. Абагульненні і вывады па ўроку. Акрамя агульнапрынятых вывадаў, заўваг, ацэнак, на дадзеным этапе варта яшчэ раз звярнуць увагу вучняў на тое, што праца на гэтых двух уроках мела на мэце не толькі характарыстыку прааналізаваных твораў і падрыхтоўку вучняў да выканання дамашняга задання, а і выпрацоўку ў пяцікласнікаў умення суадносіць мастацкія вобразы са з'явамі, прадметамі рэчаіснасці, якія леглі ў іх аснову. Гэта спрыяе, з аднаго боку, разуменню сэнсу мастацкага вобраза, з другога, стварэнню вобразаў, іх разгорнутых характарыстык на падставе ўласных назіранняў вучняў. Апошняе ж у сваю чаргу дапаможа вучням ствараць у іх мысленчых і рэальных разважаннях, выказваннях, у будучых творчых работах арыгінальныя вобразныя сведчанні, пацвярджэнні, заключэнні.

Такім чынам, прапанаваныя і ахарактарызаваныя вышэй формы дзейнасці настаўніка і вучняў, іх змест у кантэксце СПЛ – гэта адзін з першых этапаў працы з літаратурнымі вобразамі паэтычнага твора, зарыентаванай на выпрацоўку ў школьнікаў устаноўкавага назапашвання ўменняў, якія спатрэбяцца ў далейшым для эфектыўнага выканання адпаведных заданняў і ў кантэксце урокаў па развіцці маўлення. Акрамя гэтага, значэнне дадзеных форм, зместу і сістэмнасці ў тым, што ўжо ў пятым класе яны арыентуюць вучняў на рацыянальную арганізацыю працы на бліжэйшую перспектыву і нязмушанае накапленне ўменняў на больш далёкую перспектыву.

Літаратура

1. *Цітова, Л.К.* Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 5-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання: у 2 ч. Ч. 1. / Л.К. Цітова. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2009. – С. 142.

2. Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне па вучэбным прадмеце "Беларуская літаратура" на 2010/2011 навучальны год (V клас агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання) // http://www.adu.by/modules.php?name=News&file=article&sid=6603. Дата доступу 09.03.2011

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## *Дадатак № 4*

# Творы беларускай дзіцячай літаратуры ў кантэксце ўрокаў пазакласнага чытання і развіцця маўлення ў пятым класе (агульнаметадычны аспект)

## Тэарэтычны аспект

На сучасным этапе выкладання літаратуры ў сярэдняй школе важным фактарам з'яўляецца арганізацыя працы настаўніка і вучняў па сістэме перспектыўных ліній. Галоўныя мэты навучальнага характару пры гэтым наступныя. Фарміраванне ўменняў успрыняцця і ацэнкі:

**a.** мастацкага вобраза ў кантэксце адпаведнага твора – *бліжняя перспектыва*;

**b.** твора пісьменніка ў межах яго творчай спадчыны – *сярэдняя перспектыва*;

**c.** мастацкага твора, спадчыны пісьменніка і нацыянальнай літаратуры ва ўзаемасувязі літаратурных праяў – *дальняя перспектыва*.

У сувязі з гэтым павінна адбывацца паэтапнае фарміраванне уменняў і назапашванне ведаў для здзяйснення вучнямі адпаведных відаў дзейнасці пры падрыхтоўцы іх да выканання розных форм працы. Прычым гэтыя формы працы, алгарытмы іх выканання мэтазгодна паступова ўскладняць.

Пры гэтым важна, каб вучні выразна ўсведамлялі, на якім этапе іх навучання, у якіх відах, формах дзейнасці спатрэбіцца тое, чым яны займаюцца пры падрыхтоўцы да таго ці іншага ўрока, пры выкананні заданняў на адпаведных уроках.

Усведамленне школьнікамі бліжэйшых, сярэдніх і дальніх перспектыў іх вучэбнай дзейнасці дазваляе больш рацыянальна, эфектыўна наладжваць тыя ці іншыя формы іх працы, не паўтараючы некаторыя іх этапы, вызваляючы пры гэтым час і (галоўнае!) адпаведны запас энергіі – разумовай, фізічнай – на здзяйсненне планаў творчага характару. Рацыянальна арганізаваная інтэлектуальная дзейнасць спрыяе назапашванню не толькі фактычнай інфармацыі пэўнага кшталту, паступоваму фарміраванню ўменняў і навыкаў адпаведнай скіраванасці, але і спрыяе ўзнікненню ў суб'екта такой дзейнасці ўпэўненасці ў сваіх сілах, жадання творчага прымянення назапашаных ведаў і навыкаў.

Паколькі ў сістэме літаратурнай адукацыі пяты клас з'яўляецца пераходным этапам ад пачатковага навучання (літаратурнае чытанне) да сярэдняга (літаратурнае навучанне), то вельмі важна з самага пачатку яго здзяйснення вучыць вучняў рацыянальнай арганізацыі працы з выхадам на развіццё іх творчых здольнасцей. Важна пры гэтым пастаянна

арыентаваць школьнікаў на тое, калі, у якіх формах, відах дзейнасці спатрэбяцца ім вынікі іх працы. Такі падыход павінен быць сістэмным. У сувязі з гэтым звернемся да характарыстыкі наступных аспектаў з улікам сістэмы перспектыўных ліній: а) выбар форм навучальнай і творчай дзейнасці вучняў, выбар твораў для пазакласнага чытання; б) асаблівасці арганізацыі і правядзення ўрокаў па развіцці маўлення і пазакласнага чытання: канкрэтныя мэты, змест, віды дзейнасці настаўніка і вучняў.

**Практычны аспект**

“Вучэбная праграма для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Беларуская літаратура. V–XI класы” вызначае толькі колькасць гадзін на ўрокі па развіцці маўлення і “*прыкладны спіс твораў для пазакласнага чытання*”, асноўны ж змест гэтых урокаў не акрэсліваецца.

“Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне па вучэбным прадмеце “Беларуская літаратура”<…> (V клас агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання)” не прапаноўвае канкрэтныя формы творчай дзейнасці вучняў на ўроках па развіцці маўлення (даюцца рэкамендацыйныя парады адносна гэтых формаў). Што тычыцца вызначэння твораў для ўрокаў пазакласнага чытання, то яно ўвогуле адсутнічае; паколькі “Вучэбная праграма…” такое вызначэнне адсылае настаўніку: “*на выбар*”. Пры гэтым варта звярнуць увагу на тое, што “Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне…” вызначае і паслядоўнасць: спачатку ідуць урокі па развіцці маўлення, а потым урокі пазакласнага чытання. Акрамя гэтага, у адносінах да ўрокаў пазакласнага чытання ў “Прыкладным каляндарна-тэматычнаым планаванні…” назіраецца некаторая супярэчнасць: іх паслядоўнасць, далучэнне да адпаведнага зместу “Вучэбнай праграмы…” можна характарызаваць як механічныя (адносна раўнамернае размеркаванне па чвэрцях), бо не ўлічваецца пры гэтым тэматычны, праблемны, тэарэтычны кантэкст твораў для абавязковага вывучэння. Варта было б пры гэтым вызначыць у “Прыкладным каляндарна-тэматычным планаванні…” пералік твораў для кожнага з чатырох урокаў пазакласнага чытання з улікам тэматыкі, праблематыкі, вобразаў твораў для абавязковага чытання і твораў для ўрокаў пазакласнага чытання.

Рэкамендацыйны характар гэтых частак як “Вучэбнай праграмы…”, так і “Прыкладнага каляндарна-тэматычнага планавання…”, з аднаго боку, спрыяе творчаму падыходу настаўніка да арганізацыі адпаведных урокаў, з другога, садзейнічае парушэнню сістэмнасці пры іх планаванні і правядзенні, бо настаўнік у такіх умовах “творчай самастойнасці” аказ-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ваецца дастаткова часта непадрыхтаваным для паспяховай працы. Болей за тое, як паказвае практыка, настаўнікі дастаткова часта фармальна падыходзяць да правядзення ўрокаў па развіцці маўлення, а ўрокаў пазакласнага чытання і зусім пазбягаюць, матывуючы гэта рознымі прычынамі.

У сувязі з акрэсленым вышэй прапануем адзін з магчымых варыянтаў перспектыўнага плавання ўрокаў па развіцці маўлення і пазакласным чытанні. Пры гэтым заўважым, што зыходнай метадычнай тэзай тут з'яўляецца наступная. Такія ўрокі павінны, акрамя іншага, выхоўваць у вучняў творчы падыход да выказвання сваіх думак, поглядаў, доказаў, вывадаў. Вучэбны працэс і яго вынікі на дадзеным этапе павінны спрыяць фарміраванню ў школьнікаў псіхалагічнай устаноўкі на творчы падыход да маўлення, да самастойнага ўспрыняцця літаратурнага тэксту і яго ацэнкі. Ад таго, наколькі паспяхова будзе дасягнутая гэтая задача, залежыць тое, ці захочуць вучні ў далейшым творча падыходзіць да такіх відаў дзейнасці. Тут важна фарміраваць пазітыўныя іх адносіны да творчай дзейнасці, не перакрэсліць (ні кепскай адзнакай, ні неабачлівай ацэнкай, ні выбарам неадпаведных узроўню падрыхтаванасці вучняў форм працы) іх жаданне самавыявіцца.

Паколькі і ўрокі пазакласнага чытання і ўрокі па развіцці маўлення, маюць на мэце фарміраванне творчых здольнасцей вучняў, то, *па-першае*, іх неабходна праводзіць у пятым класе чатырма "*парамі*" (1-на + 1-на гадзіна): урок пазакласнага чытання – адразу пасля яго урок па развіцці маўлення (як гэта прапанавана "Прыкладным каляндарна-тэматычным планаваннем…" у адносінах да урокаў №№ 64, 65 [3]). Такая паслядоўнасць гэтых урокаў у падабенстве зместу форм дзейнасці вучняў на іх утварае своеасаблівы *блок творчых урокаў*. "*Пары*" гэтых *блокаў*, паводле форм працы, іх зместу, тэматычнай скіраванасці твораў, павінны цесна быць злучаны з раздзеламі, у кантэксце якіх праводзяцца. Адпаведныя формы дзейнасці вучняў у межах гэтых *блокаў*, па-першае, садзейнічаюць падрыхтоўцы школьнікаў да больш эфектыўнай іх дзейнасці пры выкананні заданняў да ўрокаў па развіцці маўлення, па-другое, больш эфектыўным падагульненням, ілюстрацыям да папярэдне вывучанага матэрыялу тых раздзелаў, пасля якіх праводзяцца "*пары*" (урок пазакласнага чытання + урок развіцця маўлення).

Перспектыўнае планаванне ўрокаў пазакласнага чытання і ўрокаў па развіцці маўлення мэтазгодна здзяйсняць у наступнай паслядоўнасці.

1. Выбар літаратурных твораў з "Вучэбнай праграмы…". Тут важна, каб яны тэматычна пераклікаліся з творамі, якія вывучаюцца абавязкова ў адпаведных раздзелах. Для ўрокаў пазакласнага чытання ў пятым класе прапануем наступныя творы: У. Дубоўка "Як сінячок да сонца лётаў",

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Я. Брыль. “Цюцік”, К. Каганец. “Скрыпач і ваўкі”, У. Караткевіч. “Чортаў скарб”.

2. Выбар тэмаў для ўрокаў па развіцці мовы з “Прыкладнага каляндарна-тэматычнага планавання…”. Прапануем наступныя: а) вуснае выказванне на тэму “Мой родны кут, як ты мне мілы!”, б) абагульняльны ўрок-конкурс (расказванне вучнем складзенай ім казкі), в) вусная замалёўка на падставе ўласных назіранняў за прыроднымі з’явамі, д) разгорнуты адказ на пытанне з элементамі характарыстыкі літаратурнага героя па адным з вывучаных твораў. Урокі па гэтых тэмах у далейшым пры каляндарным планаванні можна гарманічна аб’яднаць з урокамі пазакласнага чытання дзеля ўтварэння “пар” (урок пазакласнага чытання + урок развіцця маўлення*)*, адпаведных тэматыцы раздзелаў.

3. Вызначэнне *блока творчых урокаў.* У сувязі з акрэсленым вышэй прапануем адзін з яго варыянтаў з улікам мэтаў і задач урокаў, вызначаных “Прыкладным каляндарна-тэматычным планаваннем…” (гл. табліцу, прапанаваную ніжэй).

4. Вызначэнне алгартымаў працы настаўніка і вучняў на перспектыву: час і форма аб’яўлення заданняў на перспектыву, формы падрыхтоўкі да ўрокаў пазакласнага чытання і развіцця маўлення, перспектывы канкрэтных форм працы на ўроках, пры выкананні дамашніх заданняў у кантэксце творчага выхаду на ўрокі пазакласнага чытання і развіцця маўлення.

**Навучальная сувязь урокаў па абавязковым вывучэнні твораў з урокамі пазакласнага чытання і развіцця маўлення (5 клас)**

| ***Першы блок (пасля раздзела падручніка “Мой чароўны беларускі край…”)*: 6-7 урокі** | |
|---|---|
| **Урок па вывучэнні твораў, вызначаных “Вучэбнай праграмай…”** | ***УПЧ: У. Дубоўка “Як сінячок да сонца лётаў”<br>УРМ: Вуснае выказванне на тэму “Мой родны кут, як ты мне мілы!”*[6]** |
| *Ур. 2, П. Броўка. “Калі ласка”*: вучыць выяўляць пачуцці і думкі, адлюстраваныя ў паэтычным тэксце: гонар за высокія маральныя якасці; характарызаваць меладычнасць, трапнасць і выразнасць роднай мовы. | *УПЧ*: вучыць самастойна вызначаць у гэтым творы вобразнае адлюстраванне пачуццяў і памкненняў птушак: спагадлівасць, добразычлівасць, нядобразычлівасць, справядлівасць, удзячнасць.<br>*УРМ*: фарміраваць уменні вобразнага і трапнага выказвання. |

[6] Магчымы варыянт гэтай тэмы ў адпаведнасці з “Прыкладным каляндарна-тэматычным планаваннем…” – *Прырода майго краю: яна выклікае ў мяне захапленне!* Агульная мэта гэтага ўрока развіцця маўлення, паводле названай вышэй крыніцы, абагульніць і сістэматызаваць веды і ўменні, набытыя пяцікласнікамі пры вывучэнні раздзела падручніка “Мой чароўны беларускі край…”.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

| | |
|---|---|
| *Ур. 4, У. Караткевіч. “Бацькаўшчына”*: развіваць вобразнае ўяўленне пры ўспрыманні мастацкага апісання прыроды; вучыць выяўляць вобразы і сродкі адлюстравання аўтарскіх пачуццяў, перажыванняў; развіваць вобразнае ўяўленне вучняў пры ўспрыманні мастацкага апісання прыроды; удасканальваць ўменні ўзнаўляць карціны і вобразы, створаныя пісьменнікам. | *УПЧ*: вучыць вылучэнню паказальных знешніх прыкмет птушак на падставе вобразных сродкаў, мастацкага тэксту (зварот да гэтых элементаў твора садзейнічае выпрацоўцы ўмення фармуляваць выказванне з элементамі апісання). *УРМ*: фарміраваць уменні выкарыстання ў вусным выказванні прыкладаў з мастацкіх твораў, у якіх заключаецца іх галоўная думка; выказвання вучнямі ўласных пачуццяў, якія з’явіліся пры ўспрыманні карцін прыроды ў рэальным жыцці, фармулёўкі галоўнай думкі выказвання, выкарыстання ў вусным выказванні-разважанні прыкладаў з твора, які раней характарызаваўся (разважанне аб самаахвярнасці сінячка, удзячнасці птушак). |
| *Ур. 4, А. Грачанікаў. “Дрымотна ціснуцца кусты…”; Я. Крупенька. “Ёсць у кожнага з нас…”*: фарміраванне ўяўлення пра мастацкі вобраз. | *УРМ*: вучыць захаванню ў пераказе эпізодаў твора адпаведных вобразных сродкаў (вобразы сінячка, пугача могуць быць выкарыстаны ў якасці прыкладаў у вусных выказваннях вучняў); фарміраваць ўменні вуснага выказвання з элементамі апісання і разважання. |
| ***Другі блок (пасля раздзела падручніка “За смугою стагоддзяў”) 19-20 урокі*** | |
| **Урок па вывучэнні твораў, вызначаных “Вучэбнай праграмай…”** | ***УПЧ: У. Караткевіч “Чортаў скарб”. УРМ: Абагульняльны ўрок-конкурс па раздзеле падручніка***[7] |
| *Ур. 7, Беларускія народныя казкі, іх віды і жанравыя адметнасці:* пазнаёміць з відамі народных казак, у прыватнасці, з чарадзейнымі; вучыць разумець асноўны канфлікт казкі, выдзяляць эпізоды, важныя для характарыстыкі казачных герояў. | *УПЧ*: вучыць вызначаць від дадзенай казкі, будаваць магчымы яе працяг у выглядзе асобных чарадзейных эпізодаў, вызначаць асаблівасці вырашэння канфлікту ў казцы, вылучаць адпаведныя эпізоды-характарыстыкі ў “Чортавым скарбе”. *УРМ*: фарміраваць уменні пабудовы канфлікту ва ўласна складзенай казцы і на яго аснове будаваць развіццё дзеяння ў невялікіх казачных эпізодах, звяртацца да непасрэдных характарыстык дзеючых асоб у складзенай вучнямі казцы. |

[7] Форма ўдзелу ў конкурсе – *расказванне складзенай вучнем казкі.*

| | |
|---|---|
| *Ур. 8, Чарадзейная казка “Залаты птах”:* вучыць вылучаць у літаратурнай казцы эпізоды, важныя для характарыстыкі казачных герояў, аналізу паводзін казачных персанажаў паводле выяўлення маральных каштоўнасцей, аналізаваць адметнасці будовы казкі, выяўляць элементы чарадзейнага ў ёй. | *УПЧ*: вучыць вызначэнню рысаў характару казачных персанажаў у “Чортавым скарбе”, аналізаваць будову гэтай казкі і выяўляць элементы чарадзейнага ў ёй. *УРМ*: вучыць вызначаць маральныя якасці казачных персанажаў, пра якіх вучні будуць апавядаць у складзенай імі казцы. |
| *Ур. 10, Казкі пра жывёл “Музыкі” і “Воўк і сабака”*: абагульніць веды вучняў пра жанравыя адметнасці казак. | *УПЧ*: вучыць вызначаць жанравыя адметнасці казкі “Чортаў скарб”. *УРМ*: фарміраваць уменні складаць казачныя эпізоды, казкі паводле задуманага сюжэту, выбраных казачных персанажаў і іх маральных якасцей. |
| ***Трэці блок (пасля раздзела падручніка “Казка ў жыцці падказка”) 40-41 урокі*** | |
| **Урок па вывучэнні твораў, вызначаных “Вучэбнай праграмай…”** | ***УПЧ: К. Каганец “Скрыпач і ваўкі”. УРМ: Вусная замалёўка на падставе ўласных назіранняў за прыроднымі з’явамі*** |
| *Ур. 22, Я. Колас. “Крыніца”*: удасканальваць уменні вучняў па раскрыцці аўтарскага погляду на падзеі жыцця і на саміх герояў, іх паводзіны, перакананні. *Ур. 25, У. Караткевіч. Нямоглы бацька”*: спрыяць спасціжэнню вучнямі аўтарскай пазіцыі. | *УПЧ*: вучыць выяўляць аўтарскі погляд (фінал казкі К. Каганца “Скрыпач і ваўкі”). *УРМ*: фарміраваць уменні выказваць уласны погляд, уражанні адносна з’яў прыроды на падставе асабістых назіранняў. |
| *Ур. 23, Я. Колас. “Крыніца”*: развіваць уменне дзяліць твор на сэнсавыя часткі, складаць план. | *УПЧ*: развіваць уменне пераказваць мастацкі тэкст на падставе складзенага плана. *УРМ*: фарміраваць уменні перадаваць уласныя назіранні ў адпаведнасці з заданнямі назіранняў і планам замалёўкі. |
| *Ур. 29, А. Федарэнка. “Падслуханая казка”*: фарміраваць уменні вызначэння мастацкіх апісанняў прыроды, часу і месца дзеяння. | *УПЧ*: вучыць вызначаць час, месца дзеяння, характарызаваць паслядоўнасць дзеяння. *УРМ*: вучыць назіраць за прыроднымі з’явамі, заўважаць у прыродзе адметныя яе праявы (дэталі). |

| | |
|---|---|
| *Ур. 31, М. Багдановіч. “Зімой”*: развіваць вобразнае ўяўленне вучняў, здольнасць “бачыць” карціны прыроды. | *УПЧ*: вучыць характарызаваць прыродную прастору, у якой развіваецца дзеянне твора. УРМ: вучыць маляваць словамі цэласную карціну пэўнай прыроднай прасторы. |
| *Ур. 33, Я. Колас. “Песня ляснога жаваранка”*: вучыць бачыць сувязь апісанняў прыроды з настроем і характарам чалавека, спрыяць спасціжэнню імі ролі эпітэтаў у мастацкім тэксце. | *УПЧ*: фарміраваць уменні выяўлення ў казцы адчуванняў яе герояў і характарыстыкі іх пры дапамозе вобразных сродкаў. *УРМ*: вучыць заўважаць у прыродзе падрабязнасці і дэталі, вобразна характарызаваць іх пры дапамозе эпітэтаў. |
| ***Чацвёрты блок (пасля раздзела падручніка “Сцежкамі дзяцінства”) 64-65 урокі*** | |
| **Урок па вывучэнні твораў, вызначаных “Вучэбнай праграмай…”** | ***УПЧ: Я. Брыль “Цюцік”. УРМ: Разгорнуты адказ на пытанне з элементамі характарыстыкі літаратурнага героя па адным з вывучаных твораў***[8] |
| *Ур. 45, Я. Колас. “У старых дубах”*: удасканальваць уменні характарызаваць героя па яго ўчынках, паводзінах, думках, перажываннях, параўноўваць характары і паводзіны герояў у межах аднаго твора, рабіць высно-вы абгрунтоўваць свае ацэнкі. | *УПЧ*: вучыць вызначаць ключавыя эпізоды, у якіх раскрываюцца адносіны герояў апавядання да сабачкі з улікам паводзін апошняга. УРМ: фарміраваць уменні рабіць падагульненні пра літаратурнага героя, вызначэння спосабаў яго характарыстык у мастацкім творы. |
| *Ур. 51, А. Кудравец. “Цітаўкі”*: вучыць вызначаць ключавыя эпізоды, важныя для характарыстыкі герояў, асэнсоўваць этапы развіцця дзеяння, акрэсліваць ланцужок падзей. *Ур. 56, Г. Далідовіч “Страта”*: вучыць вылучаць эпізоды, важныя для характарыстыкі персанажаў. | *УПЧ*: вучыць характарызаваць учынкі розных літаратурных герояў “Цюціка” да сабачкі. УРМ: фарміраваць уменні вылучаць галоўнае ў паводзінах літаратурнага героя. |
| *Ур. 52, А. Кудравец. “Цітаўкі”*: вучыць падсумоўваць назіранні за паводзінамі герояў, звяртаючы ўвагу на раскрыццё душэўнага стану персанажаў. | *УПЧ*: вучыць характарызаваць душэўны стан літаратурных герояў (дзяцей) у сувязі з адносінамі дарослых да сабачкі. УРМ: фарміраваць уменні даваць ацэнкі літаратурнаму герою ў адпаведнасці з яго ўчынкамі і перажываннямі. |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

[8] Пытанні для ўрока развіцця маўлення пералічаны ў “Прыкладным каляндарна-тэматычным планаванні…”; выбіраем адно з іх дзеля ілюстрацыі: “Дружба Сяргея з Бурыкам” (У. Караткевіч “Былі ў мяне мядзведзі”).

| | |
|---|---|
| *Ур. 58, М. Лужанін. “Добры хлопец Дзік”*: вучыць характарызаваць стасункі паміж чалавекам і жывёлінай, каменціраваць паводзіны апошняй у розных сітуацыях.<br>*Ур. 61, У. Караткевіч. “Былі ў мяне мядзведзі”*: вучыць засяроджваць увагу на ўзаемаадносінах чалавека і жывёліны. | *УПЧ*: вучыць характарызаваць стасункі паміж літаратурнымі героямі ў кантэксце іх адносін да сабачкі.<br>УРМ: фарміраваць уменні падрыхтоўкі разгорнутага адказу на пастаўленае пытанне: сяброўства літаратурнага героя з жывёлінай. |
| *Ур. 61, У. Караткевіч. “Былі ў мяне мядзведзі”*: фарміраваць уменні вызначэння ідэі твора на падставе значэння вобраза Бурыка і гісторыі яго сяброўства з Сяргеем. | *УПЧ*: вучыць асэнсоўваць выхаваўчае значэнне твора на падставе засваення яго ідэі.<br>УРМ: фарміраваць уменні выказваць агульны вывад у адносінах да зробленай характарыстыкі Сяргея і Бурыка. |

Каляндарнае планаванне ўрокаў пазакласнага чытання і ўрокаў па развіцці маўлення ў сувязі з прыведзенымі вышэй прапановамі можа здзяйсняцца ўжо ў адпаведнасці з узроўнем падрыхтаванасці вучняў, творчымі іх здольнасцямі і інш.

Магчымымі формамі падрыхтоўчай працы да ўрокаў пазакласнага чытання і непасрэдна на гэтых уроках могуць быць тыя, якія прапанаваны М. Верціхоўскай у кантэксце падрыхтоўкі да ўрока і яго правядзення па творы А. Федарэнкі “Шчарбаты талер” [2, с. 127 – 167].

Этапы ж падрыхтоўкі да ўрокаў па развіцці мовы могуць быць наступнымі: а) аб’яўленне тэмаў і прыблізных да іх планаў у самым пачатку працы з адпаведным раздзелам падручніка (форма – друкаваная: на стэндзе ў кабінеце беларускай мовы і літаратуры, у выглядзе індывідуальных заданняў для вучняў з рознымі ўзроўнямі падрыхтаванасці); б) назапашванне фактаў, фарміраванне адпаведных уменняў (на перспектыву – УРМ, УПЧ) пры вывучэнні твораў для абавязковага чытання; на кожным уроку мэтазгодна здзяйсняць кароткі (прыблізна ў 5 хвілін) зварот да перспектыў выкарыстання назапашаных ведаў і ўменняў на адпаведных уроках развіцця маўлення і пазакласнага чытання; пры гэтым неабходна рабіць апорныя запісы ў літаратурных сшытках; в) невялікія творчыя дамашнія заданні, якія маюць на мэце перспектыўную падрыхтоўку да ўрокаў развіцця маўлення па адпаведных тэмах.

## Вывады

Такім чынам, прапанаваны тут этап працы ў сістэме перспектыўных ліній пры вывучэнні беларускай літаратуры ў пятым класе спрыяе

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

наступнаму: а) фарміраванню ўменняў аналізу мастацкага твора з паралельным паступовым назапашваннем неабходных ведаў не толькі для працы па вывучэнні іншых твораў з адпаведных раздзелаў падручніка, а і для будучага вывучэння твораў, вызначаных вучэбнай праграмай для пазакласнага чытання, б) фарміраванню адпаведных уменняў творчага выказвання вучняў у працэсе іх падрыхтоўкі да ўрокаў па развіцці маўлення і пры непасрэдным іх правядзенні. Усё гэта служыць больш паспяховаму засваенню вучнямі матэрыялу беларускай літаратуры ў пятым класе.

Літаратура

1. Вучэбная праграма для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Беларуская літаратура V–XI кл. / Зацв. Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010. – С. 43.

2. *Верціхоўская, М.І.* Урокі літаратуры: пошук і творчасць : дапаможнік для настаўнікаў / М.І. Верціхоўская. – Мінск : Литература и Искусство, 2008. – 224 с.

3. Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне па вучэбным прадмеце "Беларуская літаратура" на 2010/2011 навучальны год (V клас агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання) // http://www.adu.by/modules.php?name=News&file=article&sid=6603 Дата доступу 09.03.2011

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## З М Е С Т

Тлумачальная запіска ........ 3

Планы практычных заняткаў ........ 8

Тэставыя заданні для кантролю ........ 25

Кароткі слоўнік тэрмінаў і паняццяў ........ 66

Спіс літаратуры ........ 76

Дадатак 1 ........ 82

Дадатак 2 ........ 87

Дадатак 3 ........ 104

Дадатак 4 ........ 111